КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 35 (1161) 30 жніўня 2014 г.

Рэктар — **аб праекцыі** на праекты С. 2

Ці былі прамоўтары аднадушнымі? С. 3, 4 — 5

Чаму дырэктар музея марыць **пра "Боінг"**? С. 6

У антуражы **авангардных "...Сноў"** С. 8 — 9

З кім і дзе "гуляе" **рэпрадукцыя?** С. 3, 13

ШЛЯХ ДА СЯБЕ —

Фота Юрыя ІВАНОВА

гэта доўгае назапашванне роднаснага, але чужога досведу для карпатлівай "пабудовы" свайго. Ці не таму напярэдадні Дня ведаў у скульптурны камбінат БСМ у Мінску завіталі студэнты мастацкага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў? Менавіта тут над амаль трохметровым помнікам народнаму паэту Беларусі Максіму Танку працуюць знаныя скульптары Аляксандр Фінскі і Іван Міско. Помнік неўзабаве з'явіцца на радзіме паэта, у Мядзеле, у цэнтры горада — насупраць райбібліятэкі, якая носіць імя Танка. Аўтар архітэктурнай прывязкі помніка — Армен Сардараў. Бронзавы паэт рушыць па брукаванцы. Гэта шлях да сябе, даўжынёй у жыццё…

На здымку (злева направа): скульптары Аляксандр Фінскі, Іван Міско і іх будучыя калегі, студэнты Акадэміі мастацтваў Дзмітрый Дзядзечка, Павел Грабеннікаў і Канстанцін Ігруша.

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

Велатур "К": па ваколіцах "каралеўскага горада"

Серыя першая

"Гродзенскі трохкутнік" і яго адрозненне ад Бермудскага

Маршрут традыцыйнага прэс-велатура "К" падаецца цалкам заканамерным: паколькі Гродна сёлета зноў стаў сталіцай (зразумела ж, Культурнай), цалкам справядліва было скіраваць увагу менавіта ў напрамак "каралеўскага горада". Як караля робіць світа, так і буйны турыстычны цэнтр немагчыма ўявіць без яго насычаных цікавосткамі ваколіц.

Ваколіцы Гродна выглядаюць універсальным дадаткам да тых незлічоных гісторыка-культурных адметнасцей, якія даўно ды нецярпліва чакаюць масавага турыста ў самім горадзе — і, адпаведна, магчымасцю затрымаць гасцей у тых мясцінах як мага даўжэй. Прычым гэтыя цікавосткі ўражваюць сваёй разнапланавасцю ды папраўдзе неверагодным патэнцыялам для ўвасаблення крэатыўных задум. Чаго варты адзін толькі Аўгустоўскі канал, які ў перспектыве можа стаць сапраўдным стрыжнем транспамежнага турызму ў сваім рэгіёне!

Павандраваўшы, мы прыйшлі да высновы: будзе цалкам справядліва, калі такі маршрут (як і наша падарожжа, ён пройдзе па тэрыторыі ажно трох краін) атрымае назву "Гродзенскі трохкутнік". Менавіта "гродзенскі", а не які яшчэ: больш магутнага "месца сілы" ў тых краях не знойдзеш. Адпаведна, інвестыцыі ў гэты рэгіён (не толькі фінансаў, але таксама і высілкаў ды ідэй) не спазнаюць эфекту бяздоннай прорвы.

У нетрах Інтэрнэту можна адшукаць звесткі пра мноства грандыёзных праектаў, датычных развіцця турызму ў ваколіцах Гродна. Аднак у большасці такіх "учарашніх навін" фігуруюць дзеясловы ў будучым часе, а прыведзеныя тэрміны рэалізацыі даўно мінулі. Мы ж будзем апісваць убачанае "ў часе цяперашнім".

Ілья СВІРЫН, Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

На бягучы год прыпадае адзін сціплы і нікім не заўважаны юбілей. Акурат дзесяцігоддзе таму пачалося аднаўленне нашай часткі Аўгустоўскага канала. З той самай пары прызабытыя колісь мясціны — пастаянна ў цэнтры ўвагі. Ужо які час усур'ёз вядзецца гутарка пра перспектывы ўключэння Канала ў Спіс сусветнай спадчыны UNESCO. Беларуская дзяржава ўклала немалыя сродкі ў рэканструкцыю айчыннага ўчастка гэтага ўнікальнага гідратэхнічнага збудавання. Інвестары, здатныя забяспечыць яго патрэбнай для камфортнага адпачынку інфраструктурай, атрымалі папраўдзе "цяплічныя" ўмовы... Здавалася б, прыспела ўжо пара казаць пра нейкую "аддачу". Але чамусьці будучы час дзеяслова ўсё ніяк не зменіцца на цяперашні.

Для таго, каб вытрымаць належны сімвалізм, мы вырашылі распачаць падарожжа ў вёсцы Нямнова. Гэта, фактычна, канцавы пункт Аўгустоўскага канала, бо да балтыйскага порта Віндава (Вентспілс) водны шлях "трохі недацягнуў". Пасля рэканструкцыі апошні перад Нёманам шлюз стаў ці не галоўнай цікавосткай больш як стокіламетровай артэрыі: ён адзіны мае ажно чатыры камеры з агульным перападам вышынь у дзесяць метраў! Туды і кіруем па асфальтавай шашы з Гродна, якая акурат цяпер даводзіцца да "еўракандыцыі" — менавіта таму, што вядзе на Канал. Было б толькі каму па ёй ехаць...

Месца без дзеі

Для "чысціні эксперыменту" мы вырашылі наведаць Нямнова ў звычайны будні дзень, вольны ад якіх-кольвечы мерапрыемстваў, што перыядычна ладзяцца на канале. Але дзень, адзначым, быў летні, спякотны. І самы сезон.

Прыязджаем туды — і ў цішы аглядаем размаітыя мудрагелістыя прыстасаванні. У пасіўным стане яны не надта ўражваюць. Больш глядзець няма на што. Рабіць — таксама. Вакол — ні душы! Добра, мы ведалі: у будынку колішняга "офіса" Канала размешчаны прыватны музей. Без шыльды і ўказальніка, але — самы сапраўдны.

Водная роўнядзь, не парушаная турызмам

— Сёння вы першыя, хто да нас завітаў, — прызнаецца яго гаспадыня Любоў Зажэцкая.

І, мяркуючы па ўсім, апошнія: на гадзінніку ўжо сёмая вечара. Гэта дзівіць, бо якіх-ніякіх турыстаў звычайна даводзіцца сустракаць нават ля самых занядбаных ды прызабытых помнікаў спадчыны.

Зрэшты, насамрэч здзіўляцца няма чаму. Аўгустоўскі канал, пры ўсёй сваёй добра разрэкламаванай унікальнасці ды жывапіснасці, — гэта толькі аб'ект, месца дзеяння. А вось самой дзеі, яму, як выявілася, акурат і бракуе. Ехаць сюды немаведама за колькі кіламетраў, каб паўзірацца на водную роўнядзь — задавальненне сумніўнае.

Галоўны атракцыён, які робіць гульню вартай свечак, — гэта, безумоўна, само шлюзаванне. У Нямнове, яно, кажуць, займае каля гадзіны. Больш такога нідзе не паспытаеш! У крайнім выпадку, можна, прынамсі, паназіраць за чыімсьці шлюзаваннем з берага, што таксама цікава...

Працяг артыкула **чытайце на старонках 10 — 11.**

Сёння ў Музеі сучаснага мастацтва адкрыецца XVI Міжнародны фестываль арт-перформансу **"NAVINKI-2014"**.

Логіка развіцця

ТЭКСТ

Міхаіл БАРАЗНА,
рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар

Мінула дваццаць гадоў, і ўжо на сённяшні дзень на кафедры гісторыі і тэорыі мастацтва ніхто не сумняваецца, што **студэнт павінен ведаць мастацтва акцый, перформанс, хэпэнінг, творчасць такой экзатычнай асобы, як Штокхаўзэн**, і многія іншыя рэаліі культуры нашага часу. Многае змянілася…

Рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Міхаіл БАРАЗНА ў "К" № 30 у рубрыцы "На маю думку..." падзяліўся сваім меркаваннем аб тым, чым запомніліся яму дыпломныя работы гэтага года ва ўстанове, якой ён кіруе. У аўтарскім артыкуле "Сітуацыю аналізуем" гаворка ішла аб прыватнасцях — канкрэтных факультэтах — і згаданай ВНУ наогул: што радуе, што здзіўляе, што насцярожвае. Працягам размовы напярэдадні Дня ведаў аб навучальнай стратэгіі БДАМ стаў і гэты, запісаны намі, маналог рэктара...

— Сёння хацелася б пагаварыць не толькі пра навучальны працэс, але і пра Акадэмію ў іпастасі Цэнтра сучаснага мастацтва. З гэтага вынікае, што БДАМ можа не толькі рыхтаваць кадры для нацыянальнага мастацтва, але і выконваць іншыя функцыі ў культурным працэсе.

Акадэмія прымае чынны ўдзел у маштабных культурных акцыях, у тым ліку і ў буйных выстаўках сучаснага мастацтва. Аднак наша роля ў гэтай справе магла б быць больш важнай ды заўважнай, а ў шэрагу выпадкаў — і стрыжнявой. Хаця на ролю манапаліста Акадэмія ні ў якім разе не прэтэндуе. Дый не жадаем мы вяртання адміністравання і рэгламентавання мастацкага жыцця, як гэта было за савецкім часам. Я буду прыводзіць факты, а высновы няхай зробяць чытачы "Культуры".

Акадэмія мастацтваў не захоўвае творы мастацтва, як музей, — яна іх стварае. У нас на сённяшні дзень — больш за тысячу студэнтаў, дакладней — 1 300, што прадстаўляюць амаль усе віды прафесійнай мастацкай творчасці, якія ёсць у Беларусі. І тэрмін навучання ў БДАМ — ад чатырох да шасці гадоў — прадугледжвае праектныя адносіны да сучаснага мастацтва. Гэта працяглы тэрмін выканання работы, праектная сітуацыя задання і вельмі высокае якаснае кансультаванне праектнай групы. Па сутнасці, у навучальным працэсе мы ўжо маем праявы сацыякультурнага праектавання. Акадэмія можа вырашаць такія творчыя задачы, як распрацоўка на канцэптуальным узроўні маштабных выставак — біенале, трыенале, іншых экспазіцый — самага высокага ўзроўню, з наступным практычным увасабленнем згаданых тэарэтычных распрацовак. Гарантам высокай якасці з'яўляецца творчы патэнцыял студэнтаў, пра які сведчаць высокія ўзнагароды, што нашы выхаванцы атрымліваюць на міжнародных конкурсах, і тыя веды, якія яны набываюць у часе замежных стажыровак па лініі супрацоўніцтва БДАМ з аналагічнымі ВНУ далёкага і блізкага замежжа.

Нагадаю, што, па-першае, па адзнаках за творчы ўдзел у Арт-сесіі за апошнія тры гады мы маем выключную сітуацыю. Столькі нашы студэнты не атрымлівалі дзесяцігоддзямі. Па-другое, значна памаладзеў і прафесарска-выкладчыцкі склад. Тут ёсць багата людзей, якія маюць досвед у стварэнні міжнародных выставачных ды іншых праектаў. І самі выкладчыкі маюць творчы досвед — міжнародны, сур'ёзны. Аб'ектыўна можна сказаць, што ў нас амбіцыйны і працаздольны маладзёжны калектыў выканаўцаў, стваральнікаў, кансультантаў, творцаў — выкладчыкаў, якія ў стане вырашаць комплексныя задачы, у тым ліку і ладзіць мастацкія выстаўкі. Тым больш, у Акадэміі ёсць сталыя ды цікавыя сувязі з міжнароднымі арганізацыямі, з замежнымі мастацкімі цэнтрамі. Як новую тэндэнцыю ў беларускім выяўленчым мастацтве назаву міжнародную калектыўную творчасць.

Былі актыўныя гады, калі ствараліся міжнародныя творчыя тэматычныя праекты пад адну ідэю. Сённяшнія выстаўкі, на жаль, больш нагадваюць калекцыі — гэткія зборы твораў, што адпавядаюць чыннікам пэўнага сегмента мастацкага рынку. Сярод маленькіх выставак ёсць цікавыя сваім зместам і тэматыкай, але больш-менш маштабных праектаў у апошнія гады не ствараецца. Таму Акадэмія мае рэсурс і ў фарміраванні калектываў праекціроўшчыкаў, і ў вырашэнні такіх задач. Я проста ўпэўнены, што мы можам гэта рабіць — і рабіць на высокім узроўні. А прэтэндаваць на ролю прарабаў у беларускім мастацтве… Гэта не наша справа — ёй мусяць займацца тыя, каму наканавана.

Акадэмія ж заўжды была і застаецца зараз арганізацыяй адкрытай, гатовай да дыялога з самімі рознымі мастацкімі суполкамі, прадстаўнікамі розных тэндэнцый, носьбітамі розных ідэй. Нам цікавыя праблемы і публічнага мастацтва, публічнай прасторы, і стрыт-арта, і новых электронных відаў мастацтва. Мы, дарэчы, названыя з'явы даследуем, аналізуем сучаснае мастацтва ва ўсіх найбольш значных яго праявах.

Паспрабаваць свае сілы ў новай, нязвыклай справе для творцы заўжды карысна. У дадзеным выпадку — гэта, пры наяўнасці досведу традыцыйнай школы, стварэнне нечага, так бы мовіць, авангарднага. Гісторыя мастацтва дае нам нямала прыкладаў шматгранных асоб. Былі яны і ў эпоху Адраджэння, ёсць і сярод сучасных творцаў. Бывае, аднак, што мастак нешта робіць, каб потым паказаць калегам ці гледачам: вось, маўляў, магу зрабіць так, а магу і гэтак. Гэта значыць, як папугай, спарадзіраваць тэндэнцыю. Іншая ж справа, калі зварот да новай эстэтыкі, да нязвыклых форм абумоўлены ў мастака логікай развіцця творчага патэнцыялу і набыццём новых ведаў.

Думаю, што ў нас адзін з самых прагрэсіўных сярод навучальных устаноў — не толькі Беларусі, але і ўсіх краін Садружнасці — навучальны курс гісторыі мастацтва. Мы надаём увагу, канешне ж, ведам клясічнага мастацтва, але і імкнёмся да таго, каб студэнты арыентаваліся таксама ў сучасных культурных рэаліях. І гэта не на ўзроўні факультатыву: па сучасным мастацтве здаюць экзамены ды залікі. Такую практыку мы ўвялі, бадай, першымі ў СНД.

Ладзім выстаўкі замежных мастакоў у нашай галерэі. Штомесяц у нас — новая выстаўка. Творцы з Францыі, Германіі, Польшчы, Венгрыі, Кітая — вельмі багатая панарама. Да таго ж, праводзім шматлікія семінары, канферэнцыі. Усё гэта — жыццё Акадэміі. Тое робіцца для таго, каб адвесці студэнтаў ад магчымых штучных ухілаў у "малпаванне", у некрытычнае прыняцце моднай безгустоўшчыны і далікатна падштурхнуць да сапраўднага мастацтва ў самых розных стылявых формах.

Я вельмі паважаю канцэптуальнасць у мастацтве, якой бы формы яна ні была: ад традыцыйнага рэалізму да стрыт-арту. Але, незалежна ад творчых схільнасцей, студэнт Акадэміі мусіць усведамляць сябе навучэнцам вышэйшай школы і спадкаемцам яе традыцый. Тады не будзе дысанансу паміж акадэмічнай дысцыплінай і нейкімі формамі сучаснай мастацкай практыкі. Гэтага няма ў прыродзе творчасці і не павінна быць у дзейнасці ВНУ. А маляванне акадэмічнае яшчэ нікому шкоды не нанесла.

Ну, і па-другое, я хацеў бы сказаць, што тыя маштабныя выстаўкі сучаснага беларускага мастацтва, канешне ж, адыгралі пэўную ролю ў прапагандзе сучаснай эстэтыкі, але ім бракавала канцэптуальнасці. Пераважала спантаннасць, а гэта крыўдна, бо беларускае мастацтва ўжо даўно знаходзіцца ў эпіцэнтры сусветных тэндэнцый. Дый тыя, хто займаўся экспазіцыяй, — не дылетанты, не пачаткоўцы ў сучасных практыках, але магчыма, ім не хапіла нейкіх арганізацыйных навыкаў.

Але ўсё ж думаю, што Акадэмія як структура будзе ўдзельнічаць у конкурсах на распрацоўку канцэпцый маштабных культурных акцый, і калі атрымае перавагу, дык сваімі службамі — тэхнічнымі і юрыдычнымі, — кафедрамі, факультэтамі мае ўвасабляць гэты праект. Мы — за адкрыты ўдзел у конкурсах нацыянальнага маштабу. І калі такі конкурс будзе абвешчаны, Акадэмія гатова ў ім удзельнічаць. Магу вас запэўніць, што яна, у такім выпадку, прадэманструе свой творчы патэнцыял.

З 1990 гадоў БДАМ узнялася вельмі магутна. Нечакана для многіх, у тым ліку і для тых, хто да гэтага ўздыму меў дачыненне. Памятаю, калі я прыйшоў працаваць у 1992-м у Акадэмію, наколькі было цяжка ўключыць у праграму па гісторыі мастацтва XX стагоддзе: камп'ютарнае мастацтва, арт-дызайн, згадкі пра плакаты Цэслера і Войчанкі, работы Кітаевай, перформансы, мастацкія акцыі… Ды ўсё ж такая праграма была зацверджана. Мінула дваццаць гадоў, і ўжо на сённяшні дзень на кафедры гісторыі і тэорыі мастацтва ніхто не сумняваецца, што студэнт павінен ведаць мастацтва акцый, перформанс, хэпэнінг, творчасць такой экзатычнай асобы, як Штокхаўзэн, і многія іншыя рэаліі культуры нашага часу. Многае змянілася… К

Зваротная сувязь: рэплікі і каментарыі

Наш праклён вайне

Уладзімір ЦЕРАБУН,
скульптар, Ганаровы грамадзянін Смаргоні

Яшчэ на золку нашай эры старажытнагрэчаскі пісьменнік Лотар Лонг казаў: "Таму, хто адважваецца ставіць помнікі на зямлі, прапітанай кроўю, павінна быць уласціва высокае пачуццё адказнасці". Працуючы над мемарыялам памяці герояў і ахвяр Першай сусветнай вайны ў Смаргоні, мы прыгадвалі гэтыя словы пастаянна. Бо тая зямля і сапраўды прапітана крывёю.

Тым больш, манументальнае мастацтва з'яўляецца папраўдзе трывалым складнікам дзяржаўнай ідэалогіі: яно выконваецца з даўгавечных матэрыялаў і разлічана на стагоддзі, яго творы пастаянна знаходзяцца ў асяроддзі бытавання людзей і не могуць быць перанесены або закрыты. Таму ў гэтай справе памылкі каштуюць надзвычай дорага.

Ініцыятарам узвядзення мемарыяла стаў жыхар Смаргоні Уладзімір Лігута. Зацікавіўшыся тэмай Першай сусветнай, ён па сваёй ініцыятыве працаваў у архівах і ў выніку даследаванняў напісаў кнігу "У Смаргоні пад знакам святога Георгія". Менавіта Уладзімір Мікалаевіч у 2006-м звярнуўся ў Смаргонскі райвыканкам з прапановай увекавечыць памяць воінаў Першай сусветнай вайны. І мясцовыя ўлады ўхвалілі гэтую ідэю. Ужо ў тым самым годзе быў аб'яўлены рэспубліканскі конкурс на суісканне заказа. Усяго было прадстаўлена дзевяць праектаў, але перавагу сярод іх аднагалосным рашэннем журы атрымала прапанова аўтарскага калектыву пад кіраўніцтвам Анатоля Арцімовіча. У самым хуткім часе гэты выдатны скульптар патэлефанаваў мне і прапанаваў далучыцца: маўляў, ты ж смаргонскі, дык як жа без цябе? Неўзабаве наш калектыў, куды таксама ўвайшлі скульптар Іван Арцімовіч і архітэктар Аляксандр Бажыдай, быў сфарміраваны. Наперадзе нас чакала восем гадоў руплівай працы…

Дзякуючы фінансаванню Саюзнай дзяржавы, яшчэ чатыры гады таму скульптуры былі адліты — справа заставалася толькі за ўвасабленнем задумы ў прасторы. Інстытут "Гроднаграмадзянпраект" выканаў праектна-каштарысную дакументацыю, а гэта адзінаццаць альбомаў, у якіх прыведзены дакладныя разлікі па кожным элементе. Асаблівую падзяку хацелася б выказаць архітэктару Аляксандру Захарчуку, які па-майстэрску ўдасканаліў праект, "ужывіў" яго ў навакольнае асяроддзе.

А ў 2012 годзе, яшчэ да адкрыцця фінансавання работ, тагачасны старшыня Смаргонскага райвыканкама Мечыслаў Гой сам праявіў ініцыятыву. Невялікая група распачала работы па ачыстцы тэрыторыі ад кустоўя, зняцці верхняга слоя грунту і падсыпцы новага. А гэта тысячы і тысячы тон… Таму нізкі паклон нашым будаўнікам за іх якасную і добрасумленную працу!

Мемарыяльны комплекс пакуль не завершаны, але канцэптуальнае рашэнне ўжо поўнасцю праглядаецца. Сёння можна прайсці па алеі даўжынёй у 417 метраў, на якой размешчаны некалькі архітэктурна-прасторавых зон — уваходная, мемарыяльная і цэнтральная: "Зона Славы", дзе размешчаны скульптурныя кампазіцыі "Бежанцы", "Салдаты Першай сусветнай" і "Крылаты геній салдацкай славы". Апошняя з іх — гэта алегорыя, покліч да неба. Меч не сціснуты ў руцэ анёла, але ляжыць на яго далонях, што азначае зварот да будучых пакаленняў: "Будзьце пільныя, беражыце мір". Пра гэта мае нагадваць і звон, які будзе даносіцца з капліцы, што з'яўляецца неад'емнай часткай задумы помніка.

Мемарыял называецца "Прымірэнне", таму ён прысвечаны не толькі воінам рускай арміі, якія абаранялі сваю радзіму, але таксама і тым нямецкім салдатам, што загінулі на Смаргонскай зямлі. Расколаты напалову валун мае надпіс па-руску і па-нямецку: "Любая вайна нясе гора, руйнаванне і смерць. Наш свяшчэнны абавязак — памятаць пра гэта". У гэтых словах — ідэйная квінтэсэнцыя ўсяго праекта.

Згодна з задумай аўтарскага калектыву, комплекс павінна завяршаць яшчэ адна кампазіцыя — куды менш маштабная паводле будаўнічых аб'ёмаў, але, на наш погляд, вельмі значная па сваім змесце. Яе прапануецца размясціць на супрацьлеглым баку горада — ля трасы "Мінск — Вільнюс" у вёсцы Хадакі. Назва кампазіцыі — "Праклён вайне". Утыркнуўшы вінтоўку штыком у зямлю, салдат выгукае ў неба "Будзь праклятая ты, вайна!". Гэта ўніверсальны пасыл, скіраваны ў будучыню, які выяўляе пратэст супраць любога кровапраліцця. Як казаў знакаміты рэжысёр Аляксандр Сакураў, "…змяніць смертазабойчую прыроду ў чалавеку наўрад ці калі ўдасца, але імкнуцца да паляпшэння нораваў — галоўная задача мастацтва".

Звяном, якое звязвае першую і другую часткі комплексу, стануць доты, размешчаныя ў гарадской рысе і за яе межамі. Гэта — жывыя і пераканаўчыя сведчанні падзей той вайны, і агулам іх у ваколіцах Смаргоні каля сямідзесяці. Большасць з іх захаваліся ў даволі добрым стане, і, несумненна, яны ўяўляюць вялікую цікавасць для турыстаў.

Працы па стварэнні комплексу сёння актыўна вядуцца, і, пры несупынным паэтапным фінансаванні, першая яго частка магла б быць завершана ўжо налета. На жаль, пакуль прагнозы на гэты конт не надта суцяшальныя: ужо на сённяшні момант запазычанасць перад будаўнічымі арганізацыямі перавысіла пяць мільярдаў рублёў, і яшчэ прыблізна столькі ж патрэбна. Пэўна, гэта не надта вялікая сума — прынамсі, калі ўлічыць грамадскі пасыл мемарыяла. Ён прысвечаны гістарычным падзеям, але ўсё ж вельмі сучасны — асабліва цяпер, калі ў розных кутках свету зноў ліецца кроў…

Нацыянальны мастацкі музей адзначыць Дзень ведаў выстаўкай аднаго твора — карцінай **Анатоля Волкава "1 верасня"**.

"Круглы стол" "К"

Перафразуючы словы "люстэрка рускай рэвалюцыі", "усе маленькія фестывалі падобныя адно да аднаго, кожны вялікі фестываль вялікі па-свойму". Спрачацца з новым сцвярджэннем я вас сёння не заклікаю, тым больш, у нашай газеце абвяргалі мы гэты "пастулат" не раз, а пахуліганіў я вербальна такім "штылем" таму, што трэба ж было неяк арыгінальна падабрацца да сутнасці чарговага "круглага стала", які прайшоў у рэдакцыі "К". У ёй сабраліся арганізатары найбуйнейшых у краіне фестываляў, "оўтэнэйраў" — Андрэй АЛЯКСЕЕЎ (А.А.) (фестываль "Мост"), Уладзімір ШАБЛІНСКІ (У.Ш.) (фестываль "Вольнае паветра"), Юлія ДУБОЎСКАЯ (Ю.Д.) (фестываль "Музычныя вечары ў Мірскім замку", начальнік аддзела маркетынгу і рэкламы, прэс-сакратар тэлеканала "АНТ"), Алег ПАШАК (А.П.) (каардынатар фестывалю "Камяніца"), Дзмітрый НАЗАРАЎ (Д.Н.) (фестываль "Men's Fest"), Антон САСНОЎСКІ (А.С.) (фестываль "Дружба"). Ім мы і прапанавалі некалькі тэм для абмеркавання, сфармуляваўшы іх у выглядзе навадных пытанняў...

Алег КЛІМАЎ

Калі грошы — з "уласнай кішэні"...

Прамоўтары чакаюць гледача

Якія песні спяваюць фінансы?

— Іншым разам здаецца, што фестывалі ў Беларусі растуць як грыбы, але далёка не ўсе з іх становяцца штогадовымі. Асабіста вам хапае фестываляў ці іх занадта шмат для такой краіны, як наша?

Д.Н.: — Не сказаў бы, што іх занадта шмат. На мой погляд, наадварот, фэстаў не хапае. У той жа Украіне, і толькі ў яе заходняй частцы, у месяц праводзіцца больш за дзясятак фестываляў, і ўсе — вельмі высокага ўзроўню.

У.Ш.: — Фестывалі павінны быць патрэбны менавіта для кагосьці. Калі публіка не ідзе на іх, то якога б хэдлайнера на іх ні прывязі, сэнсу ў правядзенні такіх мерапрыемстваў будзе мала. Гэта значыць, прапанова мусіць ісці насустрач попыту. Шчыра кажучы, многія буйныя фэсты гэтага года, што быццам бы павінны былі сабраць дастатковую колькасць гледачоў, іх не сабралі. Гэта датычыцца і "Вольнага паветра", і "Моста", і "Дружбы", арганізатары якіх, што называецца, "влетели". Фестывалі ў нашай краіне для іх арганізатараў — гэта арэлі: учора ты "ў плюсе" ці не ў страце — сёння "ў мінусе". І ўсё з-за таго, што ў Беларусі, па вялікім рахунку, няма мэтавай аўдыторыі гледачоў, "заточанай" пад такія формы вольнага часу, — не важна, хард-н-хэві- гэта ці поп-рок-фестываль. Моладзь уваткнула навушнікі, залезла ў Інтэрнэт і — "тусуецца" сабе на пікніку. Маё асабістае меркаванне такое, што патрэбы ў якасных фестывалях такога кшталту ў краіне пакуль няма.

А.А.: — У таварным значэнні, можа, і не. Я згодзен з Уладзімірам: у Беларусі няма асаблівай фестывальнай культуры. Але ў мяне ўсё ж ёсць надзея на моладзь, якая, наведваючы сёння фэсты, хай і не рэгулярна, заразіцца іх атмасферай і, пасталеўшы, заўтра будзе іх пастаяннай аўдыторыяй. Цяперашняе ж пакаленне тых, каму за сорак, выцягнуць на "оўпэн-эйры" практычна немагчыма: яно прызвычаілася ўжо да залаў, да сольных выступленняў артыстаў. Ну а тое, што колькасць фэстаў расце — удала яны праходзяць у фінансавым плане для арганізатараў ці няўдала, — гэта паказчык таго, што патрэба ў іх ёсць. І супярэчнасці паміж маімі словамі і тым, што сказаў Уладзімір, няма: мне здаецца, існуе патрэба ў фестывалях наогул, у іх павелічэнні, у іх рознасці. Шаблінскі ж кажа аб якасці мерапрыемстваў. Некаторыя людзі, якія бяруцца за арганізацыю фэстаў, не ўяўляюць, у што яны залазяць. Ім здаецца, што гэта выдатны бізнес, з дапамогай якога можна лёгка зарабіць. Зусім наадварот: гэта значна складаней, чым зладзіць звычайны канцэрт, механіка ж іншая…

На мой погляд, зараз ідзе зараджэнне фестывальнага рынку. Тут усё гэтак жа, як пры зачацці дзіцяці, і, умоўна кажучы, з дзесяці новых фэстаў па-сапраўднаму нарадзіцца надоўга зможа толькі адзін. Думаю, у бліжэйшыя пяць гадоў колькасць фестываляў будзе расці, пераважная іх частка знікне назаўсёды, а што застанецца — паглядзім.

Ю.Д.: — Каналу "АНТ", у адрозненне ад нашых калег, быць можа, крыху лягчэй. "Музычныя вечары ў Мірскім замку" прайшлі ўжо ў восьмы раз. Гэты фэст, можна сказаць, ужо знакавы, хоць бы таму, што Міністэрства замежных спраў уключыла яго ў каляндар сваіх мерапрыемстваў на бліжэйшыя некалькі гадоў. У тэлеканала ёсць рэсурсы, якіх няма ў іншых, таму што "... Вечары" — гэта спецыяльна арганізаваны праект, які здымаецца і паказваецца ў эфіры. Удзельнікі яго — артысты з розных краін: беларусы, расіяны, украінцы, заходнія музыканты. У гэтым годзе на яго былі прададзены практычна ўсе білеты (прытым што канцэрты пачыналіся а 22-й, 24-й, партэр быў ужо ўвесь запоўнены).

А.А.: — Але ў цэлым, з камерцыйнага пункта гледжання...

Ю.Д.: — Дзіўна выглядала б, каб арганізатар фестывалю не хацеў яго манетызаваць.

Д.Н.: — У асноўнай масе, публіка не задумваецца, зарабіў арганізатар на фестывалі ці не. А працягласць жыцця любога фэсту залежыць ад яго акупнасці. Але, мне думаецца, нейкія зрухі тут ёсць: гледачы пачынаюць разумець, што калі нейкі фестываль ім спадабаўся і на яго варта схадзіць наступным разам, то тым самым яны фінансуюць яго правядзенне. Заходнім арганізатарам у гэтым сэнсе прасцей: амаль усе значныя, буйныя фестывалі ў іх праходзяць за кошт спонсараў, ніхто з арганізатараў фэстаў уласнай кішэняй не рызыкуе...

Працяг "круглага стала" чытайце **на старонках 4 — 5.**

Фотасюжэт нумара

6 — 7 верасня ў Заслаўі пройдзе Дзень беларускага пісьменства.

ЗА ТЫДЗЕНЬ ДА СВЯТА

Князя Ізяслава з дзяцінства бачылі з кнігай у руках. Ён навучаў грамаце сваіх падданых, за што атрымаў званне Кніжніка.
Праз дзесяць вякоў на радзіме Ізяслава Кніжніка ў Заслаўі пройдзе Дзень беларускага пісьменства. Публікуемы фотарэпартаж Юрыя ІВАНОВА пра падрыхтоўку да свята зроблены 28 жніўня.

Людміла Шыбаева (Рагнеда) і Яўген Гапуцін (Ізяслаў).

Мантаж сцэны на Савецкай плошчы.

Узорны ансамбль бальнага танца "Крок" выступіць на свяце.

Мясцовы паэт Анатоль Шкода чытае свае вершы.



Мастакі Ірына і Юрый Брэль з групы "Арцель"...

...і іх кампазіцыі з каменя.

Музейнае сховішча

Нечаканы альянс

Калі "копія" гуляе з арыгіналам

Адмыслова да "школьнай пары" Гомельскі палацава-паркавы ансамбль прадоўжыў час працы выстаўкі "Скарбы сусветнага жывапісу", якая дая магчымасць пазнаёміцца з вядомымі творамі мастацтва ў нечаканым ракурсе. На пачатку верасня ўстанова чакае візіт студэнтаў-архітэктараў, навучэнцаў Гомельскага дзяржаўнага мастацкага вучылішча, школьнікаў. Таксама, каб убачыць цікавы выставачны праект, прыедзе дэлегацыя з Чарнігава.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

"Скарбы сусветнага жывапісу" — гэта выстаўка рэпрадукцый твораў з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь (унікальны падарунак Надзеі Хадасевіч-Лежэ). Рафаэль, Леанарда да Вінчы, Рэмбрант, Рэнуар, Караваджа, Шагал, Веласкес, Ван Гог, Пікаса… — экспазіцыя, якая складаецца са 140 карцін, дае магчымасць пазнаёміцца з культавымі работамі слынных мастакоў, адначасова дэманструючы сувязь паміж часам, калі яны ствараліся, і мастацтвам. Як змены ў светапоглядзе чалавека ўплывалі на жывапісную выяву? Стваральнікі выставачнага праекта паспрабавалі не проста прэзентаваць вядомых мастакоў, а — задаць тэматычны кантэкст, у якім сусветна вядомыя карціны раскрываюцца у пэўным ракурсе.

Здавалася б, простая выстаўка "копій", але гэта акурат той выпадак, калі "копіі" гуляюць з арыгіналам.

140 з тысячы

Вядома, недаацаніць калекцыю рэпрадукцый Надзеі Хадасевіч-Лежэ, нашай слыннай зямлячкі родам з вёскі Зембін, вядомай мастачкі, жонкі французскага майстра, нельга. Серыя ўнікальных "копій" была створана ў майстэрнях Луўра ў 1960-я — і ўжо лічыцца здабыткам культуры XX стагоддзя. Гэта першы досвед друкавання рэпрадукцый на палатне, падкрэсліваюць спецыялісты. Больш за тое: выявы карцін дапрацоўваліся пэндзлем, таму можна казаць пра "копіі" высокай якасці, і ў пэўным сэнсе — рарытэты. Збор каштоўных рэпрадукцый мастачка фарміравала цягам некалькіх гадоў, а потым, у савецкія часы, аддала ў дар беларускаму народу. Сёння захавальнікам калекцыі, якая налічвае больш за тысячу адзінак, з'яўляецца Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, і многія работы серыі наведвальнікі маглі бачыць у пэўных выставачных праектах (у прыватнасці, толькі нядаўна рэпрадукцыі былі задзейнічаны ў выстаўцы "Сто гадоў беларускага авангарда"). Тым не менш, Гомель па-свойму рашыўся раскрыць патэнцыял "вялікага збору" — падрыхтаваўшы і падаўшы яго адмысловым чынам. Паўтарусся, 140 работ з калекцыі Надзеі Хадасевіч-Лежэ былі ўпісаны ў кантэкст Палаца і дапоўнены экспанатамі з фондаў установы, а таксама выданнямі з Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя Леніна...

Працяг артыкула чытайце **на старонцы 13.**

Артысты розных жанраў прадставяць сваю творчасць на Міжнародным фестывалі вулічных культур **"Grand Teatro"** ў Гродне.

Дзяжурны па нумары

"Не той" эксклюзіў

Без сумневу, тыя шматабяцальныя перспектывы транспамежнага "Гродзенскага трохкутніка", якія мы пачынаем адлюстроўваць у гэтым нумары "К", амаль неажыццявімыя без паўнавартаснага пераўвасаблення яго геаграфічнага, гістарычнага і культурнага цэнтра ў цэнтр турыстычны. Але на гэтым фронце, мяркуючы па ўсім, — пакуль без кардынальных змен: з года ў год ты гадзінамі шпацыруеш па амаль пустэльных у непрацоўны час вулках, кожны раз знаходзіш новыя цікавыя закуточкі (ну колькі іх там, у Гродне?) ды адчуваеш кайф з той нагоды, што адметнасцей — шмат, а турыстаў — няма…

ТЭКСТ

Ілья СВІРЫН,
рэдактар аддзела
газеты "Культура"

Настрой змяняецца хіба пры непасрэдным сутыкненні з надзённымі праблемамі: паесці, заначаваць... І разумееш, што гэтыя праблемы — прычына і вынік тваёй эксклюзіўнасці. Ты ўжо гатовы падзяліцца прасторай з іншымі, каб мець магчымасць у любы момант заваліцца спаць у які-небудзь хостэл за 10 еўра альбо прыемна павячэраць за палову гэтай сумы — каб толькі тая магчымасць была. Балазе яна заўсёды ёсць не раўнуючы ва ўсіх турцэнтрах у радыусе, прынамсі, тысячы кіламетраў на захад ад Гродна…

Як чалавек абазнаны, магу даць параду: калі ў позні час захочацца есці, кіруйцеся на вакзал: там ёсць шапік, дзе прадаюць бліны. Адзіная кругласутачная ятка на ўвесь вялізны нядаўна адбудаваны вакзал — і, па-мойму, на ўвесь Гродна таксама! У гатэлі "Беларусь" няма не толькі Wi-Fi — там пасля 23.00 увогуле нічога няма, нават гарбаты. А згаданы гатэль — амаль безальтэрнатыўны варыянт начлегу для "простых смяротных". Хіба яшчэ — на тым жа вакзале...

Пакуль стратэгія развіцця турызму ў Гродне не мяняецца. Рэгулярна анансуюцца нейкія маштабныя праекты, рэалізацыя якіх пастаянна адкладаецца з тых або іншых прычын — амаль заўсёды, канешне ж, фінансавых. На такія дробязі, як кавярні, яткі, гатэльчыкі, хостэлы, праўдападобна, ніхто не разменьваецца.

Вядома, хочацца верыць, што Стары замак, які яшчэ задоўга да нашай эпохі быў пераўтвораны ў казарменнае "брыдкае качаня", набудзе сваё сапраўднае аблічча лебедзя. Балазе, як сведчыць нашумелы матэрыял нашых калег з "Рэспублікі", абнаўленне гэтага захраслага ў мінулым часе музея, ва ўсялякім выпадку, даўно ўжо наспела. Зрэшты, пра тое ж вам скажа і ці не кожны з яго наведвальнікаў... Крэатыўнасцю, якой, без сумневу, валодае дырэктар установы Юрый Кітурка (афіша гэтага музея мала чым саступае сталічным вызначальнікам трэндаў), тут ніяк не абысціся — патрэбны і фінансавыя ўкладанні.

Канешне ж, я рукамі і нагамі за тое, каб здзейснілася даўняя мара ўсіх свядомых гродзенцаў, і шыкоўны гістарычны цэнтр нарэшце стаў суцэльнай пешаходнай зонай. Сапраўды, калі шпацыруеш зімовым вечарам па тых вузенькіх абледзянелых ходніках, і раптам за паўметра ад цябе на вялікай хуткасці праносіцца мажны грузавік, робіцца ніякавата. Але, з іншага боку... Ці ўтульна будзе табе пачувацца ў тым выпадку, калі цягам шматмільярдных укладанняў той грузавік скіруюць аб'язным маршрутам? Вуліцы тады стануць зусім пустэльнымі…

Па вузкіх віленскіх вулачках таксама ездзіць транспарт, і пешаходам праз гэта таксама робіцца вусцішна. Не думаю, што сітуацыя калі-кольвечы карэнна зменіцца. Асфальт у выбоінах, сцены пашарпаныя... Не тое што ў нас! Затое на гэтым асфальце стаяць летнія столікі кавярняў, а на сценах сутракаюцца зусім тандэтныя, але вынаходлівыя арт-аб'екты, якія прымушаюць турыстаў ушчэнт высаджваць акумулятары сваіх дэвайсаў. Напрыклад, трыб'ют сучасных літоўскіх творцаў тым класікам літаратуры, чыё жыццё так ці інакш знітавана з Вільнюсам, — на вуліцы з адпаведнай назвай: Літарату. Сярэдні памер твораў — 10 на 10 см, тэхніка — самая розная. Часцей за ўсё турысты фатаграфуюць сапраўдныя ўстаўныя сківіцы (па шчырасці, не памятаю, каму і чаму іх прысвяцілі). Цікава, колькі мільёнаў долараў спатрэбілася для гэтага праекта? Якая транснацыянальная карпарацыя стала яго інвестарам?

Праблемны гродзенскі Новы Свет адрозніваецца ад сусветна вядомага Ужупіса зусім не тэхнічным станам будынкаў (у апошнім — процьма сапраўдных руін) і не іх гістарычнай вартасцю (утаймуем сціпласць: Гродна тут усё ж выйграе!). Адрозненне — у іншым: у адным выпадку, ідэя ёсць, а ў іншым — няма. Памятаеце анекдот пра пацука ды хамячка?

Таму Ужупіс дакладна ніхто не будзе зносіць — хіба сам разваліцца. Актуальная ідэя для падобных раёнаў з'яўляецца ці не адзіным гарантам выжывання. Прычым у Гродне не трэба выдумляць ніякіх "адмысловых рэспублік": чаго вартая сама назва "Новы Свет"! Гучыць куды лепш, чым, скажам, "Каробчыцы" (пра гэты парадаксальна паспяховы тураб'ект — у наступных нумарах).

Добра з крэатывам, возьмем нейкі ўсім прыемны стандарт. Згадаем хаця б суседні Беласток, які зусім ужо не назавеш турыстычнай Меккай... Акрамя рынку, там ёсць яшчэ і Рынак (так у бліжнім замежжы называецца наша Савецкая плошча), які таксама ладна пацярпеў у вайну ды не быў своечасова адноўлены. Але калі ты трапляеш туды ў летнюю суботу, дык адчуваеш сябе не раўнуючы бы ў якой Празе: паўсюль столікі кавярняў ды ўтульны тлум. Тым самым часам, у суседнім Гродне па вялізнай цэнтральнай плошчы сноўдаюцца самотны вецер і рэдкія мінакі, якім там проста няма чаго рабіць…

Добра, не будзем пра замежжа — хаця, як засведчыць ці не кожны падарожнік, агулам нам камплексаваць няма падстаў. Вось, напрыклад, у безнадзейна ўсходнім (па мерках геаграфіі) Гомелі неяк перад дзелавой сустрэчай я забег у бліжэйшую кавяраньку, папрасіў кавы... У мяне спыталі: "Якую?" Натуральна, натуральную. Усё адно просяць удакладніць, бо розных гатункаў натуральнай кавы ў меню — не менш за дваццаць. Сітуацыя, якая наўрад ці можа здарыцца ў Гродне — нашым "акне ў Еўропу"...

У выніку, застаецца толькі адно "праклятае" пытанне: чаму? Па шчырасці, я не маю на яго адказу.

К

"Круглы стол" "К"

Калі грошы —

Прамоўтары чакаюць гледача

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 3.)

А.А.: — Гэта не так. Маючы зносіны з замежнымі калегамі, я зразумеў, што калі ёсць нейкія "вясёлыя" спонсары, гатовыя выдаткавацца з-за асабістых меркаванняў, то да іх проста так не ідуць. Як гэта ў іх працуе? Арганізатары знаходзяць патэнцыйнага інвестара і кажуць яму: "Мы збіраемся правесці фестываль, нам на яго трэба тры мільёны еўра. На кропку бясстратнасці мы выйдзем праз тры гады. Гэта значыць, у першы год вашы страты складуць мільён, у другі — паўмільёна, у трэці — 250 тысяч. І на чацвёртым годзе вы пачняце вяртаць інвестыцыі". Інвестар правярае ўсе раскладкі і вырашае, ці даваць яму грошы "ўдоўгае" ці не даваць. Але па факце ён можа нічога не вярнуць і не зарабіць — "рызыкі" таму так і называюцца. У Беларусі ж няма такіх інвестараў, бо нестабільная эканамічная сітуацыя: сваё фінансавае жыццё ў нас можна прагназаваць максімум на год наперад. Калі нават і знайсці замежнага інвестара, то ён пры такім становішчы рэчаў укладвацца не стане.

У мяне кампанія прыватная, мы не "сядзім" на грантах, дзяржава нас не фінансуе, мы ўсё робім на ўласныя грошы. І кожны наш наступны крок можа быць крокам як угару, так і ўніз. Калі мы прывозім з канцэртам сольнага артыста, то дакладна ведаем, што ён збярэ залу. Пры правядзенні ж "саляннкі" верагоднасць памылкі ўзрастае.

Антон Сасноўскі.

Андрэй Аляксееў.

Уладзімір Шаблінскі.

Д.Н.: — Я меў на ўвазе тое, што спачатку, натуральна, арганізатарам трэба паказаць сябе, напрацаваць уменне ў правядзенні фестываляў, тады і спонсары, хочацца верыць, пацягнуцца. Пакуль жа, пры ўсёй павазе да беларускіх фестывальных прамоўтараў, усе такія мерапрыемствы, у лепшым выпадку, зводзяцца ў фінансавым плане "да нуля".

А.А.: — Але не ўсё так змрочна, як можа падацца. Паступова, пакрысе, кожны год нешта змяняецца, нешта рухаецца ў правільным кірунку.

— Каб папулярызаваць фестываль, ці займаецеся вы мерчандайзінгам?

А.С.: — На нашым фестывалі была прадукцыя з яго атрыбутыкай, не шмат, але была. На "Мосце" — таксама.

А.А.: — Калі гэтым займацца, то да справы трэба падыходзіць сур'ёзна, у звязку з зацікаўленымі, дасведчанымі людзьмі. Пакуль мы толькі спрабуем.

А.П.: — Фірмаў, здольных прасоўваць які-небудзь буйны або адносна буйны фестывальны рух з дапамогай "мерча", мала. І ў іх няма асаблівай цікавасці да такога віду дзейнасці…

Ахова і публіка

— Ці ёсць у айчынных фестываляў нейкія, толькі ім уласцівыя, асаблівасці?

А.А.: — Для таго, каб фэст стаў брэндам, яму трэба як мінімум гадоў пяць. "Музычныя вечары..." — гэта ўжо брэнд.

У.Ш.: — Пытанне, як я зразумеў, крыху ў іншым. Яно — пра асаблівую "ўнутраную кухню", праўда? Вядома, такія асаблівасці ёсць, зыходзячы хоць бы з таго, што наш фестывальны рынак — развіваецца. Прывяду просты прыклад: ахова мерапрыемстваў. Усе заходнія фэсты ахоўваюцца легальнымі прыватнымі фірмамі. Нашы ж — прадстаўнікамі органаў правапарадку, якія не маюць спецыяльнай падрыхтоўкі ў тым, як забяспечваць бяспеку людзей менавіта на фестывалях. Яны ведаюць, што і як ім рабіць пры рабоце на масавых мерапрыемствах — няхай гэта будзе парад, мітынг і гэтак далей. І падыход да паводзін людзей на фестывалях, характэрных і абсалютна нармальных для іх, без экстрэмізму і небяспекі, у спецслужбаў адпаведны: ён адзіны для ўсіх мерапрыемстваў. Нюансы іх не цікавяць, таму арганізатарам фэстаў даводзіцца кожны раз падрабязна гутарыць з праваахоўнікамі, нешта тлумачыць ім, пераконваць у чымсьці…

А.П.: — На першым фестывалі "Камяніца" былі два міліцэйскія патрулі. На апошнім — тры міліцэйскія кардоны.

Ю.Д.: — Гэта сведчыць пра тое, што публіка ваша колькасна павялічваецца.

А.П.: — Добра было б, калі б толькі пра тое.

А.С.: — А мне здаецца, што з кожным годам прысутнасць міліцыі на мерапрыемствах стала менш прыкметнай. Яна ёсць, і ў той колькасці, якая неабходна пад кожны канкрэтны выпадак. Міліцыя ўсё ж навучылася так сабе паводзіць, "маскіравацца", каб не раздражняць залішне ўразлівых грамадзян.

А.А.: — Папраўдзе небяспечных наведвальнікаў мала прысутнічала на вашым фэсце, таму і міліцыі не шмат было. Сапраўды, узаемадзеянне, паразуменне з органамі правапарадку палепшыліся. Таму я не стаў бы дэманізаваць вобраз нашай міліцыі ў гэтым сэнсе. У рэшце рэшт, гэта з вобласці псіхалогіі, і міліцыю можна зразумець, бо раны трагедыі на Нямізе яшчэ не хутка зажывуць і забудуцца. А ў маёй практыцы была непрыемная гісторыя, калі патэлефанаваў адзін дурань і сказаў, што на фестывалі закладзена бомба. Мы з міліцыяй адпрацавалі вельмі хутка гэтую сітуацыю, вывелі ўсе тры тысячы людзей з пляцоўкі — ветліва і карэктна. Вядома, міліцыя сёння сто разоў падстрахуецца пад час правядзення фестываляў. Часам яна і перастрахоўваецца, але я яе разумею: мы, арганізатары, добраахвотна ідзём на рызыкі, міліцыянты — у сілу сваіх абавязкаў; іх рызыкі, іх хваляванне значна вышэйшыя.

Ю.Д.: — А ў нас працуе ўласная служба аховы, якая выдатна разумее спецыфіку нашага фестывалю. Дый публіцы шмат разоў не даводзіцца паўтараць, што з сябе ўяўляюць "Музычныя вечары..." і як на іх сябе трэба паводзіць.

— З мясцовымі ўладамі лёгка знаходзіцца агульная мова пры арганізацыі фестывалю?

А.П.: — "Правілы гульні" для такіх выпадкаў былі напісаны некалькі гадоў таму. Мы прывыкалі да іх, засвоілі, таму сёння праблем не ўзнікае.

А.А.: — "Правілы" будуць і далей рэгулявацца, відазмяняцца, таму што змяняецца час, умовы, але аснова ёсць. Асаблівасць нашага фестывалю заключаецца ў тым, што непадалёк ад пляцоўкі, дзе ён праходзіць, знаходзяцца жылыя дамы. Не ўсе жыхары рады такому суседству: гучная музыка, натоўпы людзей… Знаходзім спосабы, каб захаваць баланс паміж тымі, каму гэтае мерапрыемства можа перашкодзіць, і тымі, хто прыходзіць на яго адпачыць.

А.П.: — Мы таксама працуем з публікай. Адрозненне ж нашага фестывалю ў тым, што ён, у першую чаргу, — дабрачынны. Праходзіць у вёсцы Азярцо, дзе знаходзіцца адзіны ў краіне музей пад адкрытым небам — Музей народнай архітэктуры і побыту. "Камяніца" яго і папулярызуе. Здавалася б, і публіка павінна адпавядаць фестывальнаму пасылу. Да мінулага года ніякіх эксцэсаў не было. Але з-за таго, што кошт білетаў на фестываль быў даволі нізкі па цяперашнім часе — ён раўняўся кошту ўваходнага білета ў музей, — у выніку тут апынуліся тыя, каго сутнасць самога мерапрыемства, яго ідэя не хвалявалі. "Танна, фестываль як бы вядомы, давай з'ездзім", — напэўна, так разважалі. І, натуральна, сваімі паводзінамі, выглядам яны дысанавалі з астатнімі гледачамі. Ёсць падстава задумацца…

А.А.: — Зразумела, што публіка нават на фестываль строга вызначанага фармату прыходзіць самая розная. Прынцып "Моста" такі: хто б да нас ні прыходзіў — гэта наш глядач. Мне абыякавы яго статус. Я бачу, што сярод наведвальнікаў ёсць людзі багатыя, ёсць людзі не надта высокага дастатку, ёсць інтэлігенцыя, ёсць рабочы клас. Для музыкі ўсе роўныя. Галоўнае, каб і тыя, і іншыя паводзілі сябе адэкватна, не перашкаджалі адпачываць іншым, не ствaралі канфліктныя сітуацыі. Няхай выпускаюць пару — для гэтага фестывалі, у тым ліку, і прыдумляюцца, — але цывілізавана. Гэта значна лепш, калі яны тут будуць выплёскваць назапашаную энергію — са знакам "плюс" або "мінус", — а не ў крамах, на дарогах…

— А якая публіка ў "...Вечароў...", "...Паветра"?

Ю.Д.: —У фестывалю, безумоўна, ёсць мэтавая аўдыторыя: дарослыя, іх дзеці, жыхары Міра, Гродзенскай вобласці, Мінска, іншых беларускіх гарадоў ды абласцей, замежнікі, якія дабіраюцца сюды на ўласным транспарце. Немалаважна, што гэта "малапітны" кантынгент. Апроч музыкі іх вабяць і сама атмасфера Мірскага замка, яго наваколлі, прырода — уся гэтая прыгажосць. Публіка тут можа і перакусіць, і набыць сувеніры — пра гэта паклапаціліся мясцовыя ўлады.

Але не думаю, што каго б мы ні заявілі ў праграму, гледачы ўсё роўна збяруцца. Пралічваюцца ўсе дробязі: хто, напрыклад, павінен закрываць фестывальны дзень, які пераходзіць у ноч і заканчваецца пад раніцу…

Выстаўка **"Іосіф Гашкевіч: дыпламат, вучоны-арыенталіст"** адкрыецца 2 верасня ў Штаб-кватэры UNESCO ў Парыжы.

з "уласнай кішэні"...

У.Ш.: — Да нас прыязджаюць менавіта ў канкрэтнае месца — на хутар Шаблі Валожынскага раёна. Публіцы без розніцы, якая музыка будзе тут гучаць. Упэўнены, што, калі на фестываль я заяўлю толькі "фанаграму гурта "Троіца", прыедзе тая ж колькасць людзей, што і заўсёды. Для іх наш фэст — гэта пікнік пад жывую музыку, гэта — намёты, хатнія жывёлы… Пры маім скепсісе адносна мэтавай фестывальнай аўдыторыі ў краіне, у нас ёсць свая публіка, і яна шырыцца з года ў год, можа, і не так прыкметна для кагосьці. Гэта людзі сярэдняга ўзросту — ад 30 да 45 гадоў, асноўная маса — аўтамабілісты, хтосьці прыязджае на электрычках. Гэта разумная сямейная публіка, дзесьці нацыянальна арыентаваная, больш беларускамоўная, якой я задаволены. І публіку мы, калі жадаеце, "рэгулюем", назіраем за яе інтэлектуальным узроўнем. Я не зніжаю кошт білетаў да дзвюх умоўных адзінак. Я ніколі не запрашу, скажам, гурт, які можа дазволіць сабе Андрэй, зыходзячы з асобаснага ўспрымання дадзенага калектыву і разумеючы, які глядач пойдзе на яго, якія ён праблемы прынясе. Шаблі знаходзіцца ў даліне, і фэст, магчыма, рана ці позна пяройдзе рэчку Буянку, якая натуральным чынам агароджвае яго тэрыторыю. Але даліна і цяпер здольная сабраць тысяч трыццаць чалавек, аднак "Вудстокам" "Вольнае паветра" станавіцца не збіраецца. Той жа фестываль "Дружба", які арандаваў нашу "пляцоўку", калі ласка, можа паспрабаваць. А "Мосту", як я разумею, і так камфортна ў пасёлку Баравая пад Мінскам…

А.А.: — Мэты і задачы ў нас, натуральна, розныя. Кожны ўжо знайшоў сваю спецыялізацыю ды працуе ў абранай ім нішы. І глядач шукае ды знаходзіць або не знаходзіць уласную фестывальную нішу, працягвае яе выбіраць, шукаць. І галасуе рублём. Байкеры і "металісты" не будуць дурэць у Шаблінскага, а ў мяне — можа быць.

У.Ш.: — Вось тут якраз дарэчы будзе сказаць, што адбываецца стварэнне брэндаў…

Д.Н.: — Ідэя нашага фестывалю, які праходзіць у Брэсце, — прадставіць слухачу беларускамоўную музыку. Фэст праводзіцца ў клубе. Максімальная колькасць людзей, якую нам давялося сабраць, — дзесьці каля 850 чалавек.

А.А.: — Ёсць тут нейкая нестыкоўка: выступаеце вы за беларускамоўную музыку, а называецеся "Men's Fest"... А цяжка не ў Мінску сабраць людзей на фэст?

Д.Н.: — Цяжка ў тым сэнсе, што ў краіне не так шмат якасных беларускамоўных гуртоў, на якія пайшоў бы масавы глядач…

Фестываль фестывалю сябар

— Ці можна казаць пра канкурэнцыю паміж фестывалямі? Напрыклад, паміж "Вольным паветрам" і "Камяніцай"?

А.П.: — Не разумею, навошта і па сёння падагараваць тэму канкурэнцыі паміж намі? Такіх фестываляў, як "... Паветра" і "Камяніца", у краіне павінна быць штук дзесяць, каб можна было казаць аб канкурэнцыі.

У.Ш.: — На ўзроўні ідэі мы дакладна не канкурэнты, хоць некаторыя чамусьці лічаць, што наш фэст таксама ў першую чаргу "заточаны" на фольк ды этна. Іншая справа, што і мы, і "Камяніца" запрашаем у якасці айчынных хэдлайнераў беларускамоўных выканаўцаў. А такіх калектываў — якасных, як дакладна заўважыў Дзмітрый, — у краіне не так шмат. Таму перасячэнні па імёнах здараюцца. Калі мы і "канкурыравалі", то гэта было звязана з датамі правядзення мерапрыемстваў, але зараз яны разведзены…

— Калі ўжо зноў усплыла тэма "якасных беларускамоўных выканаўцаў", то ці магчымы ў Беларусі фэст беларускамоўнай музыкі — шматтысячны? Добра, проста фестываль сучаснай беларускай музыкі? Каб можна было і артыстаў набраць, і публіка б пайшла, і арганізатары не засталіся б у занадта вялікім "мінусе"?

А.А.: — Фольк-фэст, думаю, немагчымы: з-за вузкасці нішы. Рок- і поп-музыканты тысяч да пяці сабралі б.

У.Ш.: — Калі паставіць хэдлайнерам Каржа, прыйдзе дзесяць тысяч чалавек…

А.С.: — У Макса не фестывальная публіка, дый ён, па-мойму, не працуе на фестывалях.

Ю.Д.: — У рамках "Музычных вечароў..." прайшоў канцэрт "Жывы рок", у якім удзельнічалі толькі беларускія гурты, такія як "Akute", "The Toobes", "Дай дарогу!" ды іншыя. Публіка на іх сабралася і прымала вельмі добра.

А.А.: — А мне нецікава мець на фестывалі гурт, які да гэтага з пачатку года дзесяць разоў выступіў у вядомым мінскім клубе. Мне цікава запрашаць маладых музыкантаў, якіх, можа, хтосьці не ведае, але якія, на мой густ, выконваюць нармальную музыку. І я буду ўпэўнены, што гэтыя выканаўцы дакладна не з'явяцца на іншых бліжэйшых фэстах. Калі публіка давярае нашаму, то яна прыйдзе і на не вельмі вядомых айчынных артыстаў.

Ю.Д.: — Але адна з задач нашага фэсту таксама і ў тым, каб знаёміць людзей з не надта, быць можа, ім вядомымі таленавітымі беларускімі выканаўцамі! Аднак у сілу таго, што "...Вечары..." — праект тэлевізійны, мы стараемся забіць двух зайцоў адначасова: мы і знаёмім, і абавязкова прапануем хэдлайнэраў, якія і гледачу ля Замка, і гледачу ля экрана неабходныя па-любому. І тут яшчэ ёсць такая тонкасць, што малады музыкант можа выдатна выступаць у клубе, але на вялікай сцэне, перад вялікай колькасцю людзей ён становіцца зацiснутым, нецікавым, пачынае дрэнна граць ды спяваць, губляецца перад тэлевізійнай камерай. Нам трэба быць беспамылковымі ў сваім выбары, бо камеру не падманеш. А наогул, цікавасць да фэстаў у тэлеканалаў ёсць: і "Мост", і "Камяніца", і "Дружба" яны паказваюць.

— Персанальнае пытанне да Антона. Фестываль "Дружба" ў гэтым годзе прайшоў першы раз. Якія высновы зрабілі?

А.С.: — Праца над памылкамі ўжо вядзецца. Галоўнае, мы зразумелі, што сольны канцэрт выканаўцы і фестываль — гэта абсалютна розныя рэчы, гэта збольшага — розная публіка. Стваралася "Дружба" як праект доўгачасовы, і кідаць мы яго не збіраемся. У наступным годзе нешта сапраўды зменіцца пры яго арганізацыі ды правядзенні. Напрыклад, такога акцэнту на спіс выканаўцаў ужо не будзе: верагодна, пакінем толькі аднаго вялікага хэдлайнера. Я паспрабаваў уяўляць сябе на месцы гледача — мне ўсё спадабалася: і канцэрт, і побытавыя ўмовы. Я ў такой якасці на наступны год на фестываль прыехаў бы.

— Дабраліся да самага смачнага! Такім чынам, за што ж вас папракае публіка, і што вы ёй адказваеце?

У.Ш.: — Немагчыма задаволіць усе запыты ўсёй публікі. І я як арганізатар не стаўлю перад сабой такой задачы. Сёння ў чалавека дрэнны настрой, але білет ён купіў паўгода таму, таму не паехаць не мог. І пачынаецца: яму не падабаецца месца на паркоўцы (чаму яно на сонечным баку?), яму здаецца, што ахоўнікі залішне старанна яго правяраюць, і гэтак далей. Вярнуўшыся, а то і проста на месцы, ён пачынае вывальваць вось гэты "набыты негатыў" у сацыяльныя сеткі: піва няма, народ жудасны, канцэрт — поўнае...

А.С.: — А то і да пачатку фестывалю, ледзь стане вядомы спіс выканаўцаў на ім... Не падабаецца? Сядзіце наступным разам дома. Да здаровай крытыкі, вядома, прыслухоўвацца трэба. Але і публіка павінна разумець, што фестываль — гэта ў чымсьці спартанскія ўмовы, ступень камфорту на ім — мінімальная. Людзям павінна быць забяспечана ахова, яны павінны мець магчымасць схадзіць у прыбіральню, нешта выпіць ды перакусіць, пачуць і ўбачыць заяўленых у праграму артыстаў. Гэта стандартны набор для любога фэсту ў любой краіне свету. Калі арганізатары захочуць даць гледачам яшчэ штосьці, то гэта будзе ўжо выходзіць за рамкі набору. А пісаць усякае рознае і я магу.

А.П.: — Пішуць у Інтэрнэце брыдкасці, не разумеючы, што гэта азначае: зладзіць фестываль…

Д.Н.: — У Брэсце — тое ж самае. Прычым, як мне здаецца, ёсць такая катэгорыя людзей, якія спецыяльна ходзяць на мерапрыемствы, каб потым пра іх агідна напісаць. Яны прыходзяць на фестываль, загадзя ўсім незадаволеныя. Я не так даўно быў на выступленні "Акіяна Эльзы", і за маёй спінай сядзеў хлопец, які ўвесь канцэрт рот не закрываў: "Гітарыст — дрэнны, бубнач — "левы", Вакарчук — не дацягвае..."

А.А.: — І хлопец гэты меў рацыю: раней "Акіян Эльзы" быў лепшы...

Юлія Дубоўская.

Дзмітрый Назараў.

Алег Пашак.

На маю думку...

Самастойна знаёміцца з шэдэўрамі сусветнага мастацтва абсалютнай большасці з нас часцяком няма калі. Сучаснасць — асяродак іміджмейкераў, папулярных крытыкаў, СМІ — тых, хто тлумачыць мільёнам, хто чаго варты ў гэтым свеце. Усе ведаюць, што Гамэр — вялікі эпічны паэт Старажытнай Грэцыі, але мала хто чытаў сёння "Іліяду" ці "Адысею". На слыху імёны Сакрата, Платона, Арыстоцеля, але ці трымаў хто хоць раз у руках іх творы, не кажучы пра зборы твораў, адолець якія здолелі наўрад ці шмат прафесійных філосафаў. Нават філасофская ды літаратурная класіка, якая належыць сучаснай культуры і якая знаёма студэнтам пераважна па інтэрнэтаўскім пераказе, у "выкананні" апошніх гучыць, мякка кажучы, дзіўнавата. Тое ж можна сказаць пра сусветна вядомых Шэкспіра, Сервантэса, Дастаеўскага, Борхеса, Маркеса, Эка, Коба Абэ, іншых знакавых постацей для сваіх народаў, а таксама культуры Еўропы ў цэлым, іншых кантынентаў.

Інтэрпрэтацыя: ці здолееш "патлумачыць" арыгінал?



ТЭКСТ

Ігар ВУГЛІК,
кандыдат гістарычных навук

Знаёмства з літаратурнымі творамі часта абмяжоўваецца веданнем сюжэтаў, але для сапраўднай літаратуры сюжэт — рэч заўсёды другасная, падсобная, сродак для выказвання аўтарскіх думак і пачуццяў. Каб справа была ў сюжэце, дык лепшымі літаратарамі лічыліся б сцэнарысты. Таму ў буйных пісьменнікаў было, можна сказаць, абыякавае стаўленне да стварэння сваіх, аўтарскіх, сюжэтных калізій: Шэкспір у драмах апрацоўваў, рабіў рымейкі знакамітых сюжэтаў пераважна з гістарычных хронік, Дастаеўскі "пазычаў" іх з газетных матэрыялаў, прысвечаных у асноўным злачынствам… Ёсць аўтары, у творах якіх падзейны, маторны сюжэт ледзь праяўлены і наўмысна другасны, як у "Пошуках страчанага часу" М.Пруста. Галоўнае ў мастацкім творы — тканіна тэксту, арганізаваная непаўторным аўтарскім стылем повязь вобразаў, думак, пачуццяў, гукаў. Усё сапраўднае мастацтва знаходзіцца НАД любой пазнейшай інтэрпрэтацыяй іншага чалавека, чый талент часцей за ўсё саступае таленту таго, каго ён "тлумачыць".

Гэтак сама і ў кінематографе, дзе веданне сюжэтнай канвы не можа замяніць відагляд індывідуальнай манеры кінарэжысёра ці акцёра. Дый як праз сюжэт пераказаць змест стужак "Ноч на зямлі" Дж.Джармуша, "Кнігі Праспэра" П.Грынуэя, "Шэпты і крыкі", "Скрозь цьмянае шкло", "Фанні і Аляксандр", іншых карцін І.Бергмана, "Птушак" А.Хічкока, шматлікіх шэдэўраў сусветнага кіно? Тое ж самае датычыцца і рэміксаў твораў класічнай музыкі, выконваемых на сучасны лад у стылістыцы арт-рок ды іншых. Застаецца яскравая, жорстка падкрэсленая асноўная меладыйная тэма, але знікае безліч меладычных нюансаў, гукавых мадуляцый класічных аркестравых інструментаў, што ствараюць музычную эстэтыку твора. Хаця калі інтэрпрэтатар — майстар, дык музычная тканіна напаўняецца новым, сучасным зместам, як у апрацоўках майстроў брытанскага арт-року 1970-х гг.

З іншага боку, радыёэфір FM-станцый запоўнены рэміксамі папулярных кампазіцый заходніх гуртоў у выкананні расійскіх поп-музыкантаў (праграмы накшталт "Мелодии века"), не кажучы пра творы знакамітых каманд, нават рымейкі накшталт "Жоўтай ракі" (савецкага "Карлсана") гучаць досыць прымітыўна ў параўнанні з арыгіналам (тым больш, што тэксты значна ці зусім перароблены). Калі маеш справу з сусветна вядомым хітом, трэба ці імкнуцца зрабіць яго максімальна дасканалую копію (як некалі рабілі з кампазіцыямі "The Beatles"), ці стварацъ якасна новы прадукт у сваёй стылістыцы. Як складана рабіць рымейкі непаўторнай мелодыкі і гуку, было бачна, калі навагоднюю праграму на канале расійскага тэлебачання вырашылі прысвяціць гурту "ABBA". (Дзякаваць богу, да "Pink Floyd", "Led Zeppelin" ды іншай класікі яшчэ асабліва не дабраліся.) На жаль, да падобных эксперыментаў далучыліся і нашы выканаўцы, у тым ліку на беларускай мове…

Канешне ж, добра, што моладзь, якая не была сучасніцай стварэння і сусветнага поспеху хітоў, спасцігне іх, няхай сабе і ў выкананні сучасных інтэрпрэтатараў, аднак ці не адаб'е гэта ў яе цікавасць да твораў? І што будзе, калі яна пачуе арыгінальнае выкананне? Інтэрпрэтацыя любой класікі, у першую чаргу — музычнай, патрабуе адпаведнага ўзроўню падрыхтоўкі і таленту, бо арыгінал на слыху, і хібы ды ляпы не хаваюцца, а відавочна лезуць у вушы. Таму там, дзе распаўсюджана стварэнне нават дасканалых копій — у жывапісе, скульптуры, — гэтыя творы лічацца загадзя другаснымі і набываюць значэнне толькі пры страце арыгінала.

У цэлым інтэрпрэтацыя — гэта заўсёды спрашчэнне, простае тлумачэнне, арыентаванае на ўяўленні аб узроўні культурнага развіцця спажыўца. Вялікае дасягненне плыні постмадэрнізму — стварэнне работ досыць высокага мастацкага ўзроўню з мэтай далучэння масавага спажыўца да дасягненняў еўрапейскай, сусветнай культуры. Гэтыя творы знаходзяцца паміж элітай і масай, высокім і нізкім, складаным і простым. Інтэрпрэтацыі Баха Ванэсай Мэй, рэклама ў суправаджэнні апрацаваных у сучасным стылі твораў Моцарта, касавыя стужкі "Троя", "Язон і арганаўты", "Адысея", "Рамэа і Джульета", "Закаханы Шэкспір", "Працэс" (О.Уэлса па творы Ф.Кафкі), навукова-папулярныя стужкі ды іншае звяртаюць увагу мільёнаў людзей на выдатныя творы мастацкай спадчыны.

Але гэта толькі перадумова для галоўнага — заахвоціць прачытаць, праслухаць, паглядзець арыгінальны твор мастацтва. Толькі тады можна даць сваю адзнаку таму, што называецца культурнай спадчынай, адкінуць традыцыйныя клішэ. І высветліцца, што Гамэра, Талстога, Бальзака дачытаць да канца без "лошадиных" доз кавы фізічна часта немагчыма, як і без заспакаяльнага, калі чытаць Дастаеўскага; што для разумення Джойса, Рэмбо, Белага патрабуецца нешта большае, чым звычайная свядомасць; стане зразумела, чаму напрыканцы лекцыі Платона заставаўся, як правіла, толькі адзін слухач і што класічная музыка ў большасці сваёй — не для людзей з халерычным ды сангвіністычным тэмпераментамі. Шмат аб чым давядзецца даведацца, але гэта будзе ўжо ўласны культурніцкі досвед, крок ад проста чалавека — да асобы.

1 верасня споўніцца 45 гадоў легендарнаму айчыннаму брэнду — Беларускаму дзяржаўнаму ансамблю **"Песняры"**.

На рэкламу Нацыянальнага мастацкага музея, размешчаную ў пераходзе на праспекце Незалежнасці, не кожны звяртаў увагу: у такім людным месцы прынята глядзець пад ногі, а не па баках. Кіраўніцтва ўстановы ўлічыла гэтую акалічнасць, і прыступкі, што вядуць у музей з вуліцы Леніна, былі забяспечаны стрэлкамі, якія падказваюць мінакам "верны шлях"... Камунальнікі з гэтым адзін час змагаліся, але ўрэшце паразуменне было дасягнута.

А ўжо неўзабаве свайго наведвальніка музей плануе ўзяць у абарот яшчэ на дальніх подступах ды "весці да мэты" ажно з метро. З дня на дзень на абедзвюх мінскіх лініях з'явяцца вагоны, упрыгожаныя сімволікай НММ, а таксама рэпрадукцыямі твораў класікаў беларускага мастацтва. Пра гэты ды іншыя амбітныя праекты "юбілейнага" для ўстановы года мы гутарым з іх нязменным арганізатарам — генеральным дырэктарам музея Уладзімірам ПРАКАПЦОВЫМ. Гэты творца і менеджар здатны не толькі выпраменьваць неверагодныя ідэі, але і дамагацца іх увасаблення ў жыццё.

Ілья СВІРЫН

Цукеркі, "Боінг" ды Музейны квартал

Менеджарскі "цюнінг" навакольнага свету

— Увогуле, мы меркавалі поўнасцю стварыць музейны вагон — як вонкава, так і ў інтэр'еры, — Уладзімір Іванавіч каментуе эскізы, што ляжаць на яго рабочым стале. — Едзеце вы на працу ў пахмурны панядзелак, і раптам перад вачыма — Хруцкі ці Бялыніцкі-Біруля, тут жа нашы музейныя буклеты ляжаць... Але пакуль не атрымалася. Справа ў тым, што рэклама, якой цяпер завешаны сцены вагонаў, прыносіць немалыя грошы, а рэпрадукцыі твораў мастацтва — толькі эстэтычнае задавальненне. Думаю, ніхто б не збяднеў, адмовіўшыся ад тых прыбыткаў, але... пакуль што дамовіцца не ўдалося. Добра яшчэ, што, дзякуючы патранажу Мінгарвыканкама, афармленне вагонаў абышлося нам толькі ў 5% ад камерцыйнага кошту: усяго ў шэсць мільёнаў рублёў.

Што да падземнага перахода... Хачу, каб ён пераўтварыўся ў гэткі "арт-андэграўнд". Я ўжо напісаў лісты ў розныя інстанцыі, дзякуючы чаму там пафарбавалі столь, замянілі перагарэлыя лямпы, навялі парадак... У нас такія цудоўныя вулічныя музыканты! Сам, прызнацца, неяк затрымаўся ў тым пераходзе, каб паслухаць добрую класічную музыку ў выкананні абаяльнай моладзі… Дык чаму б не стварыць там для іх своеасаблівую пляцоўку, якая ўспрымалася б як своеасаблівая прэлюдыя да музея?

— А ці няма задум зрабіць музейны "цюнінг" і іншых відаў транспарту: цягнікоў, цеплаходаў, самалётаў?

— Наконт самалётаў я даўно ўжо задумваўся. Чаму б тым "Боінгам", што лётаюць па ўсім свеце пад беларускім сцягам, не надаць імёны ўласныя: скажам, "Янка Купала" або "Іван Хруцкі"? Каб чакаючы ўзлёту дзе-небудзь у Франкфурце, пасажыры маглі паслухаць "Малітву" ў выкананні Мулявіна ці пагартаць буклет з рэпрадукцыямі твораў нашых мастакоў. Тут жа, канешне, павінна быць і рэкламная інфармацыя музея. Вялікіх сродкаў увасабленне гэтай ідэі не запатрабуе, але затое не надта абазнаныя ў нашай культуры замежнікі могуць значна палепшыць сваё разуменне той краіны, куды яны рушаць.

Пакуль жа разам з фабрыкай "Камунарка" мы рыхтуемся да прэзентацыі новага праекта — цукерак, на каробцы якіх змешчаны знакаміты "Партрэт невядомай..." Хруцкага. Думаю, спажыўцы заўважаць гэты прадукт на паліцах крам і аддадуць яму перавагу сярод іншых, куды менш выразных. А выкарыстаўшы цукеркі па прызначэнні, мо зірнуць і на адваротны бок, дзе пададзена інфармацыя пра мастака на трох мовах, а таксама, канешне ж, адрас ды час працы нашага музея. Наступным нашым кандытарскім праектам стане серыя шакаладак, кожная з якіх прысвечана таму або іншаму беларускаму мастаку XIX — XX стагоддзя.

— А ці не баіцеся абвінавачванняў у фрывольным стаўленні да класікі?

— Каб эфектыўна выконваць сваю грамадскую функцыю, музей павінен як мага больш актыўна выходзіць за межы ўласнай прасторы. На жаль, давялося прыйсці да высновы, што самі мастакі не заўсёды да гэтага падрыхтаваны і не хочуць бачыць рэпрадукцыі сваіх твораў нідзе, апрача акадэмічных выданняў. Альбо наадварот: лічаць нашы захады па прапагандзе беларускага мастацтва добрым бізнес-праектам, здатным прынесці ім неверагодныя дывідэнды. Зразумела, што пра іх гутарка пакуль не вядзецца, і на гэтай глебе з праваўладальнікамі часам узнікаюць непаразуменні.

Між іншым, у тых крамах, што працуюць пры буйных еўрапейскіх музеях, можна набыць не толькі альбомы ды кнігі, але і самыя размаітыя тавары на любы густ — скажам, гальштук у стылі Манэ ці Шагала. У нашым кіёску не так даўно з'явілася сувенірнае мыла, на ўпакоўцы якога — рэпрадукцыі твораў беларускіх мастакоў. Каб ніхто мяне не папікнуў у "знявазе класікі", вырашыў пачаць з сябе: апельсінавы варыянт таго мыла будзе мець маё ўласнае мастацкае аздабленне. Іншыя пахі праілюстравала мастачка Марыя Ісаёнак.

Трэба выкарыстоўваць усе магчымыя спосабы для прасоўвання сваіх калекцый і асабліва — нацыянальнага мастацтва. Зразумела, што традыцыйныя фаліянты сёння па кішэні нямногім. Менавіта таму разам з выдавецтвам "Беларусь" мы распачалі выпуск серыі "Славутыя мастакі з Беларусі". Недарагая кніжка амаль кішэннага фармату, усяго сем старонак тэксту, рэпрадукцыі... На пачатку планавалі ўсяго пяць такіх кніжачак, але праект "пайшоў", падтрымала яго і Міністэрства інфармацыі краіны. І вось, на адным з пасяджэнняў навуковай рады музея мы абмяркоўвалі, колькі ж кніжак павінна налічваць серыя: 50 або 100. І ў выніку доўгіх дыскусій прыйшлі да высновы, што абмяжоўваць маштабы не варта: гэтая серыя — бясконцая. Можа быць, праз нейкі час яе папоўняць постаці тых, каго сёння называюць творчай моладдзю…

Дарэчы, наш музейны шапік, дзе ўсё гэта прадаецца, даўно патрабуе пашырэння: асартымент пастаянна расце. Таму ў Музейным квартале запланавана ўжо цэлая крама — нам будзе чым запоўніць яе паліцы. Дарэчы, і арт-кавярня таксама адкрыецца ў новым месцы — утульным падвальчыку з асобным уваходам. Цяпер наведвальнікі кавярні мусяць падладжвацца да графіка працы музея, але ў будучым нейкія імпрэзы там можна будзе ладзіць хоць да рання.

— А на якой стадыі рэалізацыі знаходзіцца гэты амбітны праект?

— Рамонтныя работы ўжо вядуцца. У будынку па вуліцы Кірава замяняюць дах. Да канца года на стварэнне Музейнага квартала павінна быць асвоена 46 мільярдаў рублёў — грошы, як бачыце, немалыя…

— Апошнім часам пастаянна гучыць думка пра тое, што Ноч музеяў трэба праводзіць не адзін раз на год. Вы ўжо маеце тут пэўны досвед. Якія вынікі?

— Сапраўды, калі Ноч музеяў — гэта міжнароднае свята, якое не мы прыдумалі, дык Вераснёвая Ноч музеяў — аўтарскі прадукт. 13 верасня, у Дзень горада, мы зноў працуем да дзясятай вечара. Ізноў будуць нейкія цікавосткі на панадворку: правядзём арт-суботнік, пад час якога мастакі аздобяць крамы на прымузейнай тэрыторыі ды створаць "з падручных матэрыялаў" дзівоснага выгляду крэслы. Зразумела ж, што плён гэтай справы застанецца і па заканчэнні імпрэзы. Кожны тысячны наведвальнік атрымае падарункі, і ўжо гэтая задума сведчыць пра нашы прагнозы адносна цікавасці публікі. Так, лік будзе ісці менавіта на тысячы.

— Ці не можа так здарыцца, што музеі настолькі захопяцца "немузейнай" дзейнасцю — тымі ж імпрэзамі або вулічнымі праектамі, — што звычайныя выстаўкі адыдуць як бы на другі план?

— Ні ў якім выпадку! Мэта ўсіх гэтых прапагандысцкіх захадаў — акурат зацягнуць чалавека ў нашы залы. Купіў у падарунак цукеркі, паглядзеў на рэпрадукцыю Хруцкага ў не самым лепшым паліграфічным выкананні — і закарцела табе ўбачыць яе арыгінал. Дзе гэта можна зрабіць, апрача музея?

Што да розных імпрэз... Вытрыманыя ў пэўным тэматычным ключы, яны могуць стаць выдатным дадаткам да выставак. Прыкладам, неўзабаве мы будзем паказваць старадаўнюю японскую гравюру, і чаму б не зладзіць у яе рамках чайную цырымонію ў традыцыйным ключы? Чаму б не суправаджаць выстаўкі сакральнага мастацтва канцэртамі духоўнай музыкі? Такія захады мы будзем рабіць усё больш актыўна. Проста павесіць творы і чакаць гледачоў — гэта ўжо замала. Трэба шукаць новыя формы працы з наведвальнікамі. І нерэалізаваны патэнцыял тут пакуль вельмі вялікі.

У плане выставак верасень у нас увогуле чакаецца надзвычай насычаным, балазе спёка спала... 11-га адкрываем выстаўку "Мастакі Парыжскай школы" ў Нацыянальным мастацкім музеі Літвы. У венгерскі горад Кечкемет прыбудзе выстаўка беларускіх абразоў, якая раней ужо паспяхова прайшла ў Будапешце і Сольнаку. 27 верасня стартуе яшчэ адзін этапны праект — выстаўка з Эрмітажа. Чакаем на яе адкрыццё знакамітага Міхаіла Піятроўскага. А днём раней ён наведае Другі Нацыянальны музейны форум у Гомелі, які, вядома ж, таксама не абыдзецца без нашага ўдзелу: на конкурсе НММ прадстаўлены адразу ў пяці намінацыях.

— Ці ўяўляе дадзенае мерапрыемства цікавасць для такіх "лідараў галіны", як ваш музей?

— Натуральна! Гэта аналіз работы нашых музейных інстытуцый, абмен досведам і ідэямі, пошук новых форм. Не толькі ў цэнтральных, але і ў рэгіянальных музеях ёсць вартыя ўвагі вынаходнікі. Таму як прафесіяналу мне гэты форум вельмі цікавы. Тым больш, не так і часта ў нас надараецца магчымасць перамовіцца з калегамі, абмеркаваць нейкія сумесныя праекты...

— Мы ўжо пісалі пра вашы захады па вяртанні тых мастацкіх твораў, якія ў мінулыя часы былі раздадзены розным, не зусім профільным, арганізацыям. Наколькі яны плённыя?

— Сапраўды, такія захады намі робяцца пастаянна, і дзякуючы падтрымцы з боку прадстаўнікоў беларускага Урада яны прыносяць плён. Літаральна днямі ў наш музей прыбудуць работы Васіля Сумарава і Барыса Аракчэева. Я выпадкова адшукаў іх у адным санаторыі, дзе адпачываў гэтым летам. Звярнуўся да міністра аховы здароўя Васіля Жарко, і ён цалкам пагадзіўся з тым, што нацыянальны здабытак павінен захоўвацца менавіта ў музеі. Прычым менавіта ў дзяржаўным, які дае поўныя гарантыі іх захавання. Калі абанкруціўся Мінскі фарфоравы завод, я амаль цэлы год патраціў на тое, каб калекцыі яго цудоўнага ведамаснага музея не разышліся "па свеце". Менавіта адтуль — ваза Мікалая Міхалапа "Беларусь савецкая", якая займае пачэснае месца ў нашай экспазіцыі, прысвечанай гэтаму перыяду ў мастацтве. Агулам жа да нас трапіла больш за тысячу экспанатаў фарфору, і для яго паказу ўжо зарэзервавана месца ў Музейным квартале.

— Аднак тыя творы, што некалі былі вывезеныя за межы краіны, напэўна, ужо не вярнуць...

— З гэтай нагоды ў мяне з'явілася наступная ідэя: чаму б не прапанаваць абмен паміж музейнымі ўстановамі розных дзяржаў? Прыкладам, мы ахвяруем адным з твораў Шышкіна (наш музей праз тое не надта збяднее, бо агулам карцін гэтага мастака маем 13), а наўзамен атрымліваем 15 слуцкіх паясоў. Для іншых краін гэта проста прыгожы ўзор мастацкага ткацтва, а для нас — не раўнуючы нацыянальная рэліквія. І ўсё сумленна, бо рыначныя кошты ў дадзеным выпадку прыблізна аднолькавыя.

Дарэчы, 5 лістапада, акурат у дзень нашага 75-годдзя, адкрыецца выстаўка слуцкіх паясоў з калекцыі Нацыянальнага музея ў Варшаве. Увогуле, гісторыя музея пачала свой адлік яшчэ ў студзені 1939-га, калі была прынята адпаведная пастанова, але ж "дзень нараджэння" святкуецца пазней — ва ўгодкі адкрыцця музея. Гэта робіцца цалкам наўмысна, каб не абмяжоўвацца адным толькі святочным вечарам, каб юбілейным для нас станавіўся ледзь не цэлы год. Мяркуючы па ўсім, так яно гэтым разам і атрымалася…



Уладзімір Пракапцоў. / Фота Юрыя ІВАНОВА

Больш за 20 аматарскіх калектываў з 16 раёнаў сёння прымуць удзел у Абласным фэсце гумару і гульні **"Капыльскія пацехі"**.

Аналіз дынамікі рэформ

Наперад, але з аглядкай

ТЭКСТ



Святлана БУЛОЙЧЫК,
выкладчык БДУКіМ

Рэформы, якія праводзяцца ў сферы культуры Рэспублікі Беларусь, грамадскасцю ўспрымаюцца неадназначна і выклікаюць палеміку сярод спецыялістаў. Аднак агульнавядома, што для адказу на пытанне "Куды і як пойдзем?", варта, перш за ўсё, вызначыцца з тым, дзе знаходзімся. Прапаноўваю статыстычны аналіз дынамікі развіцця відаў культурнай дзейнасці. Гэта дазволіць з навуковага пункта гледжання ацаніць абстаноўку, якая склалася ў сферы культуры.

Прапановы і попыт

Выбарка статыстычных даных за дзесяцігадовы перыяд не можа лічыцца рэлевантнай: яна не адлюстроўвае рэальную тэндэнцыю. Нягледзячы на гэта, многія навукоўцы і даследчыкі робяць высновы, зыходзячы толькі з такога няпоўнага аналізу (які можа паказаць станоўчыя тэндэнцыі), што, у сваю чаргу, прыводзіць да неапраўданых рашэнняў ды падыходаў.

Рэкамендуецца, каб аб'ём аналізаванай выбаркі складаў не менш як 30 — 35 выпадкаў. У сувязі з гэтым мной былі прааналізаваны даныя за значны перыяд: з 1940-га па 2012 год. Аналіз дазволіў выявіць наступныя тэндэнцыі ў рабоце ўстаноў культуры:

— з 1940-га па 1985 год расце аб'ём попыту і прапановы ў тэатральным, бібліятэчным, музейным, кінапракатным відах дзейнасці. Гэта адлюстроўваецца як ва ўзрослай цікавасці насельніцтва да культурных прадуктаў, так і ў павелічэнні колькасці саміх устаноў у дадзены перыяд. У 1985 годзе ўзровень наведвальнасці ўстаноў сферы культуры быў самым высокім ва ўсіх відах дзейнасці;

— пасля 1985 адбываецца зніжэнне ўзроўню агульнай наведвальнасці (скарачэнне попыту, а ў асобных відах дзейнасці пры гэтым — і рост прапановы), што адлюстравана на малюнку 1.



Мал. 1. Дынаміка сукупнай наведвальнасці ўстаноў сферы культуры за перыяд 1985 — 2012 гады (на 1 000 чалавек насельніцтва).

Тэндэнцыя, аднак…

Прааналізуем дзейнасць публічных бібліятэк Беларусі. Пры разглядзе даных за перыяд 1985 — 2012 гг. выяўлена **тэндэнцыя скарачэння наведвальнасці публічных бібліятэк** (на 1 000 чалавек насельніцтва) на 27%. Гэта значыць, практычна трэць чытачоў была бібліятэкамі страчана.

У той жа час, пасля 1955-га назіраецца і **скарачэнне сеткі бібліятэк,** якое ў 2012 годзе склала 50% (палова бібліятэк перастала ажыццяўляць сваю дзейнасць). Скарачэнне было настолькі значным, што паказчыкі 2012-га ненамнога адрозніваюцца ад паказчыкаў пасляваеннага перыяду. Так, у 2012 годзе колькасць бібліятэк — 3 606 адзінак, а ў 1945 — 2 539 адзінак. А калі гэтыя паказчыкі супаставіць з колькасцю пражываючага насельніцтва ў адпаведныя гады (значыць, разгледзець колькасць бібліятэк на 1 000 чалавек насельніцтва), то і зусім атрымаецца, што даныя 2012-га ніжэйшыя (0,381), чым лічбы 1945-га (0,409). Тым не менш, пасля 1945 года назіраецца пашырэнне бібліятэчнай сеткі.

Сучасны стан рэчаў існуе на фоне:

— узрослай значнасці крокавай даступнасці бібліятэк. У ходзе даследавання "Сучасны стан і тэндэнцыі развіцця дзіцячага чытання ў Рэспубліцы Беларусь: па выніках рэспубліканскага даследавання" сярод прычын, па якіх дзеці не запісаны ў бібліятэкі, найбольш важкай стала наступная: "Бібліятэка знаходзіцца далёка ад дома";

— агульнага значнага зніжэння цікавасці да чытання. Гэта пацвярджаецца вынікамі даследавання, якое праводзіцца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. У структуры вольнага часу моладзі прагляд тэлевізара займае першае месца (61,6% рэспандэнтаў абралі дадзены варыянт адказу), а чытанне — толькі трэцяе (35,5% апытаных);

— узнікнення новых сродкаў атрымання інфармацыі (Інтэрнэту). Велізарныя масівы інфармацыі ў Сеціве спарадзілі ілюзію прастаты атрымання ведаў. Аднак дакладнасць бясплатных сеткавых рэсурсаў патрабуе праверкі. Акрамя таго, доступ да поўных версій алічбаваных навуковых крыніц абмежаваны законам "Аб аўтарскім праве і сумежных правах", паколькі аўтары павінны захоўваць выключныя правы на выкарыстанне сваіх твораў.

Фонды для душы

Аналізуючы колькасць бібліятэчных фондаў, варта вылучыць дзве рознанакіраваныя тэндэнцыі:

— рэзкае павелічэнне фондаў у пасляваенныя гады (1940 — 1985). Бібліятэчныя фонды на 1 000 чалавек насельніцтва ў 1985 годзе, у параўнанні з 1940-м, павялічыліся больш чым у 13 разоў;

— паэтапнае скарачэнне фондаў пасля 1985 года. У 2012-м гэты паказчык склаў 66,5 млн. асобнікаў, што менш за паказчык 1985 года на 34%. У той жа час, стандарты UNESCO, дзе сказана, што аб'ём кніжнага фонду павінен складаць 1,5 — 2,5 кнігі на душу насельніцтва, выконваюцца, што можа быць абумоўлена літаратурнай спадчынай СССР.

Такім чынам, для дзейнасці публічных бібліятэк Рэспублікі Беларусь характэрна наступная тэндэнцыя: змяншэнне бібліятэчных фондаў, наведвальнасці і колькасці бібліятэк.

У заключэнне хацелася б прывесці цытату Джона Гершэла: "Прывіце чалавеку густ да чытання і дайце магчымасць чытаць, і вы непазбежна зробіце яго шчаслівым…".

Практычны расклад

Зарабляць дзеля заробку

Мы, журналісты, часта забываемся на тое, што ў штаце аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі абавязкова ёсць эканаміст. А гэта ж менавіта ён "алічбоўвае" творчасць, правярае гармонію алгебрай ды дае рублёвую ацэнку дзейнасці кожнага работніка культуры. І ўсё гэта разам мы называем эканомікай культуры. А эканаміст, са свайго практычнага гледзішча, штодня аперыруе крыху іншым тэрмінам — "культура эканомікі". Менавіта пра гэтую прафесійную спецыфіку мы вырашылі пагутарыць з эканамістам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Ашмянскага райвыканкама Марынай МАНТУР.

Яўген РАГІН

— Марына Іванаўна, ну і як аддзелу зарабляецца?

— Няпроста. Планы па аказанні паслуг вельмі вялікія. Сёлета заданне па пазабюджэце — 1 мільярд 256,6 мільёна рублёў. Гэта на 30 працэнтаў вышэй, чым фактычнае выкананне плана ў 2013 годзе.

— Гэты больш чым мільярд вы павінны зарабіць не толькі за кошт культурных паслуг…

— Безумоўна. 90 працэнтаў паслуг ад усяго пазабюджэту — культурныя паслугі. Астатняе — даходы ад арэнды памяшканняў, сцэнічных касцюмаў, а таксама — банкаўскія працэнты ад захавання грошай на нашым рахунку.

— Дык чаму выкананне плана па аказанні менавіта культурных паслуг даецца нялёгка?

— Тут вельмі простая прычына. Паслуга, скажам, ад канцэрта толькі тады якасная, калі адпаведнымі з'яўляюцца гук і святло на сцэне. Рэальнасць не заўжды адпавядае нашым жаданням. Не сакрэт, што апаратуру трэба перыядычна абнаўляць, а гэта не заўжды атрымліваецца.

— Ці можна за кошт пазабюджэту істотна ўзняць заробкі работнікаў культуры?

— Мы, зыходзячы з заканадаўства, накіроўваем гэтыя грошы не толькі для матэрыяльнага стымулявання, але і на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы. Ідуць пазабюджэтныя грошы і на кампенсацыю камунальных плацяжоў. Пагашаем гэтымі сродкамі крэдыторскую запазычанасць плацяжоў. Не забывайце, што ёсць у нас і штатныя адзінкі, якія ўтрымліваюцца толькі за кошт пазабюджэтных сродкаў. Словам, *значна* павялічыць заробак мы пакуль не здольны, тым больш, калі на парадку дня — неадкладнае пытанне, звязанае, скажам, з рамонтам сельскага Дома культуры.

— Тым не менш, калі ўзяць неблагога сярэднестатыстычнага работніка, якую надбаўку за кошт пазабюджэтных сродкаў ён можа атрымаць у дадатак да месячнага заробку?

— Калі работнік сапраўды з ліку лепшых, то ён можа атрымаць з пазабюджэту і 500 тысяч рублёў. Але, натуральна, гэта даплата для тых, хто сам умее зарабляць ды імкнецца выканаць даведзены план. А такое імкненне, не сакрэт, наўпрост звязана не з механічным выкананнем абавязкаў, а з пастаянным творчым пошукам новых форм працы.

— На сёння колькі аддзел зарабіў?

— Каля 800 мільёнаў пазабюджэтных рублёў. Усё зробім для таго, каб з гадавым заданнем справіцца.

— На што канкрэтна робіце тут стаўку?

— На творчую дзейнасць тых нашых мастацкіх калектываў, якія здавён лічацца гонарам культуры Ашмяншчыны. Гэта народныя ансамблі песні і танца "Крыніцы", народнай песні — "Жытніца", народны тэатр танца і песні "Імпульс" ды многія іншыя.

Марына МАНТУР,
эканаміст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Ашмянскага райвыканкама

"Калі работнік сапраўды з ліку лепшых, то ён можа атрымаць з пазабюджэту і 500 тысяч рублёў. Але, натуральна, гэта **даплата для тых, хто сам умее зарабляць ды імкнецца выканаць даведзены план**. А такое імкненне, не сакрэт, наўпрост звязана не з механічным выкананнем абавязкаў, а з пастаянным творчым пошукам новых форм працы".

— Значыць, асноўная крыніца пазабюджэтных даходаў у вас — канцэртная дзейнасць… А сярэднямесячны заробак па аддзеле цяпер які? І якая катэгорыя работнікаў культуры зарабляе больш?

— У сярэднім за месяц нашы работнікі атрымліваюць 3 мільёны 150 тысяч рублёў. Натуральна, даходы большыя ў выкладчыкаў дзіцячых школ мастацтваў. Яны маюць неблагую нагрузку па асноўным месцы працы ды яшчэ могуць падпрацоўваць акампаніятарамі. Астатнія катэгорыі работнікаў працуюць на стаўку (у лепшым выпадку). І не сакрэт, што самыя нізкія заробкі — у бібліятэкараў, асабліва гарадскіх, якія не маюць "сельскай" даплаты.

— Марына Іванаўна, вы выконвалі бухгалтарскія функцыі пры падрыхтоўцы і рэалізацыі шэрагу творчых праектаў. Раскажыце, наколькі цяжка гэта было.

— Цяжка бывае толькі першы раз. Калі партнёры — неабыякавыя, хутка прыстасоўваешся да новых умоў працы. Першы трансгранічны праект быў рэалізаваны на базе Гальшанскай бібліятэкі. Там, як вы ведаеце, з'явіўся Музей Дугі Струвэ. Потым 56 тысяч еўра мы атрымалі для правядзення фэсту "Гальшанскі замак". Трэці праект рэалізоўваем сёлета. "К" таксама пра яго пісала. На базе Кальчунскай сельскай бібліятэкі ў рамках Еўрапейскага інструмента добрасуседства і партнёрства ствараецца Клуб вясковых старастаў КУТ (культура управления территорией). Бібліятэка, па сутнасці, ужо стала буйным інфармацыйна-палітычным цэнтрам, што паяднаў жыхароў Кальчунскага сельсавета.

— І апошняе пытанне: ці маеце сталага спонсара?

— Нам пашанцавала: такім спонсарам для аддзела даўно з'яўляецца Тамара Уладзіміраўна Філіповіч — дырэктар Ашмянскага мясакамбіната. Яна для РДК і дываны дапамагла набыць, і многія нашы ініцыятывы заўжды падтрымлівае…

К

27 жніўня ў Італіі стартаваў **71-шы Венецыянскі міжнародны кінафестываль**, які будзе доўжыцца каля двух тыдняў.

КУЛЬТУРА www.kimpress.by / Экспертыза "К"

Сёння ў Тураве адбудзецца X Імпрэза камернай і духоўнай музыкі пры ўдзеле выбітнага аркестра пад кіраўніцтвам маэстра **Міхаіла Фінберга.**

Тэатральная плошча

"Мне сняцца сны...". Авангардныя

Perpetuum mobile думкі

Гродзенскі спектакль "Фаўст. Сны" ўжо паспеў нарабіць шуму на абодвух буйных форумах тэатраў лялек у Беларусі: і ў пазаконкурснай праграме Міжнароднага свята "Лялькі над Нёманам", і, літаральна праз некалькі дзён, на Міжнародным фестывалі ў Мінску. Пастаноўка была вылучана на III Нацыянальную тэатральную прэмію, прайшла ў фінал (хто б сумняваўся!), таму ўвосень ізноў будзе паказана ў сталіцы.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Галоўны рэжысёр Гродзенскага абласнога тэатра лялек Алег Жугжда даўно набыў славу таленавітага, удумлівага, а часам і экстравагантнага пастаноўшчыка. Асабліва папулярным ягонае імя стала пасля "Пікавай дамы", уганараванай у нас і замежжы ўжо ледзь не дваццаць разоў. Але той, хто зноў чакае ад яго такой жа нязмушана-гуллівай "забаўкі з сакрэтам", як было ў "Пікавай...", будзе расчараваны. Бо ўжо сам матэрыял, пакладзены ў аснову, — прынцыпова іншы. Ён узрос не з "анекдота", пераказанага А.Пушкіным на драматычны лад, а са старадаўняй легенды. А тую, як ні трансфармуй у вясёлыя прыгоды (а менавіта так было ў фальклорных зборах), вынік атрымаецца — філасофскі. Таму няма чаго здзіўляцца, што новы спектакль патрабуе ад гледача такой жа самааддачы, як і ад артыстаў. Плануеце адпачыць пасля працоўнага дня? Марна! Вядома, у "Фаўсце..." ёсць дзе і здзівіцца, і пасмяяцца, але ўсё гэта — толькі дзеля таго, каб запрацаваў perpetuum mobile вашай думкі. І не думайце, што фінал паставіць упэўненую кропку ці ўзнёсла-трагедыйны клічнік. Наадварот, яго неаднаразовыя шматкроп'і будуць вымушаць шукаць выйсце з усё больш мудрагелістых лабірынтаў. Нязручнай для працягу сур'ёзных роздумаў становіцца і немагчымасць хаця б крыху адпачыць ды сабрацца з думкамі ў антракце, бо апошняга папросту няма. Можа, рэжысёр спужаўся, што пасля перапынку ў зале з'явяцца вольныя месцы? А хоць бы і так. Бо справа не ў тым, цяжка ці лёгка выседзець амаль дзве гадзіны, а ў тым, што шматслойнасць філасофскага фіналу (і нават фіналаў, бо насамрэч іх некалькі) патрабуе не менш яснага данясення сэнсу — як кажуць, "с чувством, с толком, с расстановкой", чым меладраматычныя калізіі з кранальна-трапяткой, пачуццёвай Грэтхен (Аляксандра Ліцвінёнак).

Спектакль атрымаўся надзвычай актуальным, звернутым у сучаснасць і будучыню, а таксама, як ні дзіўна гэта будзе для многіх, вельмі нацыянальным. І справа не толькі ў тым, што на Беларусі калісьці жыў свой Фаўст — навуковец і чарнакніжнік Марцін Радзівіл, дзед Антонія Генрыха Радзівіла — аўтара першай у свеце оперы паводле паэмы Гётэ, дзе лібрэтыстам быў сам паэт. Беларускасць пастаноўкі — у многіх мастацкіх дэталях, у самых розных спасылках на нашу гісторыю, культуру, жыццёвыя рэаліі. Невыпадкова ў фінале на экране ўзнікае ядзерны выбух — для нас, беларусаў, яшчэ і як напамін пра Чарнобыль (дадамо, што адна з версій смерці рэальнага сярэднявечнага прататыпа Фаўста — праз жудасны выбух у выніку няўдалага хімічнага вопыту).

Хаця слова "сны" ў назве звязана не з мінулым, а з будучым, у спектаклі ў той або іншай меры закрануты ўсе эпохі, пачынаючы ад Сярэднявечча, калі і жыў рэальны прататып героя. Адраджэнне прадстаўлена так званай народнай кнігай пра Фаўста, выдадзенай Ёганам Шпісам і заснаванай на фальклоры. Асветніцтва — спасылкай на п'есу Готхальда Лесінга са шчаслівым фіналам: там, дарэчы, усе падзеі толькі прысніліся Фаўсту, каб засцерагчы яго ад нявернага кроку (у Гётэ ж напярэдадні сустрэчы з Мефістофелем Фаўст праводзіць бяссонную ноч). Рамантызм — паэмай Ёгана Гётэ, операй Шарля Гуно. "Авангардызмы" пачатку XX стагоддзя — сцэнаграфіяй, дзе прасочваецца ўздзеянне канструктывізму (мастак — Аляксандр Сільвановіч). Постмадэрн — мноствам вышэйзгаданых ды многіх іншых свядомых спасылак. Цікава, што ёсць у спектаклі і неўсвядомленыя спасылкі — на кантату Альфрэда Шнітке "Гісторыя доктара Ёгана Фаўста" і, яшчэ больш, на згаданую оперу нашчадка знакамітага магнацкага роду Радзівілаў. Менавіта ў гэтым творы Мефістофель упершыню спяваў-гаварыў не толькі рознымі мужчынскімі тэмбрамі, але і жаночым меца-сапрана. І хаця опера пісалася ў Германіі, куды Радзівіл пераехаў, нечаканае ўвасабленне Мефістофеля непераўзыдзенай Ларысай Мікуліч у версіі Жугжды можна назваць, у пэўнай меры, працягам калісьці закладзенай беларускай традыцыі.

Сцэна са спектакля. / Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Пры такім раскладзе міжволі задумваешся над тым, што Мефістофель — шмат у чым раўня Фаўсту "па розуме і сіле празарэння". Пры некаторых умовах іх саюз мог бы быць плённы. Але "Мефістофель у спадніцы" (насамрэч, у трыко-камбінезоне, выклікаючы асацыяцыі з Чалавекам-павуком, які хоча выратаваць Сусвет) імкнецца напаскудзіць Фаўсту. А той, у сваю чаргу, не асабліва яму давярае, даручаючы хіба выканальніцкія функцыі. Мефістофель — выконвае ўсё. Але прынцыпова даводзіць кожнае быццам бы бяскрыўднае і нават добрае даручэнне да яго чорнай супрацьлегласці. Трэба, каб маці Грэтхен спала і не чула? Атруцім. Просьба "вырашыць пытанне са старымі", чыя хата стаіць на месцы будучай грэблі, прызванай "адваяваць кавалак зямлі"? Значыць, заб'ём старых, падпалім хату. Тут ужо міжволі ўзнікаюць паралелі і з Дастаеўскім, і з рэвалюцыйнымі тэрорамі: маўляў, ці можна дзеля высокай мэты зрабіць невялічкае няшчасце — і чаму яно раптам ператвараецца ў вялікае? Сімвалічная і невідушчасць Фаўста: ён упэўнены, што робіць дабро, на справе ж атрымліваецца ўсё з дакладнасцю наадварот.

Так што галоўным антаганістам Фаўста становіцца ў спектаклі не Мефістофель, а... быццам бы другасны Вагнер (Аляксандр Рацько), упэўнены, што ведае адказы на ўсе загадкі і не задумваецца пра наступствы сваіх вопытаў ды вынаходніцтваў. Новая пастаноўка — не пра сілу д'ябла і чалавека, не пра старасць і маладосць, не пра гісторыю кахання (ды Фаўст не ў Грэтхен закаханы, а адно ў сваю навуку!), не пра якія іншыя падзеі з жыцця Фаўста, уключаючы яго гістарычнае падарожжа ў антычную міфалогію. Яна — пра адказнасць розуму за вынаходніцтвы, што могуць прынесці шкоду. І ўвесь спектакль чытаецца не як гісторыя пра тое, што хтосьці камусьці душу прадаў, а як роздум пра адказнасць кожнага за свае ўчынкі перад будучыняй, неабходнасць яшчэ і яшчэ раз узважваць кожнае сваё рашэнне: ці не схаваны ў ім, апроч бачных плюсаў, нябачныя мінусы? І што, у рэшце рэшт, важней? Аблічча навукоўца-алхіміка (а гэта не толькі Фаўст ды Вагнер, але і анёлы, урачы) становіцца ўсеабдымным — як сімвал чалавека ў пошуках ісціны.

Спектакль вабіць і ўласна мастацкімі якасцямі. Тут і тэатр ценяў, і фотады відэавыявы, і шматлікія наўмысна зробленыя паўторы тых або іншых прыёмаў — своеасаблівыя лейтматывы і рэмінісцэнцыі. Неаднойчы даводзілася чуць, як спектакль абвінавачвалі ў адсутнасці выбітных лялек і, адпаведна, віртуознага лялькаваджэння. Сапраўды, лялькі тут — вельмі простыя, тая ж Марта — увогуле плоская. Але ў лялечных постацях галоўных герояў відавочныя не толькі простыя геаметрычныя фігуры (як тут не згадаць таго ж Казіміра Малевіча ды іншых мастакоў пачатку XX стагоддзя), але і сувязі са старажытным мастацтвам драўлянай скульптуры, шырока развітым як у Германіі, так і ў Беларусі. А спалучэнне ў сцэнаграфіі квадрата (прамавугольніка, куба) з кругам можа разглядацца не толькі як прамы працяг малевічаўскіх пошукаў, але і як непасрэдная спасылка на сцэнаграфію гэтага мастака да футурыстычнай оперы "Перамога над сонцам" (менавіта там упершыню з'явіўся "Чорны квадрат"), пастаўленую ўсяго двойчы: у Пецярбургу (1913) і Віцебску (1920). Празрысты ж куб з гранямі-экранамі ўвогуле можа лічыцца "спалучэннем-яднаннем" квадрата з кругам, бо артысты павольна круцяць яго, бы той глобус. Намёк на традыцыі батлейкі бачыцца ў някідкім, але заўважным падзеле сцэнічнай прасторы на нябёсы, зямлю і пекла (менавіта адтуль, з тумбачкі пасярод сцэны, бы з нейкай скрыні-скарбонкі-табакеркі, і з'яўляецца Мефістофель).

Запрашэнне на ролю Фаўста не лялечніка, а вядомага драматычнага акцёра Аляксандра Шаўкапляса было прадыктавана важнасцю ў спектаклі не толькі відовішча, але і ўласна слова. Уражвае не механічнае, а ўдумлівае, асэнсаванае данясенне тэксту ўсімі ўдзельнікамі, бо ў такім вымаўленні чытаецца работа думкі. Знакамітая цытата "Спачатку было Слова" не толькі агучваецца, але і пішацца на экране, прычым па-нямецку, гётэўскім почыркам, — у варыянце факсіміле. Развагі Гётэ пра першынство Слова, Думкі, Сілы ці Справы — што можа быць больш надзённым? А ўсе прыгоды герояў — так, для антуражу...

К

Камертон

Ружы з шыпамі ў ільняных валасах

Верасень для культурнай грамадскасці Гродзеншчыны ўжо пачаў асацыявацца са Святам класічнай музыкі "TyzenHouse": настолькі яркім і запамінальным быў леташні старт гэтага фестывалю. Але сёлета музычны форум перанесены на лістапад. А ў пачатку кастрычніка піяніст Кірыл Кедук — ініцыятар і мастацкі кіраўнік гэтага свята, лаўрэат больш як пятнаццаці найпрэстыжных міжнародных конкурсаў — выступіць з сольным канцэртам у сталічнай зале "Верхні горад". Сярод іншых твораў там прагучаць і тыя, што ўвашлі ў яго дэбютны альбом "Мой польскі дзённік", выдадзены знакамітай амерыканскай фірмай "Delos".

Надзея БУНЦЭВІЧ



Кірыл Кедук.

Назва альбома — невыпадковая. Выканаўца прысвяціў яго свайму бацьку — паляку па паходжанні, які шмат зрабіў для станаўлення юнага музыканта. Менавіта бацька паехаў з сынам-васьмікласнікам у Польшчу, калі той, перамогшы на міжнародным конкурсе, атрымаў грант на далейшае навучанне там. Дапамог вывучыць мову, адаптавацца. І, па словах Кірыла, нават цяпер, пасля смерці, працягвае сачыць за яго кар'ерай, радуецца кожнаму поспеху...

У альбоме сабраны збольшага амаль невядомыя нам польскія творы XIX — першай паловы XX стагоддзя. Змешчаныя ў храналагічным парадку, яны даюць уяўленне пра развіццё польскай фартэпіяннай музыкі — ад Шапэна да Лютаслаўскага — і праецыруюць гэта на беларускую культуру, якая развівалася паралельна, а часам і разам (не будзем забывацца на Напалеона Орду, які вучыўся ў Шапэна, сябраваў з ім і пераймаў яго манеру, а таксама на існаванне да 1939 года Заходняй Беларусі, культурныя пласты якой яшчэ толькі пачынаюць вывучацца). Асабліва цікавымі для спазнання блізкасці і рознасці музычных шляхоў Беларусі і Польшчы ўяўляецца цыкл "Ружы і шыпы" Юліюса Зарэбскага (1854 — 1885). Гэтыя пяць мініяцюр, абсалютна імпрэсіяніcцкіх па стылі, дазваляюць, акрамя ўсяго іншага, абвергнуць выключна французскае паходжанне дадзенага музычнага напрамку і думкі пра тое, што ў Польшчу, як і ў іншыя краіны, імпрэсіяніcцкія павевы трапілі толькі пасля Дэбюсі. Вымалёўваецца іншая лінія руху — праз вытанчаныя калье ажурных пасажаў Шапэна, які другую палову жыцця правёў у Парыжы, праз працяг гэтых традыцый на ягонай радзіме, праз агульную еўрапейскую "шапэнізацыю", вынікам якой і сталі праслаўтыя "дэбюсізмы". І ці не польскую (а можа, беларускую?) дзяўчыну намаляваў кампазітар у сваёй знакамітай прэлюдыі "Дзяўчына з валасамі колеру лёну"?..

Усе гэтыя думкі былі народжаны не вывучэннем кожнай ноткі згаданых "Руж і шыпоў", а менавіта выкананнем гэтых п'ес Кірылам Кедукам. Салісты рэдка звяртаюцца да пяра і паперы, вынікам іх даследаванняў — часта парадаксальных, у піку агульнапрынятым "энцыклапедычным" ведам — становіцца новае "прачытанне" музыкі, выяўленае ў гуках. У гэтых ды іншых творах Кірыл дасягае такой прыгажосці гуку і яго палётнасці (гэтае вакальнае азначэнне тут вельмі дарэчы), што ўвесь альбом "пралятае" на адным дыханні. Шкада толькі, што ў Беларусі мы так рэдка чуем гэтага цудоўнага гродзенскага піяніста.

К

Камертон

Партытура страсці

Шагал. Партрэт у музыцы

3 верасня Беларуская дзяржаўная філармонія і Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі на чале з Аляксандрам Анісімавым адкрываюць канцэртны сезон — паводле традыцыі, нацыянальнай прэм'ерай. Мы пачуем "Страсці па Марку" Галіны Гарэлавай, прысвечаныя Марку Шагалу і створаныя паводле яго карцін.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Упершыню гэты твор, прымеркаваны да 125-годдзя з дня нараджэння сусветна вядомага мастака, прагучаў на яго радзіме ў Віцебску — пазалетась, у выкананні сімфанічнага аркестра Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Беларусі. Дырыжыраваў тады Сімон Камарцін (Швейцарыя). На скрыпцы саліравала Валерыя Гуцул (Беларусь — Расія).

Больш падрабязна пра гісторыю стварэння "Страсцей па Марку" распавяла кампазітар Галіна ГАРЭЛАВА:

— Гэтую партытуру мне замовіў швейцарскі дырыжор Сімон Камарцін. У 2008-м ён адкрываў тамтэйшы Міжнародны фестываль сучаснай акадэмічнай музыкі маім творам "Міф патаемны". Дый потым, супрацоўнічаючы з нашым аркестрам радыё, неаднаразова сутыкаўся з беларускай музыкай. Ну а Шагал для яго — увогуле кумір! Мне ў падарунак ён даслаў Біблію на нямецкай мове і каляндар — усё з рэпрадукцыямі Шагала. Як і кожнаму прыхільніку мастака, яму вельмі хацелася пабываць у Віцебску, дакрануцца да тых мясцін, што ўзрасцілі гэтага генія. І да юбілейнай даты ён замовіў мне шматчасткавую сімфанічную кампазіцыю. Умовы былі — каб саліравала скрыпка (што абсалютна натуральна ў дачыненні да Шагала і, шырэй, яўрэйскай культуры) і каб у аснове кожнай часткі была адна з карцін майстра. Прапанаваў ён і свае "сем карцін". Праўда, я з тым выбарам не пагадзілася. Нашы густы супалі толькі на апошняй — "Над горадам", бо мне хацелася звярнуцца да карцін, непасрэдна звязаных з Віцебскам — "сардэчным цэнтрам Сусвету", як пісаў мастак пра свой родны горад. Каб у цэнтры твора апынуўся менавіта віцебскі Шагал, а не парыжскі ці нью-ёркскі. Але я ніколі не напісала б гэтую партытуру, каб не адзін выпадак больш як трыццацігадовай даўніны.

Скончыўшы Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па класе Дзмітрыя Смольскага, я тады вучылася ў асістэнтуры-стажыроўцы пры ёй — у класе патрыярха нашай нацыянальнай культуры Анатоля Багатырова. А ён, як вядома, родам з Віцебска, і там ладзілі яго аўтарскі вечар. Я ж на той час у Віцебску ніколі не была — і напрасілася разам з ім. У тую паездку Анатоль Васільевіч адкрыў для мяне свой Віцебск — і адначасова шагалаўскі. Між іншым, яны былі знаёмыя, іх сем'і сябравалі! Па суботах, калі веравызнанне забараняе яўрэям працаваць, бацька будучага кампазітара пасылаў да Шагалаў свайго сына — раздзімаць самавар і што іншае дапамагаць па гаспадарцы. Але хто сёння пра гэта ведае?..

Мы вельмі доўга не маглі адшукаць дом Шагала. Да каго ні звернемся — усе толькі плячыма паціскаюць. Яго імя і творчасць тады яшчэ ледзь толькі пачыналі ўваходзіць у савецкую рэчаіснасць. Але ўжо быў выдадзены першы зборнік яго рэпрадукцый. Па іх я добра ўяўляла, як тая хатка павінна выглядаць. Але ў які бок ісці? Так што давялося арыентавацца на багатыроўскія ўспаміны дзяцінства: дзесьці непадалёк ад макароннай фабрыкі. І знайшлі-такі! Папрасіліся ў тых, хто там жыў, увайсці. Пастаялі. І нібыта адчулі, што Марк дзесьці побач — лунае ў паветры...

Віцебск тады падаўся мне шэрым, непрывабным. Але Багатыроў адкрыў мне "Душу горада" (так называецца адна з карцін Шагала і першая частка майго твора) — тую душу, якую не маглі збэсціць ніякія разбурэнні. "Вось тут быў, — казаў ён, паказваючы на нейкія горы смецця, — сабор. А вось тут — касцёл". Гэта было, як сёння сказалі б, віртуальнае падарожжа — экскурсія па неіснуючых аб'ектах. Перада мной паўстаў іншы Віцебск — крыштальны, звонавы, які я і ўвасобіла ў музыцы, хаця, зразумела, у ёй ёсць і рысы сучаснага ўрбанізму.

Другая частка — "Падзенне Ікара", вырашаная як няўмольная катастрофа. Трэцяя — "Скрыпач" (карціна больш вядомая як "Зялёны скрыпач", бо ў музыканта на ёй — зялёны твар). Аркестр тут адпачывае, затое сола скрыпкі — сімвал шматвекавой яўрэйскай культуры — зроблена, быццам гэта дуэт. Чацвёртым выступае эскіз да карціны з нагоды першай гадавіны рэвалюцыі — "Вершнік". У руках вершніка — рог, перададзены ў музыцы сігнальнай інтанацыяй. Але ў асноўным у аркестры задзейнічана не святочная медзь, а ўсё тое, што грукае, стукае, шчоўкае, ляскае: музыка сімвалізуе ўсё неадушаўлёнае, як у трылеры пра страшныя цацкі, здольныя забіваць. Пятая частка — "Белае распяцце", якое выяўляе боль мастака за ганенні на яўрэяў. Шостая — "Музыканты". Усе персанажы на гэтым палатне Шагала глядзяць у розныя бакі. У музыцы гэта перададзена гетэрафаніяй — адначасовым гучаннем розных варыянтаў адной фальклорнай папеўкі. Фінальная сёмая частка — "Над горадам" — шмат у чым перагукаецца з першай, утвараючы своеасаблівае абрамленне. Марк і Бэла лунаюць над віцебскімі хацінамі, шчыльна прыціснуўшыся адно да аднаго. Музыка тут адлятае літаральна ў касмічныя вяршыні...

Мне вельмі хацелася, каб менавіта Валерыя Гуцул саліравала на той сусветнай прэм'еры ў Віцебску. Я ведала гэтую скрыпачку яшчэ тады, калі яна вучылася ў Рэспубліканскай гімназіі-каледжы пры нашай Акадэміі музыкі.

Потым яна з'ехала ў Маскву, зрабіла бліскучую кар'еру. Лаўрэат шматлікіх міжнародных конкурсаў, на той час яна стала першай скрыпкай аркестра Вялікага тэатра Расіі. Галоўнае ў яе выкананні — жывы нерв музыкі, які яна перадае слухачам. Памятаю, яна прыехала за два дні да канцэрта — і аркестр радыё, з якім яна павінна была саліраваць, адразу падцягнуўся, пачаў арыентавацца на яе выканальніцкі ўзровень.

Што ж да цяперашняга выканання, дык спачатку я прапанавала Аляксандру Анісімаву іншую партытуру, якая яшчэ ніколі не гучала: "Куды вядзе нас барабаншчык?..". А ён папрасіў яшчэ што-небудзь, каб можна было, як ён любіць казаць, "больш пагрымець". І ў выніку спыніўся на "Страсцях па Марку". Саліраваць гэтым разам будзе Рэгіна Саркісава — першая скрыпка аркестра Вялікага тэатра Беларусі.

Дадамо, што ўвесь гэты канцэрт, уключаючы літаратурна-музычную кампазіцыю паводле оперы "Мазепа" П.Чайкоўскага і паэмы "Палтава" А.Пушкіна з удзелам папулярнага расійскага кінаакцёра Андрэя Мярзлікіна, будзе транслявацца ў рэжыме онлайн на вялізным экране, устаноўленым ля Ратушы. А вось карціны Шагала, нават у электроннай версіі, паказаць, на жаль, не давядзецца. Памятаеце вулічную выстаўку яго работ насупраць Філармоніі два гады таму? На ўзгадненне юрыдычных ды фінансавых пытанняў з Шагалаўскім камітэтам, як запэўнілі арганізатары з фонду "Ідэя", пайшло тады пяць месяцаў. Таму, каб спалучыць музыку з фарбамі, бярыце смартфоны, планшэты — і на плошчу!..

К

Валадарства чорнай лініі

У мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага музея-запаведніка праходзіць выстаўка Уладзіміра Хіна "Абразная гравюра на дрэве". Вядомы сваімі нястомнымі пошукамі мастак, які абраў сабе "кітайскі" псеўданім, гэтым разам звярнуўся да самага старажытнага прадвесніка друку, што нарадзіўся ў Паднябеснай яшчэ ў VI стагоддзі.

Ілья СВІРЫН

Уладзімір Хін. "Ключ".

Уладзімір Хін. "Ну азірніся...".

Мастыхін

"Увесь працэс стварэння абразной гравюры на дрэве амаль не змяніўся, ён такі самы, як і тысячу гадоў таму... Асаблівасці абразной гравюры — валадарства чорнай лініі і плямы", — адзначыў мастак у эксплікацыі да выстаўкі, дадаўшы, што гэтая тэхніка сёння не карыстаецца папулярнасцю і фактычна знаходзіцца на мяжы знікнення. Таму выстаўка ставіць сабе за мэту таксама і прыцягненне ўвагі да дрэварыту.

Прадстаўленыя ў трох выставачных залах паўсотні твораў з'явіліся пераважна ў 1980-х — 90-х, аднак не страцілі сваёй эмацыйнай свежасці. Гэта своеасаблівыя "стоп-кадры" ўнутранага жыцця мастака, канспект убачанага, прачытанага, пераасэнсаванага.

Уладзімір Хін ужо амаль трыццаць гадоў спрабуе паяднаць у сваіх творах выяву і слова, знайсці візуальны адпаведнік тым паэтычным радкам, якія яго ўразілі. Аўтары — самыя розныя: Блэйк, Хлебнікаў, Рыльке... Іх лучыць хіба тая творчая "грунтоўнасць", што ўласціва і самому мастаку. Абстрактныя або алегарычныя выявы спалучаюцца з літарамі, адмысловая імпульсіўная графічная выява якіх нібыта надае тэкстам новае вымярэнне альбо робіць іх больш даступнымі для ўспрымання.

Натуральна, гравюра не здатная ўражваць з першага погляду: гэта мастацтва камернае, інтэлігентнае, някідкае. І разлічана яно на ўдумлівага гледача. Як адзначыў сам аўтар, у галерэйнай прасторы ўдалося стварыць адпаведную атмасферу сумоўя — у тым ліку і дзякуючы супрацоўнікам галерэі, якія бездакорна зрабілі экспазіцыю.

К

Шакаладную карціну прадставяць у **Музеі шакаладу "Nikolya"**, што адкрыецца 4 верасня ў Нацыянальным гістарычным музеі.

Велатур "К": па ваколіцах "каралеўскага горада"

"Гродзенскі

Серыя першая

Водная роўнядзь, не парушаная турызмам

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Але, як распавялі мясцовыя жыхары, здараецца гэтая працэдура не надта часта, прычым не па раскладзе кшталту "з дзевяці да шасці", а толькі па адмысловых заяўках. Адпаведна, ніякай гарантаванасці.

У звязку з гэтым, прыгадаўся наступны прыклад. На мяжы Польшчы і Славакіі ёсць прыгожая горная рэчка Дунаец. Яе хараство здолелі б ацаніць вельмі нямногія, калі б яшчэ гадоў сто таму прадпрымальныя мясцовыя сяляне не прыдумалі турыстычную атракцыю — сплаў на плытах. Сёння яны курсіруюць з рэгулярнасцю гарадскога транспарту, а дабрацца з Кракава да пачатковага пункта і выбрацца з канцавога можна на рэйсавых аўтобусах. З гэтым, дарэчы, на Аўгустоўскім канале праблема, бо маршрутныя аўтобусы з Гродна туды ходзяць далёка не кожны дзень! Тое ж самае датычыцца і "хлеба надзённага". Там — кавярні непасрэдна на беразе Дунайца, а тут — прадбачлівая "ссабойка" з бутэрбродамі ды мінералкай.

Думаецца, парушыць роўнядзь Аўгустоўскага канала можа толькі аналагічны "фірмовы" турпрадукт, для стварэння якога тут ёсць усе ўмовы. Што самае цікавае, "у зародкавым стане" ён ужо спраўна функцыянуе: другі сезон запар адна мясцовая фірма прыкладна раз на тыдзень сплаўляе ўсіх ахвотных на байдарках ад Гродна да Нямнова. Але, па-першае, пра гэта нам удалося даведацца толькі ў самім Нямнове, бо на афіцыйным сайце Аўгустоўскага канала можна дазнацца хіба пра сам факт існавання апошняга. Адшукаць адказы на чатыры тыповыя пытанні турыста — "Як дабрацца?", "Дзе спыніцца?", "Што рабіць?" і "Дзе паесці?" — там альбо вельмі складана, альбо ўвогуле немагчыма. А па-другое... Байдаркі — гэта, як ні круці, "не для ўсіх".

Для аматараў "матраснага" адпачынку ў ваколіцах суседняга шлюза "Дамброўка" курсіруе цеплаход "Нёман" (пра расклад рэйсаў Інтэрнэт інтрыгоўна маўчыць...). Ды, як падаецца, гадзінная водная прагулка — гэта таксама не надта важкі стымул ехаць менавіта сюды. А вось каб турыст мог сесці на "параходзік" у Гродне, а выйсці на бераг ужо ў Аўгуставе — як тое ўжо было ў "зорны" для Канала міжваенны час, калі турызм тут буяў... Ці яшчэ круцей: сесці ў Аўгуставе — і дабрацца да Балтыйскага мора... Гэта, пагадзіцеся, зусім іншая справа.

Краявіды Аўгустоўскага канала.

Падобныя ідэі даўно лунаюць у паветры. Здавалася б, для іх рэалізацыі ёсць не раўнуючы ўсё: прынцыповая падтрымка дзяржавы, зацікаўленасць польскага боку, належныя ўмовы навігацыі, транспарт і нават унікальная "водная мытня", здатная пераўтварыць памежныя фармальнасці ў яшчэ адзін займальны атракцыён. І нават цяжка зразумець, чаму ідэі застаюцца ідэямі, а над Каналам па-ранейшаму пануе цішыня…

Папраўдзе народны музей

Затое ўжо згаданы музей — з'ява і сапраўды ўнікальная. Калі аргкамітэт сёлетняга форуму ў Гомелі вырашыць увесці намінацыю "Самы народны музей", першы прэтэндэнт будзе навідавоку. Можа, менавіта таму яго дзверы заўсёды адкрыты для ўсіх ахвотных — фактычна, у любы час сутак.

— Ніякі я не дырэктар. Хто вам такое сказаў? — усміхнулася Любоў Зажэцкая. — Гэта мой дом, мы тут жывём…

Прыватныя музеі або галерэі зазвычай ствараюць дзеячы культуры альбо проста "апантаныя". Часцяком гэтыя людзі ставяць перад сабой нейкія амбітныя мэты — асабістыя альбо грамадскія. Але дадзены выпадак — выключэнне. Музей паўстаў тут толькі таму, што яго стваральнікі палічылі гэта справай цалкам натуральнай — амаль такой, як надзённыя гаспадарчыя клопаты. Дзякуючы гэтым людзям мы адкрылі дзіўную рэч: аказваецца, сярод мясцовых жыхароў Аўгустоўскі канал ніколі не быў забыты.

— Мае продкі сплаўлялі па ім лес і, між іншым, нядрэнна праз тое жылі, — распавядае Любоў Зажэцкая. — За сезон можна было зарабіць ажно на дзевяць кароў! А якая тут была культура... Жанчыны высаджвалі на берагах кветнікі, уздоўж Канала вяла дарога з пакрыццём…

Сваё афіцыйнае існаванне Канал спыніў яшчэ ў далёкім 1956 годзе. Апошні даглядчык у Нямнове Іван Лукша канчаткова страціў працу ў 1968-м. Гэтая дата азначае кропку першага перыяду гісторыі воднага шляху: яго поўнасцю "спісалі ва ўтыль". У 1996-м унук таго даглядчыка Тадэвуш Урбанюк стварыў музей ва ўласным гаражы — на падворку старога дзедаўскага дома. Гэта была першая ініцыятыва па захаванні памяці пра Аўгустоўскі канал — і зыходзіла яна, як бачым, "знізу".

— Вядома, Тадзіку мы ўсе шчыра дапамагалі з гэтым музеем, — распавяла Любоў Зажэцкая. — Але праз два гады ён памёр, удава прадала дом, бо ёй гэтая справа была не надта цікавая. Новыя гаспадары вырашылі выкарыстоўваць гараж па прызначэнні, і музей перабраўся да нас…

Старадаўнія надпісы на будынку музея.

Любоў Зажэцкая кліча сына Аляксандра, які быў змушаны адарвацца ці то ад рамонту машыны, ці то ад якой іншай гаспадарчай справы. Ён вокамгненна пераўтвараецца ў экскурсавода, і мы пачынаем агляд музея. У ліку экспанатаў ёсць і сапраўдныя рарытэты: прыкладам, фрагменты старых механізмаў шлюза або аўтэнтычная шыльда, якая чамусьці аказалася "на ўзбочыне" пад час нядаўняй рэканструкцыі. Паходжанне артэфактаў цалкам зразумелае: гэта тыя рэчы, якія нехта ў свой час, па сутнасці, выкінуў на сметнік.

Экскурсія грунтоўная — наздзіў для "непрафесіяналаў". Расповед падмацоўваецца дэманстрацый арыгіналаў і копій разнастайных гістарычных дакументаў — кшталту тарыфаў на шлюзаванне ў міжваенныя часы. Варта адзначыць, што пра саму гісторыю канала і шлюза

Пад час майстар-класа.

На людным месцы

Кветкавы фэст у пасёлку

Фестываль кветак "Спадчына мая — старонка родная" прайшоў днямі ў пасёлку Жалудок, што на Гродзеншчыне, і стаў сапраўдным падарункам для фларыстаў. Мясцовыя жыхары правялі конкурс кветкавых кампазіцый, букетаў, прэзентацыі дасягненняў садаводаў-аматараў "Традыцыі продкаў і сучасныя фантазіі". А напрыканцы фэсту можна было прадэгуставаць напоі, варэнні і саленні, прыняць удзел у кірмашы народных кулінарных рэцэптаў.

Удзельніцы свята.

ЖАЛУДОК

Пра падзею распавядае Генадзь Цывінскі, старшыня Жалудоцкага сельвыканкама:

— Гісторыя фестывалю пачынаецца з 2004 года — з горада Шчучына. Менавіта тады пад час адкрыцця тамтэйшай гімназіі прайшоў невялікі фэст: выстаўка кветак. На наступны год ён пачаў паціху развівацца, а ўжо з 2010-га перастаў праходзіць у Шчучыне. Мы ж яшчэ з 2008 года праводзілі яго як адборачны, а пасля падхапілі ініцыятыву і ладзім фэст чацвёрты год...

На думку намесніка старшыні Шчучынскага райвыканкама Ганны Хвядзюк, фэст стаў брэндам рэгіёна:

— Вельмі добра, што фестываль шырока распасцірае свае крылы. Я вельмі спадзяюся, што ў тым ліку і гэтым святам мы уносім пэўны ўклад у развіццё падзейнага турызму ў нашай краіне.

У фэсце ўдзельнічаюць усе арганізацыі Жалудка. Яны прадстаўляюць кветкавыя кампазіцыі, удзельнічаюць у розных намінацыях (конкурсы дэфіле, кветкавага касцюма). Амаль кожны падворак у мястэчку ўпрыгожаны кветкамі…

Андрэй МЯЛЕШКА
Фота аўтара

Кнігапіс

Прафесія не для слабых

Беларускі фонд культуры выдаў кнігу "Культура — прафесія не для слабых". Падзея прымеркавана да 70-годдзя Валерыя Будняцкага, колішняга дырэктара Дома культуры Магілёўскага аўтазавода. За савецкім часам на базе гэтай установы актыўна ствараліся разнажанравыя мастацкія калектывы. Такі ўздым самадзейнай творчасці звязаны, у тым ліку, і з неабыякавасцю мастацкіх кіраўнікоў Мікалая Дудчанкі, Валянціны Гаявой, Мікалая Хомчанкі…

Валерый Будняцкі як цудоўны адміністратар ініцыяваў самыя розныя сацыякультурныя праекты ды садзейнічаў іхняй рэалізацыі. Адзін з іх — развіццё цэхавай самадзейнасці. Як зазначае ў кнізе этнахарэограф Мікола Козенка, Будняцкі стварыў мадэль сістэмы сацыякультурнай дзейнасці ў ведамаснай прасторы. Складнікамі сістэмы апрача галаўной установы культуры павінны былі стаць музычныя і агульнаадукацыйныя школы, дзіцячыя садкі, кіраўніцкія канторы ды вытворчыя цэхі…

Герой выдання — аўтар фундаментальных публікацый па праблемах захавання народнай культуры, развіцця аматарскай творчасці, рынкавай эканомікі ў культуры і мастацтве.

Андрэй СТАРЖЫНСКІ

Амаль 100 музеяў краіны возьмуць удзел у II Нацыянальным форуме **"Музеі Беларусі"**, які пройдзе 26-27 верасня ў Гомелі.

трохкутнік" і яго адрозненне ад Бермудскага

"неарганізаваныя" падарожнікі могуць даведацца, па сутнасці, толькі ў гэтым музеі. Звыклая для замежжа паслуга "набяры на мабільніку нумар і паслухай інфармацыю" ў нас пакуль не прыжылася.

Але галоўным экспанатам музея, без сумневу, з'яўляецца сам яго будынак. Разам з усім комплексам Аўгустоўскага канала, у Дзяржспісе гісторыка-культурных каштоўнасцей ён пазначаны катэгорыяй "0" — трохі вышэй, чым "проста" помнік міжнароднага значэння! Палову плошчаў "брыкстайлавай" камяніцы некалі займалі адміністрацыйныя памяшканні, а вось другая частка была аддадзена пад гатэльчык. Пастаяльцы пакідалі на мурах свае аўтографы на родных мовах: у залежнасці ад пертурбацый эпохі, гэта магла быць руская, польская і нямецкая. Некаторым з "тутбыўвася" ўжо больш за сто гадоў! Робячы рамонт свайго дома, які дастаўся ім у зусім непрыглядным стане, цяперашнія гаспадары тыя надпісы дбайна захавалі — і было гэта, між іншым, больш як за два дзесяцігоддзі да таго, як беларуская частка Канала набыла другое жыццё!

Цвік у якасці пэндзля

На польскай частцы Канала своеасаблівым цэнтрам жыцця з'яўляецца, натуральна ж, Аўгустаў. На Беларусі гэтую ролю адыгрывае зграбнае і дагледжанае мястэчка Сапоцкін — найбуйнейшы населены пункт у тых краях. Праехаўшы трохі ўздоўж бязлюднага берага, збочваем туды.

Вуліца Яна Паўла II, Элізы Ажэшка… Вежы касцёла Успення Найсвяцейшай Дзевы Марыі, які з'яўляецца своеасаблівай візітоўкай мястэчка… Сапоцкін адразу вылучаецца сваім унікальным культурным кліматам, які фарміраваўся на працягу стагоддзяў і ўбіраў у сябе польскія, беларускія і літоўскія традыцыі. Гэта адзіны куток Беларусі, які ў выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай на нейкі час апынуўся ў складзе Прусіі. Магчыма, менавіта з той пары на вуліцах мястэчка пануе ўзорны парадак. Адным словам, было б пра што апавесці ў музеі — каб ён, вядома, быў.

Зрэшты, яго функцыю ў пэўнай меры выконвае мясцовы Цэнтр культуры і народнай творчасці — рэдкая ў сваёй намінацыі ўстанова, якая ладную частку сваіх платных паслуг зарабляе за кошт правядзення экскурсій. А дырэктар Цэнтра Ганна Галубцова па сумяшчальніцтве кіруе яшчэ і турыстычным інфармацыйным цэнтрам, што два гады таму адкрыўся ў мястэчку. Карацей, універсальны спецыяліст, які выдатна ведае ўсе цікавосткі ды асаблівасці краю і, лічы, носіць "музей" у сабе. Дарэчы, і спалучэнне гэтых пасад у Ганны Чаславаўны атрымалася самым натуральным чынам: яе як знаўцу культуры Сапоцкіна аднойчы запрасілі правесці экскурсію для турыстаў. І… неяк яно ўсё закруцілася.

Перапад вады шлюза "Нямнова" — 10 метраў. / Фота аўтараў.

Мы самі здолелі ацаніць дасведчанасць Ганны Чаславаўны ў самых розных пытаннях, напрыклад, здзейсніўшы шпацыр у сядзібны комплекс у Свяцку. Але, вядома, без вялікай экскурсіі па Цэнтры культуры і народнай творчасці ўражанні ад Сапоцкіна засталіся б няпоўнымі. Па-першае, таму, што Ганна Галубцова літаральна захавала Цэнтр ад закрыцця, пагадзіўшыся стаць кіраўніком установы культуры, што не вызначалася добрымі паказчыкамі. Па-другое, таму, што сёння Цэнтр актыўна прапагандуе мясцовую культуру і толькі ў мінулым годзе дамогся атрымання статуса нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці лакальнай традыцыі роспісу велікодных яек.

Што ж можа прапанаваць турыстам установа культуры? Вядома, не толькі тыповы этнакуток. Сапраўдныя "разыначкі" экскурсіі — знаёмства з мясцовай кулінарыяй (уключна са знакамітымі сапоцкінскімі пончыкамі) і тэхнікай роспісу велікодных яек, якая летась займела статус нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці. Прычым знаёмства, адзначым, "у рабочым рэжыме". Бо акрамя таго, што традыцыя роспісу "пісанак" у Сапоцкіне жыве, яна, да ўсяго, і цалкам адкрытая да вывучэння. Сёння ўзяць майстар-клас па роспісе велікодных яек у сапраўднага майстра Антаніны Ключэня можа кожны ахвотны. Гэтай магчымасцю мы, вядома ж, скарысталіся.

Як распавяла спадарыня Ключэня, гэтай асаблівай тэхніцы яе навучыла маці. Адмыслова да нашага прыходу майстрыха падрыхтавала раствор для афарбоўкі яек, вадкі пчаліны воск і, вядома, цвік, які ў дадзеным выпадку выступае ў ролі пэндзля: ім і наносіцца малюнак на яйка.

Асцярожна наносім малюнак дрыжачымі пальцамі — і воск застывае імгненна. Паправіць няўдалую рысачку ўжо не атрымаецца. Разумеем, што майстэрства роспісу "пісанак" — у спрытнасці і адначасова канцэнтрацыі. Занятак, варта заўважыць, не такі і далёкі ад медытатыўных практык.

— А што значаць гэтыя малюнкі? — пытаемся і робім, спрабуючы не ўдарыць тварам у гразь.

— Гэта прыродны арнамент: малюнак кветак, — адказвае Антаніна Лук'янаўна, адзначаючы, у той жа час, што менавіта яе роспіс мае назву "польскі ўзор".

Пасля таго як малюнак зроблены (у нашым выпадку ён атрымаўся з ухілам у экспрэсіянізм), яйка апускаецца ў адмысловы раствор, які фарбуе. Яго склад — вада з выключна прыроднымі інгрэдыентамі. У гэтую сумесь можа ўваходзіць нават попел: для таго, каб фарба добра ўзялася. Наступны крок працэдуры — "купанне" яйка ў гарачай вадзе, калі воск расплаўляецца і малюнак атрымлівае свой белы колер.

"Вызваленне ад воску" адбываецца ўжо пасля таго, як распісанае яйка доўгі час паляжыць у прыроднай фарбе. Але спадарыня Антаніна прадбачліва падрыхтавала нам распісаны "паўфабрыкант", які на нашых вачах ператвараецца ў гатовы прадукт.

— Усё, далей работа шаруецца алеем і ставіцца сушыцца, — майстар дэманструе "гарачанькі" шэдэўр. — Вашы "пісанкі" мы таксама давядзём да ладу — і далучым да нашай калекцыі, — "супакойвае" нас Антаніна Лук'янаўна, звяртаючы ўвагу на збор арыгінальных распісаных твораў у сваім пакойчыку. Што ж, радуе тое, што " не адны мы такія", і толькі той, хто не спрабуе, не памыляецца.

Што да пытання наконт магчымасці самому ў хатніх умовах зрабіць падобны роспіс яек, скажам шчыра: так, тое цалкам магчыма. Але, вядома, калі вы не забудзецеся на такі важны складнік, як павага да прыроднага матэрыялу, любоў, нават асаблівы светапогляд. Бо нават сучасныя фарбы для яек, якія прадаюцца ў супермаркетах, тут гэтую тонкую мяжу традыцыі ўсё ж парушаюць.

Таму раім паспытаць на сабе ўздзеянне гэтай, несумненна, захапляльнай практыкі роспісу непасрэдна ў Сапоцкіне. А калі ўбачыце там нашы работы — просьба не судзіць нас строга.

■■■

Гіпатэтычна, у польскі Аўгустаў, які даў назву Каналу, мы маглі б дабрацца і ўздоўж яго берага. Гэта яшчэ адзін варыянт турыстычнага "асваення" аб'екта і, у дадатак, найкарацейшы шлях — аўтобус "Гродна — Аўгустаў" пераадольвае ці не ў чатыры разы большую адлегласць. Праблема нават не ў адсутнасці суцэльнай веладарожкі, пра стварэнне якой гаворка вядзецца ўжо не першы год. Проста, ужо згаданы пункт пропуску "Лясная — Рудаўка" працуе выключна ў "водным" рэжыме. Пашырэнне яго паўнамоцтваў і на веласіпедыстаў — таксама даўно ўжо ў планах. А пакуль што рушым "у аб'езд". І паколькі наш шлях літаральна насычаны цікавосткамі, шкадаваць пра змарнаваны час не выпадае…

К

Працяг матэрыялаў велатура **чытайце ў наступных нумарах "К".**

На людным месцы

"Тут мая вёска — мае карані"

У мінулую нядзелю ў вёсцы Сакольнікі Мазалаўскага сельскага савета, што ў Віцебскім раёне, панавалі весялосць і ажыўленне. Тут праходзіла свята вёскі: спяваў залівіста гармонік, гучалі песні ды гоман тых, хто любіць сваю малую радзіму і шануе свае карані. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі работнікі Мазалаўскага дома культуры і дзіцячай школы мастацтваў.

ВІЦЕБШЧЫНА

Свята адкрыла кіруючая справамі сельвыканкама Кацярына Каралёва, якая адзначыла, што дадзенае мерапрыемства праходзіць на сакольніцкай зямлі ў Год гасціннасці — юбілейны з дня ўтварэння раёна. Не абышлося і без віншаванняў удзельнікаў вайны з 70-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Як знак пашаны жыхарам "на ручніку з тканіны тонкай" быў падораны каравай, які мог пакаштаваць кожны, хто завітаў на свята. Выступілі народны ансамбль народнай песні і музыкі "Вераснянка", вакальны калектыў "Крыніцы", інструментальны ансамбль "Балагуры". З музычнымі падарункамі выходзілі на імправізаваную сцэну адно за адным вучні дзіцячай школы мастацтваў.

Ансамбль "Балагуры".

Арганізатары свята распавялі пра гісторыю вёскі, адзначыўшы, што "жыццё яе — бяконцая кніга". Кніга жыцця вёскі Сакольнікі багатая на падзеі: радасныя і сумныя, салодкія і горкія…

Пад час мерапрыемства адбылося ўзнагароджанне пераможцаў Рэгіянальнага агляду-конкурсу "Мая вёска — гонар мой". Лаўрэатамі сталі Мікалай Косаў (намінацыя "Лепшая сядзіба"), Раіса Артамонава ("Лепшы домік у вёсцы"), Валянцін Павірахаў ("Лепшы кветнік") і Людміла Забароўская ("Лепшая малая архітэктурная форма"). Быў арганізаваны сход, на якім выбралі старшыню вёскі: ёй стала карэнная жыхарка, добрая маці і жонка Наталля Буткова.

Частаванне бульбай.

Андрэй СТРУНЧАНКА,
вядучы метадыст
Віцебскага АМЦНТ

12 —14 верасня пройдзе **Другі Фестываль мастацтваў беларусаў свету**, у якім прымуць удзел суайчыннікі з 18 краін.

Тактыка культурнага развіцця

Апошні месяц лета выдаўся, на мой погляд, нефармальна-фестывальным. Так ужо атрымалася, што "на закуску ды на пасашок" нам прапанавалі зусім не-абы якія святы. Прынамсі, сумна на іх не было. І прычына тут досыць простая: шукаць адказы на пытанне "Для каго ж быў той фестываль: для запрошаных удзельнікаў, жыхароў фестывальнага горада (мястэчка) ці стыхійных гасцей-турыстаў?" не давялося. Для гэтага ў першых, другіх і трэціх папросту не заставалася часу...

Яўген РАГІН

"Касуха", валёнкі ды...

Услед за рок-фэстам "Дружба", што адвіраваў на пачатку жніўня ў хутарскім антуражы "Шаблі" (Валожынскі раён), у свае правы ўступіў "Metal Crowd Fest-2014" (16 — 17 жніўня). Апошні страсянае Рэчыцу (Гомельшчына) вось ужо дзясяты (!) год і без эксцэсаў. Страсянае чым? Экстрэмальнай музыкай! Падавалася б, і "Дружба", і "Metal..." — вынік прыватнай ініцыятывы. "Дружба" — так. (Няўрымслівы ўладальнік "музычнага" хутара Уладзімір Шаблінскі "саматужна" запаўняе пустуючыя раней нішы культурнага ўплыву на маладзёжны асяродак.)

А вось "Metal..." — плён дзейнасці аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Рагачоўскага райвыканкама. Віват, аддзел! Можна шмат казаць пра тое, як чыноўнікі імкнуцца да паяднання беларускай моладзі з дапамогай той або іншай крэатыўнай ідэі. У Рэчыцы ж не кажуць, а — робяць. Прычым у цеснай звязцы з той часткай гарадской моладзі, для якой рок — далёка не пусты гук. Фестываль — самаакупны. Білеты прадаваліся з сакавіка. Каманды прыехалі з 11 краін. Многія — за кошт ахвяраванняў сваіх суайчыннікаў. Геаграфія фэсту — салідная: Англія, Швецыя, Нарвегія, Італія, Польшча, Украіна... Застаецца дадаць, што напярэдадні "металічнага" свята аддзел зладзіў у горадзе Фестываль экстрэмальных відаў спорту, а работнікі райвыканкама, якія курыравалі абедзве дзеі, сваім дрэс-кодам ніяк не адрозніваліся ад аматараў экстрыму (сапраўды, чорны пінжак не надта пасуе фармату нефармальных маладзёжных праяў). Я — дзвюма рукамі за такую дэмакратычную тактыку культурнага развіцця. Больш за тое: аддзел, па словах яго кіраўніка Святланы Краўчанка, не толькі імкнецца падтрымліваць прыватныя ініцыятывы, але часам нават іх папросту падштурхоўвае. Чарговая кропка прыкладання аддзелаўскіх сіл — вёска, выкупленая ў Рэчыцкім раёне прыватнікам Кірылам Краўцовым. Святлана Генадзьеўна мяркуе ладзіць тут фальклорнае свята. Гаспадар хутара абяцае выступіць у ролі паўнацэннага творчага партнёра. Як вы думаеце, атрымаецца ў работнікаў культуры задуманае?

Ёсць чым пахваліцца ў плане фестывальнай арыгінальнасці і Брэстчыне. На Ілью адвіравалі "Дрыбінскія таржкі". У райцэнтры, як і заўжды, было завозна. Рэгіянальны фестываль народнай творчасці ладзіцца штогод і ўжо ў чацвёрты раз. Непаўторнасць дзеі ў тым, што апрача зёлак ды лячэбных венікаў у мясцовых крамніцах прадаваліся знакамітыя мясцовыя валёнкі: для дарослых — па 600 тысяч рублёў, дзіцячыя — па 400 тысяч. Кошт вар'іраваўся ў залежнасці ад мастацкай аздобы абутку...

"Ляліва" — гэта герб: залаты паўмесяц, над рагамі якога — сярэбраная зорка. Карысталіся ім беларускія, украінскія, літоўскія ды польскія роды. Ужывалася "Ляліва" і ў Крэве. Таму фэст у мясцовым замку называўся "Пад знакам Лялівы". Прайшоў ён 23 жніўня і, неаспрэчна, выклікаў чарговую хвалю цікавасці да пашанотных крэўскіх рэштак. Упершыню "Ляліва" аб'яднала і буйны ганчарскі фэст.

Арыгінальнасць фэставай ідэі — гарантыя "доўгажыхарства" свята. 17 жніўня, да прыкладу, прайшоў VII Фестываль кветак у пасёлку Жалудок. Гэты куток Шчучыншчыны адметны, аказваецца, не толькі тым, што тут праходзілі здымкі беларускага трылера "Масакра". Кветкаводы спаборнічалі ў лепшых праявах ландшафтнага дызайну. І толькі на гэтым фэсце можна было ўбачыць... строі з кветак. Такой прыкладной фларыстыкай зацікавіліся не толькі аматары прыроды, але і шматлікія турысты.

Спіс жніўеньскіх святаў можна было доўжыць. Пэўныя з іх, дарэчы, перанесены на восень. Да прыкладу, мяркуецца, што ў верасні распачнецца і III Фестываль этнакультурных традыцый "Покліч Палесся". Сёлета праект набыў статус міжнароднага. Дзякуючы яму аграгарадок "Ляскавічы" стаў знакамітым не толькі ў родным Петрыкаўскім раёне. Дык якім жа крэатывам вызначыцца "Покліч..." гэтым разам? Натуральна, будуць працягнуты ўсебаковае ўшанаванне і папулярызацыя палескага рэгіёна. Фэст зацвердзіць званне "Ганаровы паляшук", якім будуць уганараваны лепшыя грамадзяне краю. Плануюцца гашэнне адпаведнай "палескай" паштовай маркі і абранне Прыгажуні Палесся. А на Прыпяці распачнуцца гонкі на старадаўніх чаўнах...

Дырэкцыя кожнага са згаданых фестываляў — своеасаблівая лабараторыя, дзе метадам спроб і памылак вышукваецца ісціна сапраўднай творчасці. Калі маюцца з гэтым праблемы, калі ласка, звяртайцеся да "лабарантаў". К

Розгалас

У залежнасці ад структуры і ведамаснай прыналежнасці кожная бібліятэка мае сваю спецыфіку. І зграбаць іх у адну кучу неразумна. У бібліятэк ёсць як агульныя праблемы, так і свае — спецыфічныя. Дзіцячыя ўстановы — не выключэнне. Наша спецыфіка — узроставая, яна ўплывае на ўвесь змест работы. Абслугоўванне ў ДУ "Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска" ажыццяўляецца ў залежнасці ад узроставых асаблівасцей карыстальнікаў. Кожны ўзрост патрабуе індывідуальнага падыходу.

Усё, што маю за душой...
Ну навошта мне гармідар?
Тры меркаванні пра заўтра адной установы
А бібліятэка будучыні вам не патрэбная?
Заробак жа аднолькавы і ў "іншых"...

Працягваем публікацыю водгукаў на артыкул "А бібліятэка будучыні вам не патрэбная?" ("К" № 24).

Спецыфіка дзіцячай установы

Экшн — рэч абавязковая!

Асноўная колькасць нашых чытачоў — дзеці да 15 гадоў — 74% (па стане на 01.01.2014 г.). 3 гады ў год гэты працэнт расце. Наш чытач маладзее, бо вельмі шмат будучых і маладых мам з груднічкамі прыходзіць у дзіцячыя бібліятэкі сталіцы. Чытачы дашкольнага, малодшага школьнага ўзросту і складаюць гэтыя 74% ад агульнай колькасці чытачоў па сістэме. Для іх фарміруецца фонд і ладзяцца культурна-асветніцкія ды інфармацыйныя мерапрыемствы, афармляюцца кніжныя выстаўкі...

Чаго жадаюць чытачы...

Асноўным рэсурсам кожнай бібліятэкі з'яўляецца фонд. Ён у нас шыкоўны. І гэта не толькі маё меркаванне, але і нашых чытачоў.

Культурна-асветніцкая і рэкламна-інфармацыйная работа — найбольш распаўсюджаная форма дзейнасці дзіцячых бібліятэк. І яна дазваляе вырашаць мноства задач — ад далучэння новых чытачоў, прапаганды лепшай і новай літаратуры да піяру саміх бібліятэк ды іх паслуг. Гэта даволі затратны від работы, але ён сябе апраўдвае. Не ўсе калегі са мной пагодзяцца. Планы, кантрольныя паказчыкі, справаздачы і безліч паперак па розных пытаннях — усё гэта адбірае шмат часу ад асноўнай працы: абслугоўвання чытачоў. Не кожная бібліятэка можа сабе гэта дазволіць. Я разумею і тых, хто хоча працаваць бібліятэкарам-бібліёграфам, а не масавіком-забаўнікам. Тады ісці ў дзіцячыя і публічныя бібліятэкі не трэба. А за тое, каб мы былі жывой, энергічнай, крэатыўнай ды сучаснай установай, выступаюць нашы чытачы і наведвальнікі.

Вясёлы гармідар дзецям неабходны! А гартаць часопісы, слоўнікі ды дысертацыі ў цішы і спакоі — гэта не для іх. Дзецям патрэбен "экшн" з гукавым і візуальным шэрагам. Яшчэ лепш паўдзельнічаць самім у якім-небудзь мерапрыемстве бібліятэкі: віктарыне, акцыі, флэшмобе, квэст-арыентаванні, і нават у конкурсе на лепшае чытанне вершаў. Ніхто іх не прымушае, яны самі просяцца паўдзельнічаць і бацькоў сваіх далучаюць. Уся гэтая работа звязана з дашкольнікамі, малодшымі школьнікамі ды іхнімі бацькамі. І яны дзякуюць нам за гэты гармідар!

Калі "мафія" перамагае

З падлеткамі працаваць больш цяжка. Гэта чытач нясталы, негаваркі, без асобных эмоцый. У яго ёсць канкрэтны запыт. У большасці сваёй ён адмаўляецца ад кніг, якія прапаноўвае бібліятэкар. Ён мае свой ці сяброўскі, рэкамендацыйны, спіс да чытання. Але і да падлеткаў спрабуем знайсці падыход. У мінулым годзе ў ЦГДБ імя М.Астроўскага адкрыўся Цэнтр нефармальнай адукацыі "Лесвіца" — і звыклыя ўяўленні аб тым, што ж можна рабіць у бібліятэцы, істотна пашырыліся. Цяпер тут можна і падлеткам гуляць. Напрыклад, у найпапулярную гульню "Мафія" — прычым не звычайную, а літаратурную! Кожную першую і трэцюю пятніцу месяца а 16-й у бібліятэчным "Мафія-клубе" збіраюцца Шэрлак Холмс, Доктар Ватсан, Каварны Забойца ды іншыя "вельмі падазроныя" персанажы, якія жадаюць правесці цікавы вечар у сапраўднай англійскай атмасферы за раскрыццём складаных злачынстваў...

Англійская атмасфера (у прамым сэнсе слова) пануе на сустрэчах клуба "RU-off", куды раз на тыдзень прыходзяць падлеткі, зацікаўленыя ва ўдасканаленні гутарковага англійскага. Заняткі — бясплатныя, патрэбен толькі папярэдні запіс. Паслуга карыстаецца попытам.

Да Карлсана ў госці

У дзіцячых бібліятэках можна бясплатна карыстацца фондамі, электроннымі базамі. Ёсць магчымасць пагартаць альбом ці часопіс на канапе, пагуляць з тактыльнымі кніжкамі, паслухаць гукавыя кнігі-цацкі, сустрэцца з новымі і раскручанымі дзіцячымі пісьменнікамі, паглядзець спектакль, паразмаўляць з мастакамі, фатографамі, дызайнерамі, ратавальнікамі, ветэрынарамі, урачамі, журналістамі і г.д. Можна паскакаць з горкі ці ў спакойнай абстаноўцы адпачыць у доміках "Фрэкен Бок", "Малыша" і "Карлсана". Дзеці могуць рэалізаваць свае творчыя здольнасці — менавіта на гэта скіраваны наш новы праект "Падзяліся талентам з сябрамі". Ідэяй яго стварэння стаў прынцып "Роўны навучае роўнага".

Не верыце? Сумняваецеся? Тады прыходзьце да нас, у Цэнтральную дзіцячую бібліятэку імя М.Астроўскага (у народзе — Бібліятэка Карлсана). І ваш погляд на дзейнасць бібліятэк палепшыцца.

Як бачыце, у век смартфонаў, планшэтаў, айфонаў, рыдараў дзіцячым бібліятэкам ёсць для каго працаваць. Так, мы сталі сацыякультурным цэнтрам сталіцы. А што ў гэтым кепскага? Гэта ж цудоўна, калі частка дзяцей і падлеткаў не будзе бадзяцца бессэнсоўна па вуліцы, а прыйдзе бавіць вольны час у дзіцячую бібліятэку. Ды яшчэ і бясплатна.

Нас — шмат

Гэта невялічкая частка дзейнасці Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі, а іх у сталіцы сямнаццаць. І кожная мае "разыначку" ды свой падыход да чытача.

А што да будучыні бібліятэк, то нам не хапала, не хапае і будзе не хапаць сучаснай тэхнікі, утульнай, незвычайнай мэблі, адмысловага інтэр'ера і афармлення, крэатыўнай сацыяльнай рэкламы, хуткага Інтэрнэту, і вялікіх плошчаў для ажыццяўлення нашых будучых задумак ды мар. Мы вельмі моцна залежым ад знешняга фінансавання. Трэба пераглядзець штатны расклад, статыстычныя паказчыкі дзейнасці, магчымасць прафесійна развівацца. А кожнаму чыноўніку ці дэпутату трэба даць курыраваць адну з дзіцячых бібліятэк, і здарыцца цуд: яны заўважаць, што сюды ходзяць, і не па 2-3 чытача ў дзень. А самага галоўнага мы ўжо дабіліся: у нас не толькі чытаюць кнігі, але і бавяць вольны час. Нам давяраюць, і мы патрэбны сваім чытачам ды карыстальнікам. Толькі мы вельмі мала ды сціпла асвятляем сваю дзейнасць на старонках рэспубліканскіх СМІ і ў Сеціве. Але рана яшчэ ставіць "крыж на Гутэнбергавай эпосе": мы яшчэ пачытаем ды патанчым разам з нашымі чытачамі! Запыт на гэта маем. А калі ёсць чытачы ў дзіцячых бібліятэках — будуць яны і ў астатніх.

Анжаліка КАРЗАНАВА,
намеснік дырэктара ЦСДБ г. Мінска

фотафакт



Першая настаўніца

Скульптар Аляксандр Шомаў завяршае працу над скульптурнай кампазіцыяй, якую ён назваў "Мая першая настаўніца". Вобраз, натуральна, — зборны. У кожнага — сваё ўяўленне пра першага ў жыцці педагога. Але дадзеная выява маладой жанчыны на фоне школьнай дошкі з толькі што напісанай літарай "А" неўзабаве будзе ўсталявана на невялічкім пастаменце ля галоўнага ўвахода ў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка. Тым самым твор сцвярджае, што актыўны прыток маладых ды няўрымслівых сіл у галоўную настаўніцкую ўстанову Беларусі — гарантыя неперарыўнасці нацыянальных педагагічных традыцый. У любым выпадку, кампазіцыя папоўніць спіс гарадскіх скульптур Мінска, якія сталі ўжо арганічнай часткай сталічнага пейзажу і на фоне якіх так любяць фатаграфавацца ўсюдыісныя турысты. / **Фота Юрыя ІВАНОВА**

Выстаўка **"Няўстойлівы"** італьянскага жывапісца Джузэпэ Аціні прадстаўлена ў Цэнтры сучасных мастацтваў.

Музейнае сховішча

Калі "копія" гуляе з арыгіналам

Нечаканы альянс

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 3.)

"Чалавек і Бог"

— Мы расставілі акцэнты такім чынам, — праводзіць мяне ў залы, дзе разгарнулася экспазіцыя, загадчык мастацкага аддзела Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, кандыдат мастацтвазнаўства, куратар выстаўкі Таццяна Літвінава. — Мы вырашылі дапамагчы таму, хто прыйдзе на выстаўку, адчуць мінулыя стагоддзі, паспрабаваць зразумець, што фарміравала мастацтва пэўных эпох…

Першая зала праекта знаёміць наведвальніка з мастацтвам эпохі Адражэння: тут экспануюцца рэпрадукцыі карцін Леанарда да Вінчы, Рафаэля, Батычэлі… І побач жа — у адмысловых вітрынах — прадстаўлены прадметы з фондаў Паскевічаў.

— Давайце падумаем: што гэта быў за час? — прапануе паразважаць спецыяліст. — Час адкрыццяў, час звароту да чалавека… Капернік абараняе сваю тэорыю, паклаўшы пачатак першай навуковай рэвалюцыі. Галілеа Галілей ладзіць астранамічныя вопыты, і мы ілюструем гэтыя змены ў светапоглядзе чалавека, уводзячы ў экспазіцыйную зону тэлескоп, што з'яўляецца важным здабыткам нашай калекцыі. Прадстаўлены тут і гадзіннік, які мае форму храма эпохі Рэнесанса, — працягвае яна. — Нягледзячы на тое, што гэты экспанат быў зроблены ў іншы час — 1830-я гады, — ён выдатна візуалізуе светапогляд асобы Адраджэння, калі архітэктура становіцца суразмернай чалавеку, а сам чалавек апынаецца ў цэнтры светабудовы…

Тэматычнае аб'яднанне жывапісных твораў і прадметаў з фонду Палаца ў першай зале носіць назву "Чалавек і Бог". Для наведвальнікаў падрыхтаваны адпаведны тэкст, які акрэслівае час, вылучаючы яго галоўныя рысы. І ён служыць важным тэарэтычным падмуркам да разумення канцэпцыі экспазіцыі.

— Адраджэнне — гэта эпоха, калі адбываўся пераход ад багаслоўскага мастацтва да свецкага, — Таццяна Літвінава далей асэнсоўвае зрэз сацыяльнага кантэксту і жывапісных "прарываў". — Вось "Мадонна пад вэлюмам" Філіпа Ліпі: мастак стварыў, лічы, сямейны партрэт, адлюстраваўшы сваю жонку. Бог у людзях або людзі ў Богу? — вось тыя пытанні, якія ставіць жывапіс тых часоў…

Цікавая дэталь: рэпрадукцыі на сценах дапаўняюцца пустымі рамамі розных форм.

— Мы вырашылі зрабіць пэўны намёк на тое, што значная колькасць жывапісных скарбаў знаходзіцца па-за межамі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, — тлумачыць гэты ход мастацтвазнаўца, — у шматлікіх музеях свету… І дадае, што жывапісная калекцыя палаца Румянцавых і Паскевічаў была страчана пад час Другой сусветнай вайны.

"Чалавек і яго атачэнне"

Даволі шмат аўтараў аб'ядноўвае наступны раздзел, якому стваральнікі выстаўкі далі назву "Чалавек і яго атачэнне".

— Пэўная эпоха не заканчваецца рэзка — усё адбываецца паступова, пэўнымі напластаваннямі, — распавядае пра канцэпцыю экспазіцыі наступнай залы Таццяна Літвінава, — таму тут мы прадставілі розныя стылі — ад барока да класіцызму, і нават мадэрнізм…

Пачынаючы з Паўночнага Рэнесанса, які ў экспазіцыі "прэзентуецца" Гансам Гальбейнам, Лкасам Кранахам і Брэйгелем Старэйшым, мастацтва ўсё больш звяртаецца да выяўлення канкрэтнага, а не ідэальнага абстрактнага чалавека. Гэтую тэзу і прапануюць стваральнікі выстаўкі гледачу для "прачытання" жывапісных работ XVII — XIX стагоддзяў.

— Мастакі пішуць вядомых персанажаў свайго часу, а не святых, яны звяртаюцца да свету рэчаў, дэманструючы асяроддзе, у якім жыве чалавек, — дае характарыстыку новай эпосе Таццяна Літвінава. — Таму ў гэтай экспазіцыі мы імкнуліся паказаць розныя тыпажы. Тым больш, што ў тыя часы назіраецца выразны падзел людзей на сацыяльныя саслоўі…

Жывапіс мастакоў дапаўняецца рознымі калекцыямі прадметаў. У прыватнасці, посуд, які размешчаны ў адмысловай вітрыне залы, мае пэўнае падабенства з тымі рэчамі, што выяўлены на карцінах.

— У XVIII стагоддзі была вынайдзена еўрапейская парцаляна, — распавядае мастацтвазнаўца. — І нам падалося цалкам слушным паказаць выдатныя ўзоры парцаляны з фондаў Паскевічаў…

Стыль ракако, які грунтаваўся на прыдворных густах, "знаходзіць паралелі" ў аздобленых упрыгожаннямі гадзінніку, кандэлябрах, вытанчаных сталовых прыборах з фондаў славутых князёў. XIX стагоддзе і стыль ампір візуалізаваны наступным блокам: рэпрадукцыя карціны Жака Луі Давіда "Напалеон у рабочым кабінеце" знаходзіцца ў цэнтры групы прадметаў, якія належалі слыннаму роду (кнігі, пісьмовыя прылады, стылізаваны гадзіннік, зброя)…

— У фондах нашага музея захоўваецца і вось гэтая талерка, на якой адлюстраваны момант сустрэчы Напалеона з Аляксандрам I, — указвае на рарытэт спецыяліст, дадаючы, што ў выніку ўдалося стварыць вельмі атмасферную, так бы мовіць, імператарскую, міні-экспазіцыю.

І ўжо ў гэтай зале пачынаецца паступовы пераход да мадэрнізму. Вітрына, што ўяўляе з сябе "жаночы комплекс": у ёй — жаночыя ўпрыгожанні, статуэткі, флакон парфумы, рыдыкюль, люстэрка, часопісы мод, якія выпісывала Ірына Іванаўна Паскевіч… Усе гэтыя прадметы ўдала "рыфмуюцца" і з "Дзвюма прасавальшчыцамі" Эдгара Дэга, і з выявай жанчыны на карціне Эдуарда Манэ "Аржантэй".

— Такім чынам мы знаёмімся ўжо з аўтарамі, якія з'яўляюцца пачынальнікамі імпрэсіянізму, — кажа спецыяліст і праводзіць у іншую залу.

"Чалавек і яго адчуванні"

Насамрэч, не ўсе залы, задзейнічаныя ў выстаўцы, маюць падобную архітэктоніку і начынне. Напрыклад, у адной з іх ужо ёсць пастаянная экспазіцыя: інтэр'ер жылога памяшкання XIX — XX стагоддзяў. Стваральнікі "Скарбаў сусветнага жывапісу" вырашылі не змяняць абстаноўку, а скарыстацца "дадзенымі ўмовамі", "упісаўшыся" ў адмыслова афармлены пакой.

— У гэтай зале мы зрабілі такі ход: на сцены павесілі работы тых мастакоў, якія жылі прыблізна ў падобнай абстаноўцы (Агюста Рэнуара, Поля Сезана, Клода Манэ…), — распавядае Таццяна Літвінава. — Але адмыслова выбіралі тыя творы, што "перагукаюцца" з дэкорам мэблі ў стылі мадэрн…

Мастацтва XX стагоддзя зыходзіла з адчуванняў людзей, — падводзіць да новай тэмы, кантэксту мастацтвазнаўца і прапануе паспрачацца з гэтай тэзай, паглядзеўшы — ужо ў апошняй зале выстаўкі — на рэпрадукцыі карцін Пікаса, Мадзільяні, Матыса, Гагена, Брака…

Замест заключэння

Насамрэч, нават гэтым выставачны праект не вычэрпваецца. Ён прапануе гледачу яшчэ і фільмы пра славутых мастакоў ды нават музычны складнік. Раз на тыдзень на пандусе ля Палаца можна пачуць творы старасвецкіх кампазітараў у выкананні сімфанічнага аркестра ў падтрымку "Скарбаў сусветнага жывапісу". Выстаўка атрымалася комплекснай, і нягледзячы на тое, што пэўных творчых хібаў ёй, будзем шчырымі, не ўдалося пазбегнуць, смелыя захады яе стваральнікаў не заўважыць не атрымліваецца.

Урэшце, з чаго ствараецца выстаўка? З працы куратара і ўсведамлення ўласных слабасцей ды моцных бакоў, што і дэманструе на прыкладзе "Скарбаў…" Гомельскі палацава-паркавы ансамбль. "Нам хочацца, каб нашы фонды "гучалі", — дзеліцца Таццяна Фёдараўна. Экспазіцыя спалучае моцны жывапіс (хоць і ў рэпрадукцыях) з творамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Што і казаць, для асветніцкага праекта лепш і не прыдумаць. Невыпадкова выстаўку было вырашана прадоўжыць. "Копіі — копіямі", але не трэба грэбаваць магчымасцю пазнаёміцца з гісторыяй мастацтва ў музейнай прасторы і праз якасныя рэпрадукцыі.

Дарэчы, яшчэ адзін момант. Галоўны мастацкі музей Амстэрдама Рэйксмузеум падобны ход — прадстаўленне эпохі і часу праз творы мастацтва і аб'екты матэрыяльнай культуры — побач, у адной зале, — пасля рэканструкцыі, якая завяршылася зусім нядаўна, таксама ўзяў да ўвагі. Падобны "альянс" мастацтва і гісторыі падаўся галандцам надзвычай сучасным.

Магчыма, паралель з Гомелем вельмі ўмоўная, ды ўсё ж…

К

Экспазіцыйныя "паралелі".

■ Кажа эксперт

Вольга АРХІПАВА, загадчык аддзела сучаснага выяўленчага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі:

— Падобнае спалучэнне копій і рэчаў, твораў і асоб — на сённяшні дзень вельмі распаўсюджаны прыём экспанавання. Гэта заўсёды пашырае "гучанне часу". Чалавек больш ярка мае адчуваць сучаснае і будучае, калі ён разумее і ведае мінулае, а глыбіня падтрымліваецца шматвобразнасцю. Адзіны твор можа не так шмат распавесці, як яго выступленне ў ансамблі з іншымі артэфактамі часу. Безумоўна, у дзяржаўных калекцыях пакуль не захоўваюцца арыгінальныя творы сусветна вядомых мастакоў, таму калекцыя факсімільных рэпрадукцый ды злепкаў сапраўды далучае нас да скарбніцы сусветнай культуры…

Культура пачалася з…

…бабуліных казак

ТЭКСТ

Віктар ШНІП, літаратар, галоўны рэдактар выдавецтва "Мастацкая літаратура"

— Так, менавіта з бабуліных казак і песень пачалася для мяне беларуская культура. Справа ў тым, што калі мне споўнілася восем месяцаў (а нарадзіўся я ў вёсцы Пугачы, што на Валожыншчыне), бацькі аддалі мяне гадавацца да бабулі Ганны, мамінай маці. Яна жыла ў невялікім сяле Лягезы, за пяць кіламетраў ад нашага паселішча.

У той вёсцы было ўсяго дзесяць хат і двое дзяцей. Электрычнасці не было ажно да 1967 года. Кніжак таксама не было. Але ж у мяне была бабуля Ганна. Кожны вечар яна расказвала мне казкі. Асабліва запомнілася тая, вядомая ўсім дзецям, пра спрытнюгу-ваўка, які ў палонцы лавіў рыбу хвастом. Каля Лягезаў працякала рачулка Яршоўка, і я, пасля бабулінай казкі, кожную зіму шмат разоў хадзіў да вады, каб убачыць таго ваўка, які ловіць рыбу такім незвычайным спосабам. На жаль, так і не ўбачыў…

Памятаю, доўгімі зімовымі вечарамі каля святла лямпы ў бабулінай хаце збіраліся суседзі. Жанчыны пралі воўну, хлопцы расказвалі пра вайну, пра тое, як жылі пры паляках… А яшчэ вечарамі ў хаце спявалі народныя песні. Я слухаў ды падпяваў, і быў самым шчаслівым на свеце…

З дзядзькам Ванем, які працаваў конюхам, я даглядаў коней і нават некалькі разоў хадзіў з ім у начное. Дзядзька мяне любіў, і я яго называў татам, а цётку Алю — мамай. І калі прыйшоў час майго вяртання ў Пугачы (трэба было ісці ў школу), мяне не хацелі аддаваць маім бацькам. Дый я сам не хацеў адсюль з'язджаць. І цяпер, калі еду з Мінска ў Пугачы каля Лягезаў, у мяне ад успамінаў на вачах слёзы, бо тут прайшлі самыя светлыя гады майго жыцця. Тут, у Лягезах, відаць, ува мне і абудзіўся паэт…

■ Хэдлайн рэгіёна

Пры ўсіх "хваробах"

Каментарыі тут могуць быць самыя розныя. Вядома, статус музея ці галерэі вызначаецца багатай калекцыяй арыгіналаў, але часам менавіта новае пераасэнсаванне фондаў падобных устаноў можа даць той самы нечаканы эфект, які прымусіць гледача зноў прыйсці туды. І поспех такіх выставачных праектаў, як "Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі" ці "Сто гадоў беларускага авангарда", пацвярджаюць гэтую думку.

Таксама ні для каго не сакрэт, што сучасная музейная культура мусіць прапаноўваць самыя розныя формы дыялога з гледачом. Магчыма, будучы II Нацыянальны музейны форум, што пройдзе акурат у Гомельскім палацава-паркавым ансамблі 26 — 27 верасня, — добрая нагода прааналізаваць стан айчыннай музейнай сферы і заўважыць тыя прыклады, у аснове якіх — арыгінальнае куратарскае выказванне.

Прынамсі, пры ўсіх вядомых "хваробах" нашай музейнай справы, менавіта падобныя праекты, што ўтрымліваюць у сабе смелую думку і якасную даследчую працу, набліжаюць нас да міжнароднага кантэксту.

К

Факсімільнае выданне Тураўскага Евангелля (XI ст.) было прадстаўлена днямі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

У Тунісе шмат самых розных музеяў у мястэчках ды гарадах. Хапае там і ўнікальных артэфактаў. Балазе падзеі XX стагоддзя ў Еўропе амаль абмінулі гэтую краіну. Мне надзвычай спадабалася Віла Себасціяна ў Хамамеце: палац пабудаваны паводле праекта славутага амерыканскага архітэктара Ф.Л. Райта для румынскага мільянера, дзе гасцявала французская, румынская і брытанская багема. Цяпер тут — мастацкая галерэя, але засталіся паўсядзённыя побытавыя рэчы колішніх гасцей, якія можна нават памацаць. Вельмі атмасферна і... кранальна. У тамтэйшых "медынах" — сярэднявечных цэнтрах гарадоў за крапаснымі мурамі — існуюць свае музеі пры старажытных мячэцях. Ёсць і там на што падзівіцца. Але, перадусім, у прадмесці Туніса маецца выбітны збор артэфактаў сусветнай значнасці — Нацыянальны музей Бардо.

Фрагменты экспазіцыі. / Фота Веры ДЗЯДОК

ТУНІС

Музей камерцыяй не займаецца, але… Вынік кааперацыі

Што?

Тут сабрана калекцыя рымскіх і візантыйскіх мазаік, антычных, маўрытанскіх ды асманскіх артэфактаў і твораў мастацтва. Музей у Бардо — найбуйнейшы пасля Каірскага археалагічнага музея ў Афрыцы. Знаходзіцца ўстанова ў колішнім палацы, пабудаваным яшчэ ў XIII стагоддзі для арабскіх султанаў Хафсідаў. Пасля тут была рэзідэнцыя асманскіх беяў. Шыкоўны комплекс адкрылі для публічнага наведання ў 1888-м, праз сем гадоў пасля ўсталявання ў Тунісе французскага пратэктарату.

Асновай музея стала калекцыя мазаік, што была запачаткавана асманскім міністрам Туніса Хазандарам. Пазнейшыя археалагічныя знаходкі за стагоддзе ўзбагацілі калекцыю. Музей жа ствараўся ў выніку ўзаемавыгаднай кааперацыі чынавенства і прадпрымальнікаў, археолагаў і мастацтвазнаўцаў, турыстычных аператараў ды ўладальнікаў гатэляў, рэстаранаў, таксі, друкарняў і, урэшце, мастакоў ды саматужнікаў, якія прадукуюць рэчы "паводле матываў" гэтага музея. Іх можна знайсці ў Тунісе паўсюдна. Але толькі не ў самім Нацыянальным музеі Бардо!

Тут можна падрабязна вывучыць гісторыю сталіцы і старажытнага Карфагена, паглядзець экспанаты Пунічнай эпохі, старажытных Рыма і Грэцыі, прадметы мусульманскай ды хрысціянскай культур. Усё, што было знойдзена пад зямлёй, на зямлі і пад вадой, класіфікавана, апісана, вывучана і годна выстаўлена для агляду. Для наведвальнікаў прадстаўлены не толькі невялікія экспанаты ды розныя прадметы побыту, але і антычныя статуі карфагенскіх і рымскіх багоў ды герояў.

Тут знаходзіцца самая вялікая ў свеце ацалелая арыгінальная мазаіка плошчай 56 квадратных метраў (з выявай подзвігаў герояў і жыцця багоў, побыту простых смяротных ды іншых сюжэтаў): яна была знойдзена ў ваколіцах туніскага горада Суса. Сёння яна займае велізарную залу з зялёна-залатой столлю. Тут можна ўбачыць і багата мазаік, вядомых нам яшчэ з дзіцячых часопісаў ды школьных падручнікаў. Сярод іншага — класічны прыжыццёвы партрэт Вяргілія з музай гісторыі Кліа і музай трагедыі Мельпаменай, знойдзены ў 1896 годзе. На скрутку ў руцэ Вяргілія — надпіс: "*Муза выклікае мяне*". Гэта радок з "Энеіды".

Як?

У іншых залах Музея Бардо можна азнаёміцца з жыццём колішняга султанскага гарэму. У цэнтры адной з такіх залаў ёсць велізарны ложак, пад балдахінам, а столь надзвычай багата дэкаравана філіграннай разьбой. Гэтую, як і многія іншыя залы, аздобілі цяпер антычнымі мазаікамі. Некаторыя нельга здымаць з фотаўспышкамі, а іншыя можна памацаць рукамі, па некаторых — нават хадзіць! Гэта стварае ўнікальную атмасферу спрычыненасці, нечуванай даступнасці да аўтэнтыкі.

Дзесяць гадоў таму, да 125-годдзя гэтага ўнікальнага музея, былі зроблены велізарныя грашовыя ўкладанні, каб пашырыць і абнавіць экспазіцыю. Пад праект абнаўлення ўсіх туніскіх музеяў, уключаючы Бардо, дзяржава атрымала крэдыт ад Сусветнага банка, што пайшоў на рэалізацыю маштабнай комплекснай стратэгіі развіцця культурнага турызму ў краіне. Музей быў абноўлены, каб стаць вітрынай спадчыны Туніса і распачаць новыя даследаванні, ажыццяўляць арыгінальныя сучасныя праекты. Новы грандыёзны будынак узведзены паводле праекта туніскага архітэктара Аміра Нуіра, пры дапамозе французскіх інжынераў і дызайнераў.

Дызайн заслугоўвае асобнай гаворкі, бо экспанаваць вельмі вялікія рэчы, што былі колісь часткай зусім іншых архітэктурных збудаванняў, розных маштабаў, часам насамрэч складана. Прытым улічваецца тамтэйшая спецыфіка: трэба забяспечыць моцную вентыляцыю і кандыцыянаванне, абарону ад сонечных промняў. Паўсюль у музеі, як і ў гарадской прасторы Туніса, прадугледжана непарыўнае безбар'ернае асяроддзе — для людзей з абмежаванымі магчымасцямі або з дзецьмі. Нам ёсць тут чаму павучыцца.

Хто?

Навуковая канцэпцыя цяперашняга абноўленага музея распрацавана з улікам не толькі акадэмічных ды археалагічных даследаванняў, але і актыўнага выкарыстання экспазіцыі, прадстаўленай праз храналагічныя ды тэматычныя экскурсійныя праграмы, адаптаваныя да густаў шырокай публікі.

Публіка тут, насамрэч, — вельмі розная, разнамоўная ды рознаўзроставая. Гэта вымагае ад супрацоўнікаў немалых ведаў і прафесійных практык. Але супрацоўнікі-паліглоты падыходзяць да вас, распытваюць пра тое, адкуль вы прыехалі, што цікавіць у музеі, чым дапамагчы, ці не сфатаграфаваць вас на фоне трона Напалеона або султанскага басейна. За гэта тут прынята даваць ім колькі грошай: 1,5 — 2 дынары (блізу аднаго долара). Але прыязнасць і гасціннасць вам будуць гарантаваны ў любым выпадку!

Колькі?

У Туніскім музеі не займаюцца камерцыйнай дзейнасцю. У Нацыянальным музеі Бардо няма ні кавярняў, ні сувенірнага гандлю (што з гакам кампенсуюць вулічныя гандляры пры ўваходзе), за выключэннем прадукцыі самога музея: навуковай літаратуры, артыкулаў-буклетаў, паштовак з выявамі музейных скарбаў. Даход складаецца з несупыннай плыні экскурсій, што забяспечваюць тысячы розных турфірм і гатэляў, якія ўключаюць наведанне гэтай установы ў свае абавязковыя ды самыя цікавыя праграмы. Флаеры, буклеты і рэкламную прадукцыю на тэму музея можна сустрэць паўсюдна — ад аэрапортаў да таксі. Але, паўтаруся, гэта ў кампетэнцыі не музейшчыкаў, а безлічы прыватных ініцыятараў — ад тураператараў да майстроў-саматужнікаў, якія вырабляюць тэматычныя сувеніры. У выніку такой кааперацыі ў нацыянальным маштабе нараджаецца ўнікальны феномен. Нараджаецца цікавасць да спадчыны Туніса ў свеце.

Сяргей ХАРЭЎСКІ,
мастацтвазнаўца

ЛЮБЛІН

Там — файна!

Па выніках кірмашу "Вясновы букет" "К" апублікавала артыкул "А ў Лошыцы пакуль не як у Любліне…". Паўстае пытанне: дык а як жа ў Любліне? Адказваю: у Любліне на Ягелонскім кірмашы — файна! Сёлета ён праходзіў з 15 да 17 жніўня. З'ехалася каля 250 майстроў, з іх звыш 40 — з Беларусі. Большасць, натуральна, палякі. Прадстаўлены таксама Літва, Славакія і Украіна. З Венгрыі прыехалі музыкі. Акрамя кірмашу рамесных вырабаў, ладзіліся выстаўкі, майстар-класы, экскурсіі, канцэрты, паказы фільмаў і спектакляў.

Ягелонскі кірмаш.

Сёлетняй тэматыкай Ягелонскага кірмашу сталі выцінанка і вяселле. У горадзе працавалі ажно тры выстаўкі выцінанак: агульнапольская, люблінская і сучасная выцінанка на тэматыку жыццёвага кола чалавека ў традыцыі. Асобная выстаўка была прысвечана вясельным звычаям на тэрыторыі Люблінскага ваяводства. Праходзілі майстар-класы па выцінанцы-выбіванцы і па вясельных спевах. Навучэнцы майстар-класаў па спевах пасля трох заняткаў выступілі з канцэртам, і вынік, трэба сказаць, быў добры, а цікавасць грамадства — вялікай.

Беларускія майстры годна прэзентавалі краіну. Можна было пабачыць і набыць беларускую вышыўку, тканыя вырабы, драўляную скульптуру, саломку, абярэгі з сена, упрыгожанні з бісеру, выцінанку, кераміку і яшчэ шмат чаго цікавага.

Атмасфера на імпрэзе — святочная, наведвальнікаў вельмі шмат, але, на мой суб'ектыўны погляд, усё ж менш, чым на віленскім "Казюкасе". Калі ж параўноўваць з нашым "Вясновым букетам", то ў вочы адразу ж кідаецца рознае стаўленне гарадскіх улад. Ягелонскі кірмаш праходзіць у Старым горадзе — у самым сэрцы Любліна, пра яго паведамляюць шматлікія буклеты для турыстаў цягам цэлага года. У адным з буклетаў ілюстрацыяй да кірмашу абраны фотаздымак беларускай бабулі Сцепаніды Аляксееўны Сцепанюк з вёскі Дарапеевічы Маларыцкага раёна. Яна ўжо не першы год удзельнічае ў кірмашы: прадзе сабе кудзельку ў самай віхуры людской плыні…

Акрамя звестак аб кірмашы, люблінскія буклеты паведамляюць пра фальклорныя фестывалі "Песні Старой Еўропы", "Фальклорныя Мікалайкі", "Коды", "Фалькларыстычныя спатканні імя Ігнація Вахавяка". І гэта падзеі агульнагарадскога маштабу, дзе фальклор каштоўны сам па сабе, а не як фонавая музыка пад час імпрэзы на зусім іншую тэматыку.

У Беларусі ж імпрэзы, звязаныя з традыцыйнай культурай, выціснуты на перыферыю культурнага жыцця. Хто ведае пра "Вясновы букет", акрамя саміх майстроў? Дзе атрымаць інфармацыю пра рэгіянальныя рамесныя і фальклорныя фестывалі? Хто адкажа на гэтыя пытанні?..

Алена ЛЯШКЕВІЧ,
метадыст аддзела навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Інстытута культуры Беларусі
Фота аўтара

■ У працяг тэмы

Наша кудзеля ў Польшчы

Талент заўсёды запатрабаваны. І не толькі ў тым месцы, дзе чалавек стварае рукачынныя шэдэўры. Гэта засведчыў чарговы ўдзел маларытчан у Ягелонскім кірмашы. У ім па запрашэнні Цэнтра культуры ў Любліне ў другі раз прынялі ўдзел дырэктар раённага Цэнтра народнай творчасці Валянціна Струнец і народны майстар Рэспублікі Беларусь, жыхарка вёскі Дарапеевічы Сцепаніда Сцепанюк. Мерапрыемства праходзіла ў Старым Горадзе, мікрараёне Любліна.

— Адна з мэт кірмашу, — распавядае Валянціна Мікалаеўна, — прэзентацыя рамесных і рукадзельных вырабаў майстроў народнай творчасці з Польшчы, Украіны, Беларусі, Чэхіі, Славакіі, Венгрыі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, а таксама — абмен багатай праграмай культурных мерапрыемстваў. Мы са Сцепанідай Аляксееўнай, зразумела, прадстаўлялі тое, што складае асаблівы гонар маларыцкай зямлі: вышытыя ручнікі і тканыя вырабы. Усе наведвальнікі былі ў захапленні ад прыгажосці ды маляўнічасці ўзораў…

Маларытчане на кірмашы здолелі здзівіць не толькі гэтым: цікавасць у замежнікаў выклікалі вытканыя мужчынскія гальштукі, ручнікі з мясцовым арнаментам…

Валянціна Струнец і Сцепаніда Сцепанюк, як звычайна, давалі ў Польшчы майстар-класы. На іх збіралася шмат людзей, якія з захапленнем назіралі за тым, як твораць цуд рукі майстрых-чараўніц… Сцепаніда Аляксееўна паказвала і вучыла ўсіх ахвотных "рабіць" ільняныя ніткі з кудзелі…

Мікалай НАВУМЧЫК,
Маларыта

Палац князёў Агінскіх XIX ст. у Залессі (Смаргонскі раён) урачыста адкрыецца пасля рэстаўрацыі напрыканцы верасня.

Слёзы пунсовых макаў

Пра ўплыў падзей сярэдзіны XX стагоддзя на творчасць Мікалая Залознага мы пісалі ў № 34 за 2014 год, у першай частцы артыкула.

(Заканчэнне. Пачатак у № 34.)

…А шлях да поспеху пачаўся тады, калі малады дэмабілізаваны салдат Мікалай Залозны прынёс у прыёмную камісію Мінскага мастацкага вучылішча два чамаданы сваіх малюнкаў — плён пасляваенных часоў — і быў залічаны адразу на другі курс. Калі ў 1954-м з адзнакай скончыў вучылішча, быў накіраваны ў той самы інстытут, пра які ішла гаворка вышэй. Тут ён вельмі старанна вывучаў асновы майстэрства, спрабуючы "знайсці сябе", і ўсё жыццё у гэтых адносінах успамінаў добрым словам свайго галоўнага і любімага настаўніка Віталя Канстанцінавіча Цвірку, які навучыў яго "мысліць колерам і разважаць на палатне наконт бачанага, а не проста слепа капіраваць гэтае бачанае". Ну, яшчэ вельмі добра адзываўся і пра іншага педагога ды цудоўнага рысавальшчыка — Аляксандра Пятровіча Мазалёва.

Барыс КРЭПАК

Успамінаючы **Мікалая Залознага**

Слёзы пунсовых макаў

Мастакамі нараджаюцца. Мастакамі становяцца. Праца — абавязковая ўмова. Мікалай Рыгоравіч не разумеў калег, якія толькі час ад часу бяруцца за пэндзаль. Радасць мастака, лічыў ён, — у сапраўднай працы. Наколькі памятаю, у яго дзень быў заўсёды падзелены на дзве часткі: вучылішча і майстэрня, майстэрня і вучылішча, хаця прыярытэт быў усё ж такі на баку майстэрні. Апошнія дзесяць гадоў жыцця ён выкладаў жывапіс у Тэатральна-мастацкім інстытуце, і тады "рэжым" ягонага жыцця ніяк не змяняўся.

І пры гэтым ніколі не пакідала яго пачуццё адказнасці перад тымі, для каго ён сам тварыў. Няхай гэта былі жанравыя, бытавыя карціны, партрэты будаўнікоў Лукомльскай ДРЭС, кветкавыя і "рабінавыя" нацюрморты або лірычныя пейзажы Міншчыны і возера Сялявы — усюды было відаць сумленнае, уважлівае стаўленне да таго, што пісаў мастак. Такое працалюбства і пачуццё адказнасці прывіваў ён выхаванцам мастацкага вучылішча, дзе шмат гадоў вёў малюнак, жывапіс ды кампазіцыю, і студэнтам інстытута, дзе выкладаў жывапіс на кафедры мастацкага тэкстылю. І вельмі быў незадаволены тымі сваімі вучнямі, якія замест палітры ды стаяння ля мальберта аддавалі перавагу вясёламу гультайству. Праўда, такіх у яго было зусім няшмат. Большасць ягоных вучняў потым станавіліся вядомымі мастакамі краіны. Сярод выхаванцаў Залознага — Г.Скрыпнічэнка, І.Кліменка, У.Зінкевіч, В.Захарынскі, Ю.Багушэвіч, У.Ткачоў, Л.Пуцейка і многія іншыя.

Помню яго майстэрню з рабочым кабінетам, дзе ўсё было падначалена справе. Ля сцен — расстаўлены вялікія і малыя палотны, у кутку — радыёпрыёмнік, на паліцах — папкі з накідамі ды фатаграфіямі работ, малюнкі алоўкам і вугалем, на мальберце — амаль завершаная карціна "Коні". Потым яна будзе экспанавацца ў Англіі…

Аўтару яна асабліва дарагая. Задума яе нарадзілася непадалёк ад Мінска — у вёсцы Вадапой, дзе Мікалай бавіў вольны час, адпачываючы і працуючы. Лежачы на сене, цікава было назіраць, як з-за паветкі павольна выплываў месяц… Але мастак яшчэ не ўяўляў карціны, не бачыў яе "ўнутраным позіркам". І вось аднойчы ўвечары, вяртаючыся з ракі, ён заўважыў на лузе спутаных коней, якія мірна паскубвалі траву. Два бачанні супалі з успамінамі дзяцінства — і з'явілася карціна: у барвова-чырвоным марыве — фантастычныя сілуэты коней. Няхітры сюжэт. Але чаму ж усё ўспамінаецца гэтае палатно? Мастак здолеў ускалыхнуць пачуцці. Коні на начлегу. Барвовы дыск месяца, бульба, спечаная ў прыску, ціхія размовы ля вогнішча… Нахлыне на цябе трывожная пяшчота дзяцінства, ахопіць усю істоту, захочацца ўдыхнуць не параўнальны ні з чым водар траў, — і як рэха адгукнуцца далёкія гады…

Але для мяне найбольш цікавая і пранізліва шчымлівая карціна "Макі", якую сёння можна ўбачыць у пастаяннай экспазіцыі Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі: сярод пунсовых кветак стаіць на каленях дзяўчына і плача… Палатно напісана вельмі пастозна, быццам на адным дыханні. Як казаў сам аўтар, ён пісаў яго для сябе, не думаючы пра тое, куды потым яно трапіць: ці ў музей, ці ў прыватную калекцыю, ці застанецца ў майстэрні. А атрымалася, што адлюстраваныя на палатне роздумы і пачуцці жывапісца моцна ўсхвалявалі многіх гледачоў. Макі для Залознага — не проста кветкі: гэта сімвал і малой радзімы — Украіны, і другой радзімы — Беларусі, сімвал радасці ды смутку. Калі Мікалай маляваў гэтую карціну, чамусьці вельмі спяшаўся, і таму потым (ужо пасля смерці аўтара) узнікалі нейкія тэхналагічныя праблемы, з-за чаго на палатне перыядычна адбываліся фарбавыя адслаенні. Праўда, дзякуючы таленту дасведчанага рэстаўратара Нацыянальнага мастацкага музея Святланы Дзікуць сёння карціна выглядае цудоўна.

Запомніліся пэўныя развагі Залознага (я тады іх запісаў): "Змест заўсёды ўліты ў форму, і форма становіцца яго часткай. Таму нельга зводзіць змест твора толькі да сюжэта — паняцце зместу значна шырэйшае. Змястоўным павінен быць сам жывапіс: і лінія, і сілуэт, і тон, і форма. Усё гэта цяжка выказаць словамі, растлумачыць усе таямніцы мастацтва я не магу. Чаму ў адных мастакоў атрымліваецца так, а ў іншых — інакш? Чаму ў адных усё натхнёна, пачуцці — вялікія, думкі — глыбокія, а ў іншых — шэрасць і нудота? Спытай у мяне самога, як я пішу, што ў мяне за жывапісная манера, чаму яна менавіта такая, — не адкажу. Не ведаю. Дый наўрад ці які мастак можа пераканаўча адказаць на гэтае пытанне. Талент, як кажуць, ад Бога. Успомні Мікеланджэла: у яго толькі жэст, рука, адзін палец — ужо форма вялікая, лінія цудоўная! А паглядзі, які моцны жывапіс у Цінтарэта! Я зачароўваюся Малявіным, яго чырвоным колерам… Вось, калі пісаў "Макі", канешне ж, успамінаў многіх мастакоў, якія малявалі гэтыя кветкі: ад Клода Манэ і Рэнуара да Сар'яна і Фешына, ад Джона Годварда і Браяна Блуда да Даніэля Кнігта і Альфонса Мухі… Але я ўбачыў свае макі, праз якія імкнуўся перадаць цэласны вобраз Смутку, майго асабістага Смутку. Нават не думаў, што ўдалося выявіць, так бы мовіць, нешта агульначалавечае…"

А я ўспомніў Дэлакруа, які казаў: законы хараства — вечныя, а формы выяўлення — розныя. Кожная эпоха, кожны народ паказвае прыгажосць па-свойму. Але на аснове нацыянальнага выяўляецца агульначалавечае, пра што казаў Мікалай Рыгоравіч. Уласна кажучы, тэма "смутку, журбы, маркоты" заўсёды прыцягвала ўвагу мастака. Гэты смутак — часам лёгкі, празрысты, як крынічная вада, часам напружаны, як нацягнутая цеціва лука, часам ледзь прыкметны, як апошні туман на ўзлеску, — можна адчуць у карцінах "Казка", "Сям'я", "9 Мая. Удовы", "Смутак", "Маці"…

У карцінах Залознага мяне заўсёды ўражваў яго "малявінскі" каларыт, што часам пераходзіў у звонкую дэкаратыўнасць. Здзіўляла ягонае нястрымнае захапленне чырвоным колерам, любоў да краплакаў з інтэнсіўнымі халодна-чырвонымі, малінавымі адценнямі, да чырвонага марсу рудаватага тона; любіў ён і сіні лазурок крыху блакітнага адцення, і чырвоны кадмій, і г.д. "Калі на палатне, — казаў творца, — першыя дзве асноўныя колеравыя плямы будуць дысгарманічныя або ўзяты не так, дык за імі ўсе астатнія будуць няправільныя, фальшывыя…". І далей: "Мастацкасць — гэта калі карціна кажа гледачу больш, чым на ёй ёсць".

Вось гэта ў лепшых творах Залознага было заўсёды. Таму што асновай творчага метаду мастака з'яўлялася эмацыйна афарбаваная думка, якая выбірала з памяці візуальныя ўражанні і прыводзіла іх у адпаведнасць з сабой, выходзячы за межы элементарнай праўдападобнасці. Верагоднасць і пераканаўчасць жывапісу Залознага я ацэньваў па яго здольнасці выяўляць, у першую чаргу, унутраны стан мастака. Скажу больш: у працэсе творчага развіцця ён, пачынаючы з дыпломнай карціны "Капітуляцыя", а потым палотнаў "Студэнты", "Камсамольцы", "Сястра", "Давыд-Гарадоцкія кветкаводы", зразумеў, што афарбоўка на палатне павінна быць узгоднена з перажываннем, як, зрэшты, і ўся сукупнасць выяўленчых сродкаў.

Гэтая выснова стала праграмай для наступнай работы Залознага. Але рэалізаваць такую праграму было нялёгка, асабліва ў тым мастакоўскім асяроддзі, у якім на першы план ставіўся метад "сацыялістычнага рэалізму", і звярнуць з гэтай "адзіна правільнай" каляіны было, мякка кажучы, непажадана. Але даводзілася выслухваць і крытыку старэйшых калег за "фармалізм", і "рэкамендацыі" начальнікаў ад адукацыі — як правільна выхоўваць вучняў у мастацкім вучылішчы, каб яны не з'ехалі ў "левізну", — і да таго падобнае…

Рэалізаваць такую праграму было нялёгка, асабліва ў тым мастакоўскім асяроддзі, у якім на першы план ставіўся метад "сацыялістычнага рэалізму", і **звярнуць з гэтай "адзіна правільнай" каляіны было, мякка кажучы, непажадана…**

Зрэшты, Залозны ў гэтых адносінах быў не адзінокі. Падобныя ўдары "зверху" прымалі такія сябры Залознага, як Л.Шчамялёў і А.Малішэўскі, а таксама тагачасныя шасцідзясятнікі — педагогі вучылішча. "Славу можна параўнаць з яблыкамі зімовых гатункаў: яны растуць летам, але радуюцца ім зімой…" — гэтую думку нямецкага філосафа Артура Шапэнгаўэра можна з поўным правам аднесці да згаданай цудоўнай тройкі. Толькі, на жаль, Мікалай Рыгоравіч занадта рана пайшоў з жыцця, і славы пасапраўднаму ён зведаць не паспеў…

К

Мікалай Залозны. "Салдаткі".

Беларускі саюз мастакоў смуткуе ў сувязі са смерцю ШАРАНГОВІЧА Канстанціна Пятровіча, члена грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз мастакоў", вядомага мастака, які ўнёс вялікі ўклад у развіццё і прапаганду беларускага выяўленчага мастацтва. Рада ГА "БСМ" выказвае спачуванне родным і блізкім у сувязі з напаткаўшым іх вялікім горам.

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
- Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
- Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Рака часу"** (у рамках праекта "Нашы калекцыі") — звыш 70 работ тыражнай і арыгінальнай графікі, больш як 80 твораў жывапісу і скульптуры, а таксама прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва мастакоў — юбіляраў 2014 года — да 1 верасня.
- Выстаўка мужчынскага касцюма і кунтушовых паясоў з прыватнага збору **"Залататканы шоўк, бясцэнны па рабоце..."** — да 31 кастрычніка.
- Выстаўка акварэлей віцебскага мастака Аляксандра Мемуса, падораных ім музею з нагоды 75-годдзя з дня заснавання ўстановы (у кавярні "Арт-дворык") — да 1 верасня.
- Выстаўка **"Шэдэўры рускага мастацтва. XIX ст."** — з 5 верасня па 6 кастрычніка.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
- **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".**
- **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".**
- **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".**

Выстаўка:
- **"Падарожныя замалёўкі Кануція Русецкага"** — да 30 верасня.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.
- Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКА-ГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.
- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- **"Старажытная Беларусь"**.
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы"**.
- **"Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў"**.

Выстаўкі:
- Міжнародны праект **"Рэчы паміж жыццём і смерцю"** — да 14 верасня.
- Выстаўка **"О доблестях, о подвигах, о славе"** — да 21 верасня.
- Выстаўка **"Музей шакалада Nikolya"** — з 5 жніўня па 10 лістапада.
- Тры выстаўкі ізраільскіх творцаў у рамках праекта **"Фарбы блізкага Усходу"** (мастакі Ганна Зарніцкая, Андрыян Жудро і фатограф Алік Замосцін) — да 15 верасня.

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўка:
- **"Кубак Чапскага"** (прымеркавана да дня нараджэння Карла Чапскага) — да 10 верасня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; + 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка **"Падарожжа з Нясвіжа ў Парыж"** — да 21 верасня.
- Выстаўка люлек **"Прадмет годнага адпачынку"** — да 30 верасня.

Ратуша
- Пастаянная экспазіцыя.

Інфармацыйна-касавы цэнтр
- Выстаўка фота **"Смак беларускай гісторыі"**.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка фатаграфій **"Мір стары — Мір новы"**.

Партрэтная зала
- **"Выстаўка партрэтаў князёў Радзівілаў з калекцыі князя Канстанціна Гагенлоэ"** (Германія) — да 16 лістапада.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:
- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
- Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
- Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
- Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"** — з 15 верасня.

Акцыі:
- **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
- Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
- Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выстаўкі:
- Выстаўка да 105-годдзя выхаду ў свет зборніка Якуба Коласа **"Другое чытанне для дзяцей беларусаў"**— да 14 верасня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ



г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыя:
- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
- Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстаўка:
- Выстаўка **"Я — шлях, якому век няма спакою..."** — да 13 верасня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10.
- **"Back in BSSR / Ізноў у БССР"** (савецкі плакат 1940 — 1980-х гг., прадметы матэрыяльнай культуры) — да 14 верасня.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл.Свабоды, 15. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
- **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
- **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выстаўкі:
- Карціна Уладзіміра Пасюкевіча **"Партрэт героя..."** (жывапісны партрэт, а таксама рэдкія ўзнагароды і дакументы ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны М.Савіцкага).
- Выстаўка сучаснай мініяцюры і твораў мастацтва Ірана.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстаўка:
- Выстаўка гістарычнага партрэта Юрыя Каралевіча **"Рэмінісцэнцыя".**

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
- Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ



г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10. Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:
- **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры к. XIX — с. XX стст.

Выстаўка:
- **"Куфэрак: стагоддзе прыгажосці"** — рэканструкцыя касцюмаў XIX ст. — да 14 верасня.

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, пр-т Ракасоўскага, 49. Тэл.: 291 16 76.

Экспазіцыі:
- **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Л.Шчамялёва".**

Выстаўка:
- **"Кобрынская палітра"** — да 5 верасня.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- **"Цмокі і васковыя фігуры"** (скульптуры драконаў і герояў фэнтазі, а таксама гістарычныя персанажы царскай сям'і Рамана-вых) — да 14 верасня.
- Скарбы сусветнага жывапісу ва ўнікальнай калекцыі рэпрадукцый **Надзеі Лежэ** з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь — да 7 верасня.
- Выстаўка **"Праўда салдацкіх трохкутнікаў"** (франтавыя лісты і фота салдат Вялікай Айчыннай вайны з фондаў музея) — да 31 жніўня.

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня".**
- **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца

Экспазіцыя:
- **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**

Выстаўкі:
- **"Кнігі, у якіх захоўваецца час..."** (лепшыя выданні сяр. XVII — пач. XX стст.) — да 31 жніўня.
- **"І рай, і боль на Песеннай зямлі..."** (графіка беларускіх мастакоў 1920 — 1930-х).

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**

Выстаўкі:
- Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ



г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 57 41.
- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі"**.
- Лакальная экспазіцыя **"Ваенна-санітарны вагон"**.
- Выстаўка з Брянскай універсальнай бібліятэкі імя Ф.Цютчава **"Дарогамі вайны"** — 16 кастрычніка.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 50 64.
- Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна..."**.
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст."**.
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны"**.
- **"Прывітанне, ранейшая Ліда!"**.
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**
- Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.
- **"Крылы над Лідай"** — выстаўка да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
- Выстаўка **"Як жылі нашы продкі"**.
- Выстаўка **"Чарадзейны Куфар"**.
- Выстаўка творчых работ выпускнікоў і выкладчыкаў мастацкай школы **"Сустрэча пакаленняў"**.
- Персанальная выстаўка П.Цімафеева **"Драматычнасць сярэдняга плана. Час жывых"**.
- У рамках праекта "Выток Нёмана — выток духоўнасці" — калектыўная выстаўка **"Абуджэнне"**.
- Выстаўка дэкаратыўна-прыкладной творчасці А.Чуўюравай (Сярко) **"Частка маёй душы"**.
- **"Вайны свяшчэнныя старонкі"** — выстаўка, прысвечаная Вялікай Перамозе.
- Выстаўка **"Старонкі непа100ронняй Вялікай вайны на Лідчыне"**.

ЛІДСКІ ЗАМАК

- Камера катаванняў.
- Фотавыстаўка **"Захаваем на вякі"**.
- Партрэтная галерэя вялікіх князёў і каралёў.
- Фотавыстаўка **"Археалагічныя знаходкі Лідскага замка"**.
- Выстаўка рэплік **"Зброя Вялікага Княства"**.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 288 15 49.
- Выстаўка-продаж мёду — да 11 верасня.

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1. Тэл.: 327 26 12.
- Выстаўка жывапісу Васіля Пешкуна **"Тут быў Вася"** — да 13 верасня.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7. Тэл./факс: 327 60 81.
- **4 верасня** — **"Пінская шляхта"** В.Дуніна-Марцінкевіча.
- **5, 6** — **"Местачковае кабарэ"** (спектакль у 2-х дзеях).

На Малой сцэне Канцэртнай залы "Мінск"
- **3** — **"Самотны захад"** М.МакДонаха.
- **6** — **"Старамодная камедыя"** А.Арбузава.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.
- **3 верасня** — **"Каралеўскія гульні"** па п'есе М.Андэрсана "1000 дзён Ганны Балейн".

ШТОТЫДНЁВАЯ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Выдаецца з кастрычніка 1991 года

Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ

Рэдакцыя
Вольга НАВІЦКАЯ (адказны сакратар)

Рэдактары аддзелаў:
Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН

Аглядальнікі рэдакцыі:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Спецкарэспандэнты:
Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — **Юрый ІВАНОЎ**

Мастацкі рэдактар — **Наталля ОВАД**

Карэктар — **Інга ЗЕЛЬГІС**

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.

Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23
Тэлефон-факс: (017) 334 57 41
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by
E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2014. Індэксы 63875, 638752 Рознічны кошт — па дамоўленасці. Наклад 6001 Падпісана ў друк 29.08.2014 у 19.30 **Замова 3337**

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва" 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.

Прыёмная: (017) 290 22 50.
Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35